ЗА ВОЛЬНАСЦЬ І ВЕРУ



Ігнацій Клюкоўскі і яго ўспаміны аб падзеях паўстання 1830–1831 гадоў

Навуковае выданне

ЗА ВОЛЬНАСЦЬ І ВЕРУ

Ігнацій Клюкоўскі і яго ўспаміны аб падзеях паўстання 1830–1831 гадоў

На польскай і беларускай мовах

Адказны за выпуск *М. Ул. Шыбко*

Падпісана ў друк з арыгінала-макета заказчыка 27.07.2007. Фармат 60x84 1/16. Папера афсетная. Афсетны друк. Гарнітура Times New Roman. Ум. друк. арк. 6,98. Ул.-выд. арк. 7,9. Наклад 200 асоб. Заказ № 313

Выдавецтва ТАА «Лімарыус». 220030, г. Мінск, вул. Старажоўская, 14.
ЛІ № 02330/0056933 ад 30.04.2004

Надрукавана УП "Дызайнпрэс-студыя", 220034, г. Мінск, вул. Платонава, 10-3.
ЛП № 02330/0056879 ад 30.04.2004

ЗА ВОЛЬНАСЦЬ І ВЕРУ

Ігнацій Клюкоўскі і яго ўспаміны аб падзеях паўстання 1830–1831 гадоў



Мінск · Лімарыус · 2007

УДК 94(476)
ББК 63.3(4Беи)
З-12

Укладанне, пераклад на беларускую мову,
уступны артыкул, каментарыі, паказальнікі
Вольгі Васільеўны Гарбачовай

Навуковае рэдагаванне:
доктар філалагічных навук, прафесар Белдзяржуніверсітэта
Ала Андрэеўна Кожынава

Рэцэнзенты:
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў Белдзяржуніверсітэта
Уладзімір Аркадзевіч Сосна
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу Белдзяржуніверсітэта
Андрэй Міхайлавіч Лукашэвіч

За вольнасць і веру. Ігнацій Клюкоўскі і яго ўспаміны
З-12 аб падзеях паўстання 1830–1831 гадоў: На польскай і беларускай мовах / Уклад., перакл., камент. В. В. Гарбачова. – Мінск: Лімарыус, 2007. – 120 с.

ISBN 978-985-6740-76-6

Выданне ўяўляе сабой першую ў Беларусі публікацыю ўспамінаў ашмянскага эмігранта 30-х гг. XIX ст. Ігнація Клюкоўскага, якія захоўваюцца ў Музеі Адама Міцкевіча ў Парыжы. Тэксты друкуюцца на польскай мове і ў перакладзе на сучасную беларускую мову. Разлічана на даследчыкаў гісторыкаў, выкладчыкаў і студэнтаў ВНУ, краязнаўцаў, а таксама ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй нашай Айчыны.

УДК 94(476)
ББК 63.3(4Беи)

ISBN 978-985-6740-76-6

Успаміны Ігнація Клюкоўскага ў кантэксце мемуарнай традыцыі вакол паўстання 1830–1831 гадоў

Прадстаўленыя намі рукапісныя ўспаміны, якія захоўваюцца ў зборах Музея Адама Міцкевіча ў Парыжы, можна прыпісаць аўтарству амаль невядомай у айчыннай гістарыяграфіі асобе – Ігнацію Клюкоўскаму. Сярод даследчыкаў ён знаны толькі як адзін з дзеячоў паўстання 1831 г. і аўтар невялікага фрагмента аб ашмянскім выступленні, выдадзенага Феліксам Вратноўскім. У той жа момант гэты ашмянскі шляхціц, меўшы літаратурныя здольнасці, стаўшы па волі лёсу эмігрантам, у Францыі сфармаваўся яшчэ і як мастак і мастацтвазнавец.

У канцы 20–30-х гг. XX ст. пад час працы над састаўленнем каталога Музея Адама Міцкевіча да польскага даследчыка Адама Левака трапілі некамплектныя ўспаміны аб падзеях 1831 г. і першых гадах эміграцыі. Гісторык занатаваў гэты рукапіс, у якім адсутнічаў пачатак і канец як «Успаміны аб паўстанні 1830 г. у Літве» («Pamiętnik o powstaniu w 1830 r. na Litwie») невядомага аўтара[1]. Толькі ў 1999 г. гэтай рукапіснай крыніцай зацікавіўся польскі даследчык гісторыі Вялікай эміграцыі прафесар Славамір Калембка. У выніку праведзенай апрацоўкі і даследавання гэтых матэрыялаў ён прапанаваў лічыць аўтарам названага «Pamiętnika» ашмянскага эмігранта Ігнація Клюкоўскага[2]. Галоўным аргументам навукоўца стала падабенства прааналізаваных ім фрагментаў, прысвечаных падзеям 1831 г. на Ашмяншчыне, змешчаных у ананімных успамінах і выдадзеных Ф. Вратноўскім пад прозвішчам Клюкоўскага. Некаторую ўпэўненасць заключэнню тарунскага гісторыка прыдало праведзенае ім графалагічнае параўнанне ліста з аўтографам Клюкоўскага з ананімным тэкстам. Аднак на падставе гэтых выказванняў поўнай упэўненасці ў тым, што аўтарам згаданага рукапісу з'яўляецца менавіта названая асоба не было. Тым больш, што той тэкст, які ўключаны ў зборнік Вратноўскага, вельмі аддалена нагадвае фрагмент ананімных успамінаў. Зразумела, што пытанне аб аўтарскай прыналежнасці гэтага рукапісу заставалася адкрытым.

Калі ў 2005 г., пад час працы ў Польскай бібліятэцы ў Парыжы, нам упершыню трапілі ў рукі гэтыя ўспаміны, адразу ўзнікла жаданне адназначнага высвятлення ўзнятага пытання. Па-першае, былі прааналізаваны з фактаграфічнага пункту гледжання сам тэкст успамінаў; па-другое, распачаліся пошукі з мэтай

[1] MAM, rkps 1096. Pamiętnik o powstaniu w 1830 r. na *Litwie* (Autor nieznany); Katalog rękopisów Muzeum Adama Mickiewicza w Paryżu / Oprac. A. Lewak. Kraków, 1931. S. 202.

[2] *Kalembka S.* Tajemniczy pamiętnik z powstania 1831 roku na Litwie Ignacego Klukowskiego // Acta Universitatis Nicolai Copernici. Bibliologia. IV. Studia ofiarowane twórcom toruńskiego bibliotekoznawstwa – Zofii Mołodcownie i Witoldowi Armonowi. Toruń, 2000. S. 103–110.

падцвярджэння фактаў, меўшых дачыненне да біяграфіі мяркуемага аўтара. Трэба адзначыць, што праведзенае намі даследаванне дало каштоўныя вынікі, якія дазваляюць лічыць бяспрэчным аўтарам разглядаемага рукапісу Ігнація Клюкоўскага. Адначасова з гэтым нам трапілі таксама невядовыя дагэтуль факты, якія тычыліся не толькі асобы аўтара.

У якасці важных аргументаў для падцвярджэння аўтарства выступае факт аб выкананні Клюкоўскім місіі сувязного, даверанай яму 18 ліпеня 1831 г. Г. Дэмбінскім пад час знаходжання яго корпусу ў в. Сідарышкі, Завілейскага павета Віленскай губерні. Як апісвае гэты момант сам аўтар, Дэмбінскі «заклікаў мяне да выканання даручэнняў, аб чым мне намякаў ужо ў Панявежы і выслаў адтуль [14 ліпеня] з гэтай мэтай Канстанціна Граткоўскага, які таксама служыў у пазнанскім палку. …мэтай было прабрацца паасобку да Скшынецкага, які адпаведна нашаму ўяўленню павінен быў знаходзіцца паміж Беластокам і Гродна, перадаць яму пісьмовы рапарт і вусна падрабязна распавесці аб усёй жахлівасці нашага становішча, і запытацца аб далейшых загадах, папрасіўшы дапамогі калі не людзьмі, так хаця б боепрыпасамі для зброі. У выпадку, калі не застану яго ў тым месцы, на якое мы разлічвалі, павінен буду прабірацца далей аж да самай Варшавы»[1]. Факт выканання Клюкоўскім дадзенага даручэння Дэмбінскага з'яўляецца вядомым у літаратуры. На гэта звярталі ўвагу ў сваіх даследаваннях М. Тыровіч, С. Кеневіч, Р. Бялецкі[2].

Сярод іншых доказаў выступае супадзенне часу ўзнагароды аўтара ўспамінаў і І. Клюкоўскага крыжам Virtuti Militari. Як адзначаецца ў рукапісу, аўтар быў адзначаны гэтай узнагародай пад час знаходжанне польскай арміі ў Закрочыме ў прамежак з 10 па 20 верасня 1831 г.: «па рэкамендацыі Літоўскага камітэта Замбржыцкі, Валяр'ян Пяткевіч і я атрымалі крыжы і павышэнне ў чыне»[3]. У той жа час у адпаведнасці са спісам вайскоўцаў польскай арміі, узнагароджаных крыжам Virtuti Militari, Ігнацій Клюкоўскі атрымаў яго 14 верасня 1831 г.[4].

Наступным фактам, які канчаткова ўпэўнівае нас у прыналежнасці разглядаемага рукапісу Ігнацію Клюкоўскаму выступаюць падзеі, звязаныя з апісаннем дзейнасці ў Варшаве Літоўскага камітэта. Дзейнасць гэтай структуры, створанай на апошняй стадыі паўстання для дапамогі прыбываючым у Варшаву ліцвінам, не атрымала адпаведнага асвятлення ў літаратуры. Існуюць разыходжанні як па яго колькаснаму складу, так і па персанальнаму. На старонках «Усеагульнага

[1] Гл. s. 105 (адпаведна пагінацыі рукапісу).

[2] *Tyrowicz M.* Towarzystwo Demokratyczne Polskie 1832–1863. Przywódcy i kadry członkowskie. Przewodnik bio-bibliograficzny. Warszawa, 1964. S. 296; *Kieniewicz S.* Klukowski Ignacy // PSB. T. 13. Wrocław-Warszawa-Kraków, 1967. S. 28–29; *Bielecki R.* Słownik biograficzny oficerów powstania listopadowego. Warszawa, 1996. T. 2. S. 288.

[3] Гл. s. 142 (адпаведна пагінацыі рукапісу).

[4] Księga pamiątkowa w 50-letnią rocznicę powstania roku 1830, zawierająca spis imienny dowódców i sztabsoficerów tudzież oficerów, podoficerów i żołnierzy armii polskiej w tymże roku krzyżem wojskowym «Virtuti Militari» ozdobionych. Lwów, 1881.

дзённіка» пазначаецца, што Літоўскі камітэт, разам са старшынёй і сакратаром, павінен быў складацца з 10 чал.[1]. У той час як Януш Івашкевіч у сваіх тлумачэннях да ўспамінаў Ляўвеля сцвярджае, што камітэт складаўся з 9 чалавек, сярод якіх акрэслівае прозвішчы толькі Францішка Несялоўскага, Юзафа Кашыца, Караля Нямцэвіча, Аляксандра Лапацінскага і Валяр'яна Пяткевіча[2]. Клюкоўскі ў сваіх успамінах, называючы пайменна восемь чалавек, акрамя згаданых асобаў запісвае прозвішчы Леана Патоцкага, Яна Граткоўскага, Вінцэнта Барткевіча і сябе ў якасці сакратара пазначанага камітэта[3]. У рукапісу не сустракаецца толькі прозвішча Лапацінскага. Такім чынам, мажліва меркаваць, што Літоўскі камітэт усё ж такі складаўся з дзевяці чалавек, і ў гэтым выпадку пагаджаецца з той лічбай, якая пазначаецца Я. Івашкевічам. Як паказвае аналіз паасабовых складаў паслоў, абраных на сейм, далёка не ўсе здолелі прычыніцца да працы гэтай структуры.

Акрамя персанальнага складу Літоўскага камітэту, Клюкоўскі звяртае ўвагу і на кірункі яго дзейнасці. Адзін з апісаных ім фрагментаў адразу прыцягнуў нашу ўвагу. Яшчэ гадоў пяць назад, пад час працы ў Аддзеле рукапісаў бібліятэкі Варшаўскага універсітэта, нам трапіла ў рукі справа з апісаннем праектаў адназўлення паўстання на тэрыторыі Палесся. Разам з прапановамі з боку Ф. Кеневіча, Ф. Несялоўскага там знаходзіўся і агульны праект, апрацаваны адной асобай[4]. Аднак пад агульным праектам адсутнічала прозвішча, і мы пакінулі яго да высвятлення ўсіх абставін. Калі ж пачалася апрацоўка ўспамінаў Клюкоўскага, то адразу ўсплыла і знойдзеная намі раней справа. Графалагічнае параўнанне двух дакументаў зацвердзіла нас у думцы, што абодва гэтыя дакументы напісаны адным чалавекам. Акрамя таго, сярод папераў бібліятэкі Варшаўскага універсітэта нам трапіў дакумент ад 31 жніўня 1831 г., напісаны сакратаром Літоўскага камітэта з яго ўласным подпісам[5]. Пад гэтай паперай стаяў подпіс Ігнація Клюкоўскага. Значыць атрымаў падцвярджэнне яшчэ адзін з фактаў, апісаных ва ўспамінах, на падставе якіх мажліва сцвярджаць, што іх бяспрэчным аўтарам з'яўляецца менавіта Ігнацій Клюкоўскі.

Нарадзіўся Ігнацій Клюкоўскі ў 1804 г. у в. Нарбутоўшчына, Ашмянскага павета Віленскай губерні ў сям'і тытулярнага саветніка Каэтана Клюкоўскага і Францішкі Бранецкай[6]. Школьную адукацыю атрымаў у Вільні, дзе затым па-

[1] Dziennik Powszechny. № 230 z 22.8.1831.

[2] *Lelewel J.* Pamiętnik z roku 1830–1831. Warszawa, 1924. S. 159.

[3] Гл. s. 125 (адпаведна пагінацыі рукапісу).

[4] BUW, rkps 566. Wyprawa na Litwę w okresie 14.VI – 1.IX.1831. S. 15–25.

[5] Ibid.

[6] Па сцвярджэнню Ю. Бялінскага, Л. Яноўскага, С. Кеневіча, Р. Бялецкага, С. Калембкі Ігнацій Клюкоўскі нарадзіўся ў 1806 г. Гл.: *Bieliński J.* Uniwersytet Wileński (1579–1831). Kraków, 1900. T. 2. S. 749; *Janowski L.* Słownik bio-bibliograficzny dawnego Uniwersytetu Wileńskiego. Wilno, 1939. S. 201; *Kieniewicz S.* Klukowski Ignacy. S. 28–29; *Bielecki R.* Słownik biograficzny... T. 2. S. 288; *Kalembka S.* Tajemniczy pamiętnik... S. 105. У той жа час Ф. Врагноўскі, які быў вельмі блізкі з Клюкоўскім у яго апошнія гады і прысутнічаў на пахаванні, у сваіх успамінах пазначае, што ён памёр 30 траўня 1862 г.

чаў вывучаць мастацтва ў Віленскім універсітэце. Яго выкладчыкам па жывапісу быў знакаміты мастак Ян Рустэм[1]. Адначасова з гэтым ён наведвае лекцыі, якія чытаў Іаахім Лялевель. Пасля заканчэння універсітэта Клюкоўскі меў намер працягнуць далейшае навучанне ў Італіі, аднак па нейкім прычынам гэта здзейсніць не ўдалося і ён паступае на працу ў канцылярыю Радзівілаўскай камісіі. Трэба адзначыць, што супрацоўнікамі гэтай камісіі ў 20-я гг. XIX ст. з'яўляўся цэлы шэраг будучых паўстанцаў 1831 г. У 1822–1824 гг. тут працаваў адзін з заснавальнікаў таварыства філаматаў Ануфрый Петрашкевіч. У 1825 г. на працу ў Радзівілаўскую камісію прыходзіць Яўстафій Янушкевіч. У Вільні Клюкоўскі завязвае цесныя стасункі і з Валяр'янам Пяткевічам.

У снежні 1830 г. на Беларусь даходзяць звесткі пра пачатак паўстання ў Польшчы. Частка прагрэсіўна настроенай беларускай шляхты перабралася ў Каралеўства Польскае. Патрыёты, якія засталіся на месцах, у тым ліку і Клюкоўскі, актывізавалі падрыхтоўку да адкрытага выступлення, нягледзячы на тое, што дзейнічаць было дастаткова складана – не хапала зброі, грошаў, узмацніўся паліцэйскі нагляд, улады правялі шэраг арыштаў ненадзейных асоб з наступнай адсылкай іх у глыб Расіі[2]. Цэнтрам паўстанцкага руху становіцца Вільня. Кожную ноч тут знаходзілі патрыятычныя надпісы, адозвы з заклікамі падтрымаць варшаўскую справу.

У студзені 1831 г. у Вільні ствараецца Цэнтральны Віленскі паўстанцкі камітэт (ЦВПК), абавязкам якога стала падрыхтоўка і кіраўніцтва паўстаннем у Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губернях і заходніх паветах Віцебскай губерні. У склад ЦВПК увайшлі: віленскі маршалак Станіслаў Шумскі, паэт Антоній Гарэцкі, Людвік Замбржыцкі, Эдвард Ромер – сын былога віленскага маршалка, Юсцін Грабніцкі, вядомы гісторык Міхал Балінскі, сакратар рады Віленскага універсітэта Леан Рагальскі, прафесар Віленскага універсітэта Валяр'ян Пяткевіч, Вінцэнт Поль[3]. Улічваючы той факт, што горад знаходзіўся ў руках расійскіх улад, дзейнасць гэтага паўстанцкага органа праходзіла ва ўмовах строгай канспірацыі. Свае пасяджэнні камітэт праводзіў у доме насупраць касцёла св. Яна, які належаў Валяр'яну Пяткевічу, дзе раней збіраліся філарэты, а пазней паплечнікі Ш. Канарскага[4].

У адпаведнасці з інструкцыямі Нацыянальнага ўрада Віленскім камітэтам быў распрацаваны план паўстання і прынята рашэнне аб стварэнні тайных па-

на 59 году жыцця. Гэты ж факт пазначаны і ў клепсідры. Гл.: MAM, rkps 1025. *Wrotnowski F.* Pamiętnik. T. 1. Styczeń 1856 - wrzesień 1862. S. 53–53 v.; *Bielecki R. [et al.].* Polacy pochowani na cmentarzu Montmartre oraz Saint-Vincent i Batignolles w Paryżu. Warszawa, 1999. S. 58.

[1] *Bieliński J.* Uniwersytet Wileński (1579-1831). Kraków, 1900. T. 2. S. 749.

[2] З Вільна ў сярэдзіне снежня 1830 г. былі вывезены генерал Ю. Гедройц, Ю. Ходзька і інш. Гл.: *Mościcki H.* Powstanie listopadowe na Litwie // Powstanie 1831 roku na Litwie. Wspomnienia uczestników. Wilno, 1931. S. VI.

[3] *Niewiarowicz A. I.* Ze wspomn // Zbiór pamiętników do historii powstania polskiego z roku 1830–1831. Lwów, 1882. S. 463; *Mościcki H.* Powstanie listopadowe na Litwie… S. V.

[4] *Mościcki H.* Powstanie listopadowe na Litwie… S. V–VI.

вятовых камітэтаў, прызначаных для падрыхтоўкі паўстання на месцах. Кожны павет меў свайго прадстаўніка ў камітэце, які павінен быў паведамляць аб пастановах цэнтральнага органа. Гэта так званыя эмісары ЦВПК, якіх ён накіраваў у Гродна, Мінскую губерню, на Ашмяншчыну, Віцебшчыну. На Беларусі адным з прадстаўнікоў Віленскага камітэта, разам з Юзафам Зянковічам, Юзафам Шчапінскім, Юсцінам Полем, Ігнацием Янкоўскім, з'яўляўся Ігнацій Клюкоўскі.

На пачатку лютага 1831 г. Цэнтральны камітэт сабраў у Вільні прадстаўнікоў павятовых камітэтаў. На нарадзе было вынесена рашэнне, што паўстанне павінна пачацца з Віленскай губерні, потым ахапіць Гродзенскую губерню і Беластоцкую вобласць, пасля чаго распаўсюдзіцца далей[1]. Прадстаўнікам павятовых камітэтаў было даведзена, што сігнал да выступлення паступіць з Вільні. Цэнтральны Віленскі камітэт спрабаваў кантраляваць ход падзей, заклікаючы прылеглыя да Вільні паветы аб'яднаць узброеныя сілы і адваяваць у расійскіх войскаў гэты важны ў стратэгічным і палітычным плане горад. Аднак адсутнасць сярод паўстанцаў відавочнага лідэра, недастатковая падрыхтаванасць выступлення, цяжкасць сувязі цэнтра з павятовымі камітэтамі не садзейнічалі кансалідацыі паўстанцаў на былых землях ВКЛ. У адрозненне ад падзей у Каралеўстве Польскім, дзе ўсё было падначалена паўстанцкаму ўраду, на беларуска-літоўскіх землях на пачатковым этапе ў кожным павеце існаваў свой кіраўнік і свая уладавая структура. Адметныя рысы паўстання ў розных рэгіёнах Вялікага княства Літоўскага вынікалі з той сітуацыі, у якой разгортваліся падзеі: паўстанцам беларускіх паветаў даводзілася дзейнічаць на акупіраванай расійскімі войскамі тэрыторыі.

Стыхійнае выступленне ў канцы лютага 1831 г. у Цельшынскім павеце стала пачаткам хваляванняў у Віленскай губерні. На Беларусі першымі выступіла насельніцтва Ашмянскага і Свянцянскага паветаў. У Ашмянах падрыхтоўка да паўстання вялася яшчэ са студзеня 1831 г. Мясцовая шляхта тайна збіралася ў Алянах, маёнтку старшыні ашмянскага трыбунала Парфірыя Важынскага. Напярэдадні паўстання з інструкцыямі Цэнтральнага Віленскага камітэта ў Ашмяны прыбыў Я. Янушкевіч[2]. 30 сакавіка на дапамогу ашмянскім паўстанцам разам з іншымі прадстаўнікамі Віленскага камітэта прыбыў І. Клюкоўскі[3]. Далейшы ўдзел аўтара ў паўстанні дастаткова падрабязна разглядаецца ў прадстаўленых успамінах. Гэта ж тычыцца і адыходу ў эміграцыю.

У Францыю Клюкоўскі трапіў у жніўне 1832 г. і спачатку быў скіраваны мясцовымі ўладамі ў эмігранцкі заклад у Буржэ, адкуль нелегальна перабраўся ў Парыж[4]. Можна меркаваць, што ў Парыжы Клюкоўскі апынуўся дзесьці ў кан-

[1] *Szczapiński J.* Powstanie w puszczy Białowieskiej // Pamiętniki polskie / Wyd. K. Bronikowski. Przemyśl, 1884. T. 2. S. 245.

[2] РДВГА, ф. 405, воп. 2, спр. 4139, арк. 7.

[3] Юзаф Зянковіч, акрамя Клюкоўскага, пазначае сябе і Юсціна Поля. Гл.: *Zienkowicz J.* Powstanie powiatu oszmiańskiego // Pamiętniki polskie. T. 2. S. 8–9; *Bielecki R.* Słownik biograficzny… T. 2. S. 288.

[4] *Bielecki R.* Zarys rozproszenia Wielkiej Emigracji we Francji 1831–1837. Materiały z archiwów francuskich. Warszawa-Łódź, 1986. S. 117.

цы кастрычніка, а ўжо 1 лістапада 1832 г. далучыўся да Таварыства Літоўскага і рускіх земляў (ТЛРЗ)[1] і ў адпаведнасці з праграмай дзеяння таварыства распачаў працу над успамінамі. У падцвярджэнне нашай думкі аб тым, што напісанне яго ўспамінаў прыпадае на восень 1832 г., выступае яго ўласнае сцвярджэнне. Клюкоўскі пазначае, што «той, хто цікавіцца падрабязнасцямі разглядаемай кампаніі, няхай звернецца да ўспамінаў генерала Дэмбінскага, якія верагодна хутка будуць выдадзены ў Францыі»[2]. Як вядома, менавіта ў 1832 г. у Францыі выйшлі две працы Генрыка Дэмбінскага, прысвечаныя падзеям лістападаўскага паўстання[3]. Астатнія з вядомых прац названага польскага генерала, прысвечаныя гэтай тэме, выйшлі па-за межамі Францыі.

На сённяшні дзень яшчэ застаецца пад пытаннем, як «Успаміны» Клюкоўскага апынуліся ў зборах Музея Адама Міцкевіча. Магчыма, што ў вырашэнні гэтай праблемы могуць быць карыснымі ўспаміны Фелікса Вратноўскага. На іх падставе вядома, што на працягу 1844–1861 гг. лёсы Вратноўскага і Клюкоўскага не перасякаліся. Апошні ў другой палове 1840-х гг. уступіў у польскі легіён, які дзейнічаў на тэрыторыі Італіі. А з 1851 г. знаходзіўся ў Баціньёлі, працуючы там у чыгуначных майстэрнях. Як пазначае Вратноўскі, спаткаліся яны з Клюкоўскім пасля семнаццацігадовага перапынку 14 ліпеня 1861 г.[4]. Аднак у сувязі з дрэнным станам здароўя, апошні пражыў пасля гэтай сустрэчы меней за год. 30 траўня 1862 г. на 59 гаду жыцця Ігнацій Клюкоўскі памірае ў шпіталі для маламаёмасных, і 1 чэрвеня яго парыжскіх могілках Манмартра ён быў пахаваны. Пад час пахавання Вратноўскі засыпаў у яго магілку жменьку беларускай зямлі, прывезенай з Навагрудчыны[5].

Пасля пахавання Клюкоўскага прысутныя ўмовіліся, што рэчы, якія засталіся пасля яго смерці, забярэ са шпіталя Караль Песляк і накіруе да Вратноўскага. Аднак да апошняга рухомая маёмасць Клюкоўскага трапіла толькі паміж верасенем – канцом студзеня 1863 г. і, наколькі можна зразумець, дайшлі толькі кнігі і мастацкія зборы нябожчыка[6]. У лютым 1867 г. у сувязі з просьбай Люцыяна Вейсенгофа Вратноўскі паўторна апрацаваў зборы свайго сябра. Як ён сведчыць, не каштоўныя і не звязаныя з мастацтвам паперы былі спалены, а неабходныя Вейсенгофу рукапісы ў траўні 1867 г. былі адасланы ў Дрэздэн[7]. На падставе гэ-

[1] BN, rkps II. 7872. Materiały do historii Towarzystwa Litewskiego i Ziem Ruskich, k. 14.

[2] Гл. s. 83–84 (адпаведна нагінацыі рукапісу).

[3] *Dembinski H.* Memoires sur la campagne de Lithuanie. Strasbourg, 1832; *яго ж*: Mein Feldzug nach und in Litthauen und mein Rueckzug von Kurszany nach Warschau. Leipzig, 1832.

[4] MAM, rkps 1025. *Wrotnowski F.* Pamiętnik. T. 1. Styczeń 1856 – wrzesień 1862. S. 20 v.

[5] Вратноўскі падрабязна апісвае смерць і пахаванне свайго сябра І. Клюкоўскага. Гл.: MAM, rkps 1025. *Wrotnowski F.* Pamiętnik. T. 1. S. 38 v.–56.

[6] Сярод найкаштоўнейшых матэрыялаў, застаўшыхся пасля смерці Клюкоўскага, Вратноўскі называе яго рукапісы «Лісты аб мастацтве да Эдварда Ромера» (1861), «Лісты па гісторыі мастацтва да Браніслава Залескага» (1862), нескончаны нарыс па мастацтву «Гістарычныя часы» (1862) і гравюры. Гл. MAM, rkps 1025. *Wrotnowski F.* Pamiętnik. T. 2. S. 22–23, 156.

[7] Ibid. S. 172, 190.

тых матэрыялаў становіцца зразумела, што разглядаемы рукапіс ці не дайшоў да Вратноўскага і застаўся ў самога Песляка, ці апошні проста спазніўся адабраць са шпіталя ўсю застаўшуюся пасля смерці Клюкоўскага маёмасць, і часткова яна была адпраўлена ў невядомым нам кірунку.

Падзеям 1830–1831 гг. на літоўска-беларускіх землях прысвечана шмат успамінаў. У многім садзейнічаў гэтаму той факт, што створанае ў Парыжы па прапанове Цэзарыя Плятэра ў снежні 1831 г. Таварыства Літоўскае ўжо на першым сваім пасяджэнні абвясціла галоўнай задачай «збор матэрыялаў, маючых адносіны да падзей у Літве і на тэрыторыі рускіх земляў, а таксама апісанне паўстання (1830–1831 гг. – *В. Г.*); ...статыстычнае і гістарычнае апісанне гэтых земляў;... вывучэнне гісторыі мясцовых народаў»[1]. У Статуце таварыства таксама адзначалася, што сабраныя матэрыялы павінны быць абавязкова надрукаваны. Гэтая задача ставілася як з-за неабходнасці пашырэння сярод еўрапейцаў ведаў пра ліцвінаў, так і для стварэння сапраўднай карціны паўстанцкіх падзей 1831 г. на беларуска-літоўскіх тэрыторыях.

19 снежня 1831 г. паміж сябрамі таварыства былі вылучаны і размеркаваны тэмы даследаванняў. Першы тэматычны кірунак тычыўся праблем гістарычнага развіцця Літвы. Другі прысвячаўся лістападаўскаму паўстанню і ягоным асаблівасцям на беларуска-літоўскіх землях. Менавіта гэтая праблематыка з'явілася найбольш прывабнай для былых паўстанцаў.

З канца студзеня 1832 г. у архіў ТЛРЗ пачалі паступаць першыя мемуары, а з канца траўня 1832 г. прадметам бурных абмеркаванняў становіцца вызначэнне далейшага лёсу сабранай рукапіснай спадчыны. На чарговым пасяджэнні 29 траўня прымаецца пастанова аб наданні Ф. Вратноўскаму паўнамоцтваў на выданне гісторыі літоўскага паўстання[2]. З восені 1832 г. успаміны ліцвінаў адразу накіроўваюцца да Вратноўскага, які ў сярэдзіне студзеня наступнага года прадстаўляе на абмеркаванне праект падрыхтаванага даследавання, пасля чаго Таварыства дае дазвол на яго выданне[3].

У студзені 1833 г. у прэсе з'явілася паведамленне пра выданне гэтай працы асобнымі брашурамі пад назвай «Pamiętniki o powstaniu Litwy i Ziem Ruskich»[4]. Першая яе частка складалася з 5 асобных сшыткаў пад агульнай назвай «Ogyłny rys powstania Litwy» і выходзіла на працягу 1833 г. Па зместу гэтае выданне Вратноўскага з'яўлялася манаграфічным даследаваннем, прысвечаным літоўскім падзеям 1831 г. А ў 1835 г. у парыжскай друкарні А. Пінарда ім выдаецца ўжо зборнік успамінаў. Часткова ўспаміны выходзілі ў значнай рэдактарскай апрацоўцы, без пазначэння прозвішчаў стваральнікаў. У той жа момант у зборніку

[1] BN, rkps II. 7871. Odpisy dokumentów Towarzystwa Litewskiego i Ziem Ruskich z lat 1831–1836. k. 34.

[2] Ibid., k. 123.

[3] BN, rkps II. 7871, k. 196.

[4] Pielgrzym Polski. Broszura «Naruszewicza» z 25 lutego 1833 r. S. 4; Pielgrzym Polski. Broszura z 27 maja 1833 r. S. 32.

прысутнічаюць і некаторыя аўтарскія матэрыялы, сярод якіх апісанне ашмянскіх падзей Ігнація Клюкоўскага[1].

З успамінаў Клюкоўскага з пазначэннем аўтарства Вратноўскі надрукаваў толькі тую частку, дзе апісваюцца падзеі на Ашмяншчыне[2]. У той жа момант гэты тэкст значным чынам перапрацаваны і ўтрымлівае рэдактарскія ўстаўкі і ўдакладненні, аднак некаторыя факты і фрагменты адсутнічаюць. Можна меркаваць, што пэўныя абставіны вымушалі Вратноўскага скарачаць тэксты пад час працы над зборнікам успамінаў. Верагодна, ён мусіў выкарыстаць мемуары і іншых дзеячоў. Так, па Ашмяншчыне ў яго меліся матэрыялы Юзафа Зянковіча, Казіміра Руткоўскага. Успаміны Руткоўскага ў апрацаваным выглядзе былі выкарыстаны Вратноўскім у выданні 1835 г.[3]. Матэрыялы Зянковіча пазней убачылі свет у зборніку Ксаверыя Бранікоўскага[4]. Магчыма, што астатні тэкст Клюкоўскага Вратноўскі пакінуў для другога тому ўспамінаў, які ён меў намер выдаць у 1838 г. Запланаванае выданне павінна было змяшчаць: «1) матэрыялы, якія былі сабраны раней і не ўвайшлі ў першы том; 2) матэрыялы, якія з'явіліся пазней і якія яшчэ могуць з'явіцца; 3) выпраўленне і дапаўненне памылковых альбо недакладных палажэнняў, змешчаных у папярэднім выданні»[5]. Аднак, як вядома, гэты праект Вратноўскага не быў рэалізаваны. Акрамя таго, валодаючы рэдактарскім талентам, апошні імкнуўся да істотнай перапрацоўкі прадстаўленых яму матэрыялаў, якія пасля гэтага досыць прыблізна нагадваюць зыходны варыянт.

Успаміны Клюкоўскага складаюцца з 8 раздзелаў. Аднак у гэтым пытанні прысутнічае некаторая няўпэўненасць, таму, што тэкст захаваўся толькі з 25-й старонкі. Назва першага раздзелу *«Powstanie powiatu oszmiańskiego»* намі падаецца ўмоўна, з-за адсутнасці аўтарскага тытула. Далей на некалькіх старонках (s. 47–49) ідзе апісанне пачатку падзей у Завілейскім павеце. Трэці раздзел (с. 49–81) прысвячаецца ўзаемазвязаным падзеям, якія адбываліся сумесна на тэрыторыі Завілейскага, Дзісенскага і Вілейскага паветаў. У гэтым месцы Клюкоўскі разам з уласнымі разважаннямі на старонках 49–58 змяшчае фрагмент, які належыць аўтарству Вінцэнта Барткевіча[6]. У чацвёртым раздзеле

[1] *Klukowski J.* Powstanie powiatu oszmiańskiego // Zbiór pamiętników o powstaniu Litwy w r. 1831 / Ukl. przez F. Wrotnowskiego. Paryż, 1835. S. 229–249.

[2] Гэты ж фрагмент на падставе тэксту са зборніка Вратноўскага перавыдадзены Г. Масціцкім. Гл.: *Klukowski J.* W powiecie oszmiańskim // Powstanie 1831 roku na Litwie. Wspomnienia uczestników / Wyd. H. Mościcki. Wilno, 1931. S. 96–106.

[3] Niektóre szczegóły z notatek K. Rutkowskiego // Zbiór pamiętników o powstaniu Litwy w r. 1831 / Ukl. przez F. Wrotnowskiego. Paryż, 1835. S. 249–255. Рукапісны варыянт успамінаў К. Руткоўскага захоўваецца ў Польскай бібліятэцы ў Парыжы. Гл.: BPP, rkps 347/6, s. 403–405.

[4] *Zienkowicz J.* Powstanie powiatu oszmiańskiego // Pamiętniki polskie / Wyd. K. Bronikowski. Przemyśl, 1884. T. 2. S. 7–47.

[5] *Wrotnowski F.* Powstanie Litwy i ziem ruskich. Uwiadomienie [o przygotowaniu tomu 2 do druku i prośba przedpłaty]. Paryż, 1838.

[6] Успаміны В. Барткевіча ўпершыню былі выдадзены Ф. Вратноўскім. Гл.: *Bortkiewicz W.* Historyczne opisanie powstań Zawilejsko-Dziśnieńskiego i Wilejskiego // Zbiór pamiętników o powstaniu Litwy w r. 1831 / Ukl. przez F. Wrotnowskiego. Paryż, 1835. S. 267–270.

(s. 82–103) распавядаецца аб злучэнні літоўскіх фарміраванняў з рэгулярнымі польскімі войскамі, прыбыўшымі на дапамогу мясцовым паўстанцам. Пяты раздзел (s. 103–115) пад назвай *«Emmisaryjusżostwo»* распавядае аб выкананні аўтарам даручэння, атрыманага ад Г. Дэмбінскага, па дастаўленню інфармацыі Я. Скшынецкаму[1]. Шосты раздзел (s. 115–134) апісвае сітуацыю, у якой апынуліся паўстанцы, прыбыўшыя ў Варшаву напачатку жніўня 1831 г. Сёмы раздзел (s. 134–145), які распачынаецца падзеямі 7 верасня 1831 г., прысвечаны выезду паўстанцаў з Варшавы. І апошні – пад назвай *«Tułactwo»*, з якога захавалася толькі адна старонка, змяшчае апісанне ад'езду Клюкоўскага ў эміграцыю.

У археаграфічным плане рукапіс прадстаўляе сабой сшытак без вокладкі памерам 16,5×10,8 см, які, адпаведна аўтарскай пагінацыі, захаваўся ад 25-й да 146-й старонкі, акрамя гэтага ў ім адсутнічаюць старонкі з 121-й па 125-ю. Польскамоўны тэкст, старанна запісаны з двух бакоў аркуша з застаўленнем поля з левага боку, якое складае прыкладна чацвёртую частку старонкі. Тэкст выкананы чорным атрамантам на дзевятнаццацівекавай паперы жаўтаватага колеру з аўтарскай пагінацыяй у левым верхнім куту. Аўтар выкарыстоўвае ўдакладняючую інфармацыю ў выглядзе спасылак у канцы старонкі, аднак гэты прынцып вытрымліваецца не заўсёды. Некалькі разоў справачная інфармацыя змяшчаецца непасрэдна ў тэксце, ці ў маргіналіях. Па тэксту сустракаюцца падкрэсліванні ў асноўным геаграфічных назваў ці прозвішчаў.

Па тэксту сустракаецца дацыроўка пэўных падзей, што часцей за ўсё змяшчаецца аўтарам у маргіналіях супраць адпаведнага месца. Неабходна адзначыць, што Клюкоўскім выкарыстоўваецца двайны спосаб дацыроўкі: па юліянскаму (т. зв. стараму стылю), распаўсюджанаму ў Расіі, і грыгарыянскаму (т. зв. новаму стылю) календарам. У выпадку пазначэння па абодвух календарах, на першае месца ставіцца дата па юліянскаму, на другое, праз лінію-касяк, па грыгарыянскаму. У выпадку, калі ўказваецца толькі адна дата, гэта адзначае, што яна прастаўлена па юліянскаму календару. Намі дацыроўка занесена ў квадратныя дужкі і пастаўлена ў тэксце ў адпаведнае падзеям месца.

Рукапіс магчыма лічыць чыставіком, так як у ім сустракаюцца толькі нешматлікія праўкі, выкананыя часцей шляхам закрэслівання і надпісання неабходнага тэксту над радком. Некалькі разоў для змянення парадку размяшчэння словаў у сказе аўтарам выкарыстоўваецца метад надпісання над словамі неабходных лічбаў. Такім чынам аўтар выпраўляў размяшчэнне словаў у сказе. Што тычыцца моўных і лексічных асаблівасцяў рукапісу, то яны падаюцца намі адпаведна арыгіналу з поўным захаваннем дзевятнаццацівекавай традыцыі правапісу і аўтарскіх асаблівасцяў. Дастаткова часта аўтарам апускаюцца характэрныя для польскай мовы надстрочныя знакі. Што тычыцца нехарактэрнага для сучаснай польскай мовы напісання, то ў такіх выпадках намі прадстаўлены адпаведныя сучаснасці варыянты напісання слоў у пастаронкавых спасылках. У рукапісу

[1] Гэты раздзел з нязначнымі скарачэннямі, пазначанымі намі вякой на тэксце, выдадзены С. Калембкай. Гл.: *Kalembka S.* Tajemniczy pamiętnik... S. 106–110.

прысутнічаюць і некаторыя аўтарскія матэрыялы, сярод якіх апісанне ашмянскіх падзей Ігнація Клюкоўскага[1].

З успамінаў Клюкоўскага з пазначэннем аўтарства Вратноўскі надрукаваў толькі тую частку, дзе апісваюцца падзеі на Ашмяншчыне[2]. У той жа момант гэты тэкст значным чынам перапрацаваны і ўтрымлівае рэдактарскія ўстаўкі і ўдакладненні, аднак некаторыя факты і фрагменты адсутнічаюць. Можна меркаваць, што пэўныя абставіны вымушалі Вратноўскага скарачаць тэксты пад час працы над зборнікам успамінаў. Верагодна, ён мусіў выкарыстаць мемуары і іншых дзеячоў. Так, па Ашмяншчыне ў яго меліся яшчэ матэрыялы Юзафа Зянковіча, Казіміра Руткоўскага. Успаміны Руткоўскага ў апрацаваным выглядзе былі выкарыстаны Вратноўскім у выданні 1835 г.[3]. Матэрыялы Зянковіча пазней убачылі свет у зборніку Ксаверыя Бранікоўскага[4]. Мажліва, што астатні тэкст Клюкоўскага Вратноўскі пакінуў для другога тому ўспамінаў, які ён меў намер выдаць у 1838 г. Запланаванае выданне павінна было змяшчаць: «1) матэрыялы, якія былі сабраны раней і не ўвайшлі ў першы том; 2) матэрыялы, якія з'явіліся пазней і якія яшчэ могуць з'явіцца; 3) выпраўленне і дапаўненне памылковых альбо недакладных палажэнняў, змешчаных у папярэднім выданні»[5]. Аднак, як вядома, гэты праект Вратноўскага не быў рэалізаваны. Акрамя таго, валодаючы рэдактарскім талентам, апошні імкнуўся да істотнай перапрацоўкі прадстаўленых яму матэрыялаў, якія пасля гэтага досыць прыблізна нагадваюць зыходны варыянт.

Успаміны Клюкоўскага складаюцца з 8 раздзелаў. Аднак у гэтым пытанні прысутнічае некаторая няўпэўненасць, таму, што тэкст захаваўся толькі з 25-й старонкі. Назва першага раздзелу *«Powstanie powiatu oszmiańskiego»* намі падаецца ўмоўна, з-за адсутнасці аўтарскага тытула. Далей на некалькіх старонках (s. 47–49) ідзе апісанне пачатку падзей у Завілейскім павеце. Трэці раздзел (с. 49–81) прысвячаецца ўзаемазвязаным падзеям, якія адбываліся сумесна на тэрыторыі Завілейскага, Дзісенскага і Вілейскага паветаў. У гэтым месцы Клюкоўскі разам з уласнымі разважаннямі на старонках 49–58 змяшчае фрагмент, які належыць аўтарству Вінцэнта Барткевіча[6]. У чацвёртым раздзеле

[1] *Klukowski J.* Powstanie powiatu oszmiańskiego // Zbiór pamiętników o powstaniu Litwy w r. 1831 / Ukl. przez F. Wrotnowskiego. Paryż, 1835. S. 229–249.

[2] Гэты ж фрагмент на падставе тэксту са зборніка Вратноўскага перавыдадзены Г. Масціцкім. Гл.: *Klukowski J.* W powiecie oszmiańskim // Powstanie 1831 roku na Litwie. Wspomnienia uczestników / Wyd. H. Mościcki. Wilno, 1931. S. 96–106.

[3] Niektóre szczegóły z notatek K. Rutkowskiego // Zbiór pamiętników o powstaniu Litwy w r. 1831 / Ukl. przez F. Wrotnowskiego. Paryż, 1835. S. 249–255. Рукапісны варыянт успамінаў К. Руткоўскага захоўваецца ў Польскай бібліятэцы ў Парыжы. Гл.: BPP, rkps 347/6. s. 403–405.

[4] *Zienkowicz J.* Powstanie powiatu oszmiańskiego // Pamiętniki polskie / Wyd. K. Bronikowski. Przemyśl, 1884. T. 2. S. 7–47.

[5] *Wrotnowski F.* Powstanie Litwy i ziem ruskich. Uwiadomienie [o przygotowaniu tomu 2 do druku i prośba przedpłaty]. Paryż, 1838.

[6] Успаміны В. Барткевіча ўпершыню былі выдадзены Ф. Вратноўскім. Гл.: *Bortkiewicz W.* Historyczne opisanie powstań Zawilejsko-Dziśnieńskiego i Wilejskiego // Zbiór pamiętników o powstaniu Litwy w r. 1831 / Ukl. przez F. Wrotnowskiego. Paryż, 1835. S. 267–270.

(s. 82–103) распавядаецца аб злучэнні літоўскіх фарміраванняў з рэгулярнымі польскімі войскамі, прыбыўшымі на дапамогу мясцовым паўстанцам. Пяты раздзел (s. 103–115) пад назвай *«Emmisaryjuszostwo»* распавядае аб выкананні аўтарам даручэння, атрыманага ад Г. Дэмбінскага, па дастаўленню інфармацыі Я. Скшынецкаму[1]. Шосты раздзел (s. 115–134) апісвае сітуацыю, у якой апынуліся паўстанцы, прыбыўшыя ў Варшаву напачатку жніўня 1831 г. Сёмы раздзел (s. 134–145), які распачынаецца падзеямі 7 верасня 1831 г., прысвечаны выезду паўстанцаў з Варшавы. І апошні – пад назвай *«Tulactwo»*, з якога захавалася толькі адна старонка, змяшчае апісанне ад'езду Клюкоўскага ў эміграцыю.

У археаграфічным плане рукапіс прадстаўляе сабой сшытак без вокладкі памерам 16,5×10,8 см, які, адпаведна аўтарскай пагінацыі, захаваўся ад 25-й да 146-й старонкі, акрамя гэтага ў ім адсутнічаюць старонкі з 121-й па 125-ю. Польскамоўны тэкст, старанна запісаны з двух бакоў аркуша з застаўленнем поля з левага боку, якое складае прыкладна чацвёртую частку старонкі. Тэкст выкананы чорным атрамантам на дзевятнаццацівекавай паперы жаўтаватага колеру з аўтарскай пагінацыяй у левым верхнім куту. Аўтар выкарыстоўвае ўдакладняючую інфармацыю ў выглядзе спасылак у канцы старонкі, аднак гэты прынцып вытрымліваецца не заўсёды. Некалькі разоў справачная інфармацыя змяшчаецца непасрэдна ў тэксце, ці ў маргіналіях. Па тэксту сустракаюцца падкрэсліванні ў асноўным геаграфічных назваў ці прозвішчаў.

Па тэксту сустракаецца даціроўка пэўных падзей, што часцей за ўсё змяшчаецца аўтарам у маргіналіях супраць адпаведнага месца. Неабходна адзначыць, што Клюкоўскім выкарыстоўваецца двайны спосаб даціроўкі: па юліянскаму (т. зв. стараму стылю), распаўсюджанаму ў Расіі, і грыгарыянскаму (т. зв. новаму стылю) календарам. У выпадку пазначэння па абодвух календарах, на першае месца ставіцца дата па юліянскаму, на другое, праз лінію-касяк, па грыгарыянскаму. У выпадку, калі ўказваецца толькі адна дата, гэта адзначае, што яна прастаўлена па юліянскаму календару. Намі даціроўка занесена ў квадратныя дужкі і пастаўлена ў тэксце ў адпаведнае падзеям месца.

Рукапіс мажліва лічыць чыставіком, так як у ім сустракаюцца толькі нешматлікія праўкі, выкананыя часцей шляхам закрэслівання і надпісання неабходнага тэксту над радком. Некалькі разоў для змянення парадку размяшчэння словаў у сказе аўтарам выкарыстоўваецца метад надпісання над словамі неабходных лічбаў. Такім чынам аўтар выпраўляў размяшчэнне словаў у сказе. Што тычыцца моўных і лексічных асаблівасцяў рукапісу, то яны падаюцца намі адпаведна арыгіналу з поўным захаваннем дзевятнаццацівекавай традыцыі правапісу і аўтарскіх асаблівасцяў. Дастаткова часта аўтарам апускаюцца характэрныя для сучаснай польскай мовы надстрочныя знакі. Што тычыцца нехарактэрнага для сучаснай польскай мовы напісання, то ў такіх выпадках намі прадстаўлены адпаведныя сучаснасці варыянты напісання слоў у пастаронкавых спасылках. У рукапісу

[1] Гэты раздзел з нязначнымі скарачэннямі, пазначанымі намі ніжэй па тэксту, выдаў С. Калэмбка. Гл.: *Kalembka S.* Tajemniczy pamiętnik... S. 106–110.

сустракаюцца аўтарскія скарачэнні. Іх расшыфроўку перакладчык змяшчае ў квадратных дужках. Па тэксту сустракаюцца пастаўленыя самім аўтарам успамінаў пытальнікі, яны размяшчаюцца ў круглых дужках. Пытальнікі ў квадратных дужках ставяцца перакладчыкам у выпадках нечытэльнасці поўных слоў.

Пераклад на беларускую мову выконваўся ў поўнай адпаведнасці польскамоўнаму тэксту. Намі захаваны аўтарскі падзел на раздзелы і абзацы. Аднак у адпаведнасці з асаблівасцямі польскай мовы, а таксама стылістыкай аўтара ўспамінаў, у неабходных месцах уносіліся сінтаксічныя змены.

Хачацца выказаць словы шчырай падзякі ўсім, хто падтрымаў гэты выдавецкі праект, а таксама паспрыяў падрыхтоўцы і выданню ўспамінаў Ігнація Клюкоўскага: польскаму Гісторыка-літаратурнаму таварыству і Польскай бібліятэцы ў Парыжы, прафесару Белдзяржуніверсітэта А. А. Кожынавай, кандыдату філалагічных навук А. І. Фядуту, загадчыку аддзела публікацый НГАБ З. Л. Яцкевічу, вядучаму палеографу НГАБ Г. М. Брэгеру, ад'юнкту кафедры навейшай сусветнай гісторыі універсітэта ў Лодзі Р. П. Жураўскаму.

В. В. Гарбачова

[Pamiętnik o powstaniu w 1830 r.]

[Powstanie powiatu oszmiańskiego]

[s. 25] …co znaczy ten niespodziany obrót, lecz nigdziem go napędzić niezdołał. Ledwo aż o milę od Oszmiany spotkałem ciągnącego[1] z wojskiem Ważyńskiego[2] i Szefa Sztabu Jaźwińskiego, który mi powiedział[3], że na radzie wojennej, kiedym był oddalony od Oszmiany, uchwalono cofnięcie się przed przemagającą siłą nieprzyjaciela, w strony leśne, działając odpornie, aż do czasu zupełnego sil naszych zorganizowania. I że Przezdziecki sam jeden opuszczając bez opowiedzenia wojsko, udał się prosto do Smorgoń.

W takiem tedy opuszczeniu wojska powstańcow, przez wodza, w którego doświadczeniu pełne pokładano zaufanie, duch naturalnie osłabiać musiał, chociaż się jeszcze to bynajmniej nieokazywało. Krzyczano więcej na zdradę, nieufność w sprawie raz podjętej i tchórzostwo, ale działania bynajmniej opuszczać, ani się oddalać od celu gromada cała nie miała na myśli. [s. 26] Oddawano znowu na powrót najwyższa władzę wojskową Ważyńskiemu, i znowu ufano, bo go jeszcze przy wojsku niebyło, i rzucano nań potwarze, że podobnież uciekl z Oszmiany.

Kiedy w takiej niepewności, poruszała się bez żadnego pewnego celu na gościńcu mińskim rzesza powstańcow, razem pomięszane chłopstwo w piki i kosy zbrojne, z konnicą i pojazdami, spiewając nabożne postne piesni; i kiedy pochod cały więcej miał podobieństwa do jakiejś zbrojnej i pobożnej processyi niż poruszenia wojennego, kiedyśmy się już o pułtorej mili od Oszmiany oddalili, zawyły o podal działa: przebiegła tłumne szeregi motłochu trwoga, uciekły pienia, i w głuchym szmerze, radzono w którą się stronę udawać. Jedni chcieli ku Smorgoniom, drudzy ku Borunom i Wiszniewowi. W takiem rozdwojeniu zdań, przy ciągłym huku dział odległych [s. 27] i próżnym alarmie wzniecanym przez trwożliwego Szefa Sztabu Jaźwińskiego; w przechodzie przez leśne pozycyje, wielu się z chłopstwa rozpierzchło, a całe oddziały porozmijały się w drodze. Rozsypka była niepodobną do wiary, i ledwo nad wieczor, tegoż samego dnia [3. Kwietnia] zebrały się rozpierzchłe i zbłąkane oddziały za puszczą Zuprańska w wiosce Zabłocie zwanej, gdzie wcześnie przybył Ważyński z oddziałem. Złożona naprędu rada, i zmierzać w strony leśne ku Wiszniewowi postanowiono.

Tymczasem w drodze naszej w małem miasteczku Sućkowie doszła nas kommunikacyja od Przezdzieckiego wyrażająca: iż mocno ubolewa nad tem, że został oddzielony od nas przez nieposłuszeństwo wojska, które się niechciało jakoby za nim rejterować; że najrychlej z nami się połączy, że go jedynie rozpoczęte [s. 28] powstanie zajmuje i tp. Jakkolwiek próżne to były wymawiania się: wiadomość ta uradowała pospólstwo że się doczeka wkrótce swojedo Generała; ożyła nadzieja i ochota w sercach biednego chłopstwa. Jakoż wkrótce według przyrzeczenia przybył Przezdziecki

---

[1] У рукапісу ў слове *ciągnących* канчатак *cych* закрэслены, замест чаго над радком напісана *cego*.

[2] У рукапісу прозвішча і наступнае слова закрэслены.

[3] У рукапісу закрэслены канчатак *i*.

Złożona rada wojenna, na której jedni wnosili połączenie się z powstańcami Wilejskiemi, drudzy organizowanie się w Wiszniewie. Jakie powody skłaniały do tego obie strony, obaczymy niżej. Teraz zwróćmy uwagę, na dzień mordów i rzezi w Oszmianie w dniu 3cim Kwietnia.

Zbliżał się pod same miasteczko Wirzilin z tysiącem góro piechoty, do pięciuset konnych czerkiesów i kabardyńców, z 4ma działami, dwóma pozycyjnemi, a dwóma polowemi. Wszystko się według rozkazów cofało. Jeden tylko [s. 29] Stelnicki którem w powstaniu poruczone było formowanie konnicy czyli to z niewyrozumienia rozporządzeń, czyli z uporu, lub źle zrozumianej odwagi, zostaje w miasteczku z kilkudziesiąt ludźmi konnych i strzelców, pomięszanych z kossynierami.

Od godziny 8mej z rana, dawali moskale bezustannie ognia z dział do miasteczka, napewne dla przerażenia powstańców potęgą swojej artylleryi. Zatoczyli niebawem na ulicy wileńskiej polowe działa. Attakował na nie wzdłuż ulicy Stelnicki, lecz kilka wystrzałów kartaczami, rozbiło i rozproszyło kilkudziesięciu z konnicy rzucających się dobrowolnie na zgubę, pod bezrozsądnemi rozkazami zaślepionego dowódzcy.

Po rozproszeniu drobnego oddziału Stelnickiego, wpadło rozhukanie tałałajstwo, [s. 30] jak do zdobytego szturmem miasta, nieprzepuszczając ni płci, ni wiekowi. Nic dla nich świętem nie było. Schronione kobiety i dzieci pod zasłoną nabożeństwa w kościele, padły ofiarę wściekłości rozjadłej dziczy. I przybytek czci bożej, zbryzgany krwią niewinnych! Nieustawała rzeź po ulicach; padło dwóch xięży, obywatele Zawadzki, Gan i w[ielu] i[nnych]. Lecz śmierć sama niezmywała jeszcze w oczach najezdniczej hordy występku podniesienia za wolność oręża; trzeba było jeszcze męczeńskich mordów. Rozprucie wnętrzności, dopytując się pieniędzy u jednego z obywatelów; porąbanie i rozciekanie doktora Zakrzewskiego, i wymordowanie kilkuset spokojnych mieszkańców, zostaną trofeami zwycięztwa dziczy nad bezbronnym ludem, którego krew ciążyć musi nad głową ich sprawcy Chrapowickiego, [s. 31] jeżeli szczegóły wydarzeń ludzkich na ziemi, są poddane wyższej opatrzności! umyślnie wysyłającego zgraję łotrow, dla rzucenia popłochu na powstańców.

Po zagrzebaniu licznych stosów nieszczęśliwych ofiar, wrócił Wirzilin do Wilna, a wojsko jego przedawało w tryumfie godnym czasów Tamierlana, złupione naczynia kościelne, i własność pomordowanych mieszkańców. Tak się mszczono na niewinnych i bezbronnych w XIX wieku! Ale cóż znaczą wieki pod barbarzyńskim rządem? Wszak despotyzm niezna nigdy grani i odmian.

Za przywróceniem rządu rossyjskiego w Oszmianie, rozesłano na wszystkie strony szukać Tyszkiewicza, Ważyńskiego i mnie, a na majątki nasze nałożono konfiskatę do wzyskania summy z zabranej poczty na wydatki [s. 32] powstania wziętej. Wańkowicz i Soroka członkowie Kommitetu wcześnie umknęli. Z pierwszym niewiem co się stało; drugiego złowili Czerkiesy w Krewie i okutego w kajdany powieźli do Wilna. Zacny ten starzec kilkakroć widzący podnoszącą się z grobu ojczyznę, nieulękniony szedł przed sąd przemocy, mówiąc z prawdziwie szlachetną odwadą «Odbierzcie te dni niewiele pozostającego mi życia, ktyrebym i tak już wkrytce zakończył. Nie wiele wam śmierć moja przyda. A Polska była i bydz musi».

Kiedy się to działo w stronach opuszczonych przez powstańców; w Sućkowie na radzie wojennej przemógł projekt usadowienia się w Wiszniewie, i opuszczono zamiar Jazwińskiego łączenia się z powstańcami Wilejskiemi.

Wiszniew położony w stronie leśnej, łatwy dawał przytułek nieuorganizowanym [s. 33] jeszcze siłom naszym. Fabryka żelazna obiecywała łatwe zaopatrzenie się w działa i kartacze; ale najważniejszem było utrzymanie się w powiecie, organizowanie się, wzmaganie w tych stronach ducha, i rozrywanie jak można najrozleglejsze sił nieprzyjacielskich. Ile ten zamiar miał słusznej przewagi nad szkodliwem łączeniem się w wielkie massy, przeciwne naturze partyzanckiej wojny, doswiadczenie pokazało. Bo wszędzie skupione w jednem miejscu niedoswiadczone i źle uzbrojone powstańcow tłumy, były pobite i rozpędzone w otwartych bitwach. A przeciwnie napomyślniej krzewiło się powstanie, gdzie małemi gromadami powstańcy prowadzili małą wojnę, unikając szykownych bitew. Lecz trwożliwość i brak ducha dowodzcy wojskowego, wszystko popsuło.

[s. 34] Przed samem wyjściem z Sućkowa do Wiszniewa, przybyło z Wilna ze dwódziestu akademików z całem uzbrojeniem i pełnych zapału. (Wszyscy ci akademicy dzielący wszystkie trudy naszego powstania, aż do połączenia się z wojskami regularnemi polskimi, i później aż do końca wojny służący ojczyźnie za prostych żołnierzy, warci są aby ich imiona zapisane zostały. Byli następni – Lazowski, Cezary Swiecicki, Swiętorzecki, M. Lenartowicz, Jakubowski, Nowicki, Adam Machwic, Protowski, Ernest Waszkielewicz, Sawicki, a z nimi inni z cywilnej młodzieży, Konstanty Jankowski i wielu innych, których nazwisk w tej chwili przypomnieć nie mogę)[1]. Ucieszył widok tak pięknego ducha młodzieży, wszystkich powstańcow. Wyruszono w przedsięwziętą drogę. Zastanowiliśmy się dzień jeden w Krewie, gdzie miejscowemu Regimentarzowi Szacille, niegdyś byłemu Legioniście poruczono, formowanie i zbieranie powstańcow. Był to pijak z professyi jak za zwyczaj stary żołnierz; niewiele więc mogł zrobić, jakoteż go i wkrótce podobno pijanego jak mi powiadano porąbali Czerkiesy.

[s. 35] Ztamtąd[2] wyszliśmy według ułożonego planu śpiesznym pochodem do Wiszniewa; stanęliśmy przededniem, a Żydzi zdradzający już nieraz nasze powstanie, strwożeni niespodzianem przybyciem do półtora tysiąca zbrojnych powstańców, wyszli z chlebem i solą na nasze spotkanie.

Kiedy w Zakroczymiu Sejm wszelkich dokładał usilności podźwignienia sprawy narodowej, w Modlinie na radzie wojennej [s. 139] po odrzuceniu przez Berga wszelkich układow, sześciu generałow między któremi Muchowski, Andrzychewicz, Sierakowski, Miller i Bogusławski znajdowali się, kreskowali za bezwarunkowem na łaskę Cesarza poddaniem się. Lecz z powszechnym oburzeniem wniosek ten odrzucono, a wnoszącym natychmiast udzielono dymissyją. Otrzymali oni wkrotce nagrodę od samychże Moskalew godną ich podłego niewolnictwa. Muchowski i Andrzychewicz nie pilnujący się nad granicą już Pruską wojska zostali przez kozactwo zachwyceni i do Warszawy zaprowadzeni. Pierwszego trzymał w przedpokoju Paskiewicz godzin kilka, a wychodzący do niego adjutanci klaszcząc pejczem z największą go pogardą przyjmowali; drugi obity przez kozakow, otrzymał pełną ironii od[3] na swoje skargę od Feldmarszałka odpowiedź.

Kiedyśmy już mieli Zakroczym opuszczać, wszedł[4] Kommitet Litewski dopomniał się u Ministra Skarbu zł[otych] 10.000 dla potrzebujących wsparcia Litwinow jeszcze przez Rząd Narodowy w Warszawie przeznaczonych. [s. 140] Delegowany zostałem przez Kommitet do Ministra Biernackiego do przyjęcia takowej summy, lecz po długich i kilkokrotnych, próżnych a wykrętych rozmowach, nie mogłem więcej wytargować nad 4,000 zł[otych] nie spełna, a to jak mi powiadał dla zbytecznego w dzisiejszym czasie ubóstwa kassy narodowej. Wszakże było jeszcze do osmiu milionow, a po rozdaniu dla kilkunastu posłow naprod[5] w Płocku po # 50 a potem dla kilku z tejże samej summy we Frankforcie nad Odrą p[ana] marszałka Ostrowskiego po # 40, i po utrzymaniu coraz zmniejszającego się wojska od Zakroczymia do granic Pruskich przez dwa tygodnia, niewiem co się z pozostającą resztką milijonow stało. Chociażby nawet Bankowi Polskiemu [?] 5.000.000[6]. Po przyjęciu wyznaczonej summy dla

[1] У канцы сказа аўтарам робіцца пазначэнне ў выглядзе зорачкі аб спасылцы, аднак на пакінутым у канцы старонкі месцы, і які адсутнічае.

[2] Напісана над радком замест закрэсленага слова *ich*.

[3] Закрэслена.

[4] Закрэслена.

[5] Сучаснае напісанне слова *naprzód*.

[6] Сказ напісаны на палях.

Litwinow, rozdaem dla najwięcej potrzebujących a przez Kommitet wyznaczonych osob, i kwity od nich poświadczone przez Prezesa Kom. Niesiołowskiego w Ministerium P[ana] Biernackiego złożyłem.

Przez czas 10dniowego pobytu w Zakroczymie mieszkałem razem z Zambrzyckim, Grotkowskim Janem, Ludwikiem, Waleryjanem Pietkiewiczami, i Koźmianami. [s. 141] Często do nas przychodził Zienkowicz, i szulerował w drugich pokojach tejże oberży u Chlędowskiej byłej redaktorowej, a teraz włóczącej się szulerki za obozem i ogrywającej oficerow, przegrał jej jednego wieczora 120 dukatow. ■ nazajutz Sierakowskiemu 30, takim więc to sposobem poszły pieniądze wzięte przezeń z powstania Oszmiańskiego (patrz str. 43). Mimo tego bowiem że nie wydał ze 100 dukatow wziętych na swoją osobą jak 60 a najwięcej 70, dla utrzymania powstańcow Oszmiańskich[1] ale zatrzymał jeszcze dukatow 100 przeznaczonych do wręczenia Onufremu Pławskiemu[2] który po bitwie pod Rumem w powstaniu Oszmiańskim nie mógł się zaraz z nami połączyć. Jeżeli więc i w poźniejszym czasie nigdzieśmy Pławskiego niewidzieli nie mógł pan Zienkowicz przegrywać tych pienięndzy, które przeto nigdy nieprzestały bydź własnością powstańcow Oszmiańskich. Wreszcie kiedyśmy ustępując kaprysowi Przezdzieckiego, dali tylko Kajetanowi Lenartowiczowi # 50 a sami wzięli po 100 przyrzekliśmy się z nim w razie potrzeby na równo dzielić, czego bynajmniej także pan Zienkowicz niedotrzymał. Ale dajmy już pokój temu infamisowi, gdybym [s. 142] chciał wszystkie jego podłe a płaskie czynności szczegółowo wyliczać, niestałoby mi może tych kartek.

W Zakroczymie dostaliśmy Zambrzycki, Waleryjan Pietkiewicz i ja za przedstawieniem Kommitetu Litewskiego krzyże i podwyższenie rangi. W czasie pełnej wojskowości, gardziłbym tymi błyskotkami, przyjąłem teraz jako jedyną pamiątkę naszej rewolucyi na osobę moją spływającą.

[21. Września]. Wyruszyliśmy nakoniec 20 Września z Zakroczymia zostawując załogę 4 do 5,000 w Modlinie, z siłą więcej 20,000 wynoszącą do Płocka gdieśmy nazajutrz stanęli. Ztamtąd mieliśmy iść do Województwa Krakowskiego, połączyć się z Różyckim i opierając się o granicę Austryjacką prowadzić dalej kampaniją. Już w tem celu Dembiński z 4 tysiączną awangardą przeszedł po wystawionym na przędu moście Wisłę i oddał się[3] 23 t[ego] m[iesiąca] do Gąbina. Lecz kiedy się zatrzymał w miasteczku dla odpoczynku, nowy Wódz naczelny Rybiński przysłał rozkaz najśpieszniejszego wracania się[4] do Płocka, gdzieśmy aż do 27 Września bezczynnie stali, demoralizując do ostatniego przeszło 20,000 tysiączne wojsko.

[s. 143] Tu oburzeni niedołężnością i niestałością niewiedząc czego się chwytającego Wodza, mieliśmy zamiar z Waleryjanem przebrani po chłopsku lub po cywilnemu, przedzierać się do wolnego miasta Krakowa, i tam nie czekając bezzawodnego a wkrótce już nastąpić mającego rozsypania się wojska, wyglądać wiadomości zupełnego sprawy narodowej wypad[1] upadku i szukać tułackiego dla siebie przytułku. Zmieniliśmy jednak następnie ten zamiar, mniemając bydź[2] za bezpieczniejsze trzymanie się do ostatniego czasu poruszeń wojska. Jakożeśmy się nie omylili, albowiem Niemojewski ■ Olizarem jadący przywatnie do Prus zachwyceni przez Czerkasow zostali.

[28. Września]. Kiedy już siły rossyjskie otaczać Płock zaczynały, wyszliśmy przez Dobrzyń, górny Szpital do Włocławka gdzie po zbudowanym na predce na berlinkach moście zamierzaliśmy znowu przejść Wisłę. Aleśmy ledwo torpoczty wyganiające z miasteczka kilkuset moskalow przeprawili, kiedyśmy się dowiedzieli o czekającym na nas nieprzyjacielu. [29. [września]. Niechcąc więc ryskować bitwy i narażać się na przyparcie w razie odwrotu do Wisły, wróciliśmy nazad [s. 144] do gornego Szpitalu strzelając się już z nacierającem natarczywie kazactwem.

Niemogą opuścić Włocławka beż oświadczenia prawdziwej wdzięczności tamecznemu kupcowi zboża, osiadłemu od lat kilkunastu w Polsce Tyrolczykowi Sztejnerowi, który nas ■ Waleryjanem po ojcowsku prawdziwie w domu swoim przyjął i na nocleg zaprosił, a kiedy w nocy zrobił się alarm i wojsko niespodzianie nazad przez most przechodzić zaczęło, zbusził nas wygodnie odpoczywających, i z własnem narażeniem się chciał nas ■ siebie przechować, lecz kiedyśmy na to nieprzystali, pożegnał nas ze łzami, wręczając nam list do jednego ze swoich przyjaciół, na drugim brzegu Wisły mieszkającego, aby nam niczego czegobyśmy tylko ku naszej pomocy żądali nieodmawiał. W rozmowie z nami przyznając wyższość cywilizacyi innym narodom, oddał sprawiedliwość polakom, że żwiedzając wiel[3] niemało obcych krajow, w żadnym nieznalazł tyle ludzkości i prawdziwej cnoty jak w naszym narodzie.

[s. 145] [3. Pazdzier[nika]. W dalszej drodze ze Szpitala górnego, poszliśmy na Lipno, Skąpe, Rypin, Sadłowo, Zasadki do Swiedziebnej lichego miasteczka nad samą granicą Pruską położonego. Gdzie Waleryjan po cywilnemu już od Płocka przebrany, przyczepił się do bryczki Wojewody Ostrowskiego z Doktorem Gałęzowskim jadącego, a ja odpiąwszy szlify, i zmieniwszy wojskową poznańską furażerkę, od[4] jakiegoś nieznajomego, przebyliśmy w półgodziny granicę, zmierzając do Brodnicy, po niemiecku Strasburgiem przezwanego miasteczka. Tak tędy ukończyliśmy z Waleryjanem pieszą z Warszawy przez Płock do Prus militarną przechadzkę.

Tułactwo

W Strasburgu czyli po naszemu w Brodnicy, pilnując się Wojewody Ostrowskiego i udając jego domowego, szczęśliwie wykręciłem się od pięciodniowej kwarantanny, na którą wszystkich przybyłych z Polski sadzali [s. 146] do klasztoru za miastem

[1] Фраза *dla utrzymania powstańcow Oszmiańskich* напісана над радком.

[2] Перад прозвішчам закрэслены літары *Po*

[3] Фраза *przeszedł po wystawionym na przędu moście Wisłę i oddał się* напісана над радком.

[4] Закрэслена.

[1] Закрэслена.

[2] Закрэслена.

[3] Закрэслена.

[4] Напісана над радком замест закрэсленага *he*

położonego, gdzie niegodziwe dla zbytniego natłoku dawali mieszkanie, i najgorzej karmisno, za co jednak niesłychanie drogo trzeba było płacić. Wojewoda przez wzgląd winny jego osobie, miał dozwolenie odbycia w samem mieście i to w swojej stancyi, przepisanej formą kwarantany. Z nim zaś będący Waleryjan i Doktor Gałęzowski swobodnie mogliśmy przez cały tem czas chodzić po mieście.

Po wzięciu w Strasburgu pruskiego pasportu (Reise rute) wyjechałem do Torunia z Kantorberym Tymowskim najętymi końmi. A Waleryjan zabrał się z Ostrowskim. Widziałem się potem z nimi w Toruniu i ostatni raz we Wrocławiu [9-12. [pazdziernika], dokąd przez Frankfort nad Odrą, przyjechałem dyliżansem [15 25. Pazdziernika]. W dzodze poznałem się z Pawłem Popielem, którego mi potem znajomość bardzo była użyteczna w Krakowie.

[20-25. [pazdziernika]. We Wrocławiu gdy Popiel odjechał zostałem nie więcej jak z ośmiu talarami, nie mając nikogo prawie ze znajomych, i gdyby nie wsparł mnie Waleryjan piętnastu dukatami, niewiem sam, cobym robił…

[Успаміны аб паўстанні 1830 г.]

[Паўстанне Ашмянскага павету]

[s. 25] …што адзначае гэты нечаканы адыход, аднак нідзе яго дагнаць не атрымалася. Амаль у міле ад Ашмян спаткаў шэфа штаба Язвінскага, які рухаўся разам з войскам, каторы мне паведаміў, што на ваеннай радзе, што адбылася пасля выхаду з Ашмян, было прынята рашэнне аб адступленні перад пераважаючай сілай праціўніка ў кірунку лясоў, абараняючыся да таго моманту, пакуль не будуць арганізаваны нашыя сілы. І што Пшэздзецкі[2], пакінуўшы войска без паведамлення, накіраваўся проста да Смаргоні.

У гэтай сітуацыі, калі паўстанцкае войска пакінуў кіраўнік, вопыт якога выклікаў поўны давер, натуральна, што мусіў аслабець духоўны настрой, хаця гэтага яшчэ зусім не выяўлялася. Крычалі болей аб здрадзе, недаверу ў распачатую справу і баязлівасць, але ні прыпыняць дзейнасць, ні адхіляцца ад мэты ўвесь натоўп нават не меркаваў. [s. 26] Вышэйшая вайсковая ўлада зноў была вернута Важынскаму[3], і зноў чакалі, бо яго яшчэ разам з войскам не было, і рабілі на яго паклёп, што таксама збег з Ашмян.

Калі ў такой няўпэўненасці рушыўся без усялякай мэты па мінскаму гасцінцу паўстанцкі натоўп, разам перамешаны, сялянства, узброенае пікамі і косамі, з конніцай і экіпажамі, спяваючы набожныя посныя песні; і калі ўсё шэсце болей мела падабенства да нейкай узброенай і набожнай пілігрымкі, чым да ваеннага хвалявання, калі мы ўжо аддаліліся ад Ашмян на паўтары мілі, пачулі недалёка гарматы. Праз шматлюдныя шэрэнгі натоўпу прабег неспакой, спыніліся спевы, і ў глухім нараканні мы вырашалі, у які бок падацца. Адныя жадалі на Смаргонь, другія на Баруны і Вішнева. У такім раздваенні поглядаў пры сталым гуку аддеглых гармат [s. 27] і марнай трывазе, узнятай баязлівым шэфам штаба Язвінскім, у праходзе праз лясныя мясціны разбеглася шмат сялянства, і цэлыя атрады параміналіся ў дарозе. У разброд нам не верылася. І толькі ў вечары таго ж самага дня [3 красавіка] сабраліся хаатычна паразбеглыя і збіўшыяся са шляху атрады за Жупранскай пушчай у вёсцы Заблоць званай, куды раней прыбыў з атрадам Важынскі. Была створана наспех рада, і вырашана прасоўвацца ў кірунку лясоў каля Вішнева.

Пад час нашай дарогі ў малым мястэчку Суцькава застала нас паведамленне ад Пшэздзецкага, што ён моцна шкадуе аб тым, што застаўся адрэзаным ад нас непрыяцельскім войскам, якое не пажадала за ім адступіць, што як хутчэй з намі жадае аб'яднацца, што яго займае толькі распачатае [s. 28] паўстанне і г. д. Нягледзячы на тое, што было гэта звычайнай адгаворкай, гэта навіна ўзрадавала простых людзей, што яны хутка дачакаюцца свайго генерала. У сэрцах беднага сялянства ажыла надзея і ахвота. Хутка, як і абяцаў, прыбыў Пшэздзецкі. Была створана ваенная рада, на якой адныя прапаноўвалі аб'яднацца з мінскімі паўстанцамі, а другія арганізоўвацца ў Вішнева. Якія довады [illegible]

абодва бакі, убачым ніжэй. Зараз звернем увагу на дзень забойстваў і разні ў Ашмянах 3 красавіка[4].

Да самага мястэчка болей чым з тысячай пяхоты, да пяцісот конных чаркесаў і кабардзінаў, з чатырма гарматамі, двума пазіцыйнымі і двума палявымі, набліжаўся Вярзілін[5]. Усе адпаведна загадам адступілі. Адзін толькі [s. 29] Сцяльніцкі[6], якому ў паўстанні было даручана фарміраванне конніцы, ці ад таго, што не зразумеў распараджэння, ці з-за ўпартасці, ці дрэнна зразумелай адвагі, застаўся ў мястэчку з дваццаццю чалавекамі з конніцы і стральцоў, перамешаных з касінерамі.

Пачынаючы з восьмай гадзіны раніцы маскалі пачалі няспынна страляць з гармат по мястэчку, напэўна для запужвання паўстанцаў магутнасцю сваёй артылерыі. У хуткасці закацілі яны на Віленскую вуліцу палявую гармату. Сцяльніцкі атакаваў яе ўздоўж вуліцы, аднак некалькі выстралаў карцеччу разбілі і рассыпалі конніцу, якая налічвала каля дваццаці чалавек і добраахвотна кінулася на пагібель з-за неразумнага загаду асляплёнага кіраўніка.

Пасля таго, як невялікі атрад Сцяльніцкага быў разбіты, неўтаймаваны зброд уварваўся [s. 30] ў горад, быццам яго захапілі штурмам, не прапускаючы ні слабога пола, ні састарэлых. Для іх не было нічога святога. Жанчыны і дзеці, схаваўшыяся пад боскай аховай у касцёле, палі ахвярай лютасці раз'юшаных дзікуноў. І была гэта ахвяра, алырскапая крывёю бязвінных! Не прыпыняліся забойствы на вуліцах. Былі забіты два ксяндзы, жыхары Завадскі[7], Ган[8] і ш[мат] і[ншых]. Аднак сама смерць яшчэ не знішчала ў вачах полчышч акупантаў выступлення з узняццем зброі за вольнасць. Ім патрэбны былі яшчэ пакутніцкія забойствы. У якасці трафеяў перамогі варвараў над бяззбройным народам застанецца ўспарыванне нутра ў аднаго з жыхароў, калі дапытваліся ў яго пра грошы; рассяканне доктара Закржэўскага[9], і забойства каля двухсот простых жыхароў. Іх кроў цяжарам ляжа на галаву віноўніка ўсяго гэтага – Храпавіцкага[10], [s. 31] калі людскія паводзіны на зямлі паддаюцца вышэйшай наканаванасці, наўмысна паслаўшай зборышча катаў для таго, каб спалохаць паўстанцаў!

Заканаўшы шматлікія кучы няшчасных ахвяр, Вярзілін вярнуўся ў Вільна, а яго войска знаходзілася ў стане трыумфу, вартага часоў Тамерлана[11], займалася крадзяжом начыння з касцёлаў і прыватнай уласнасці забітых жыхароў. Так помсцілі бязвінным і бяззбройным у XIX стагоддзі! Але што значаць стагоддзі для варварскага ўрада? Любы дэспатызм ніколі не ведае мяжы і зменаў.

Пасля вяртання расійскай улады ў Ашмяны, разаслалі ў розныя бакі шукаць Тышкевіча[12], Важынскага і мяне, а нашы маёнткі трапілі пад канфіскацыю[13], каб спагнаць тую суму грошаў, якая была забрана з пошты на выдаткі [s. 32] паўстання. Члены Камітэта Ванькові[14] і Сарока[15] зніклі загадзя. З першым не ведаю, што стала, а другога злавілі чаркесы ў Крэва і, закаванага ў кайданы, адвезлі ў Вільна. Гэты паважаны стары, які некалькі разоў бачыў падымаючуюся з труны айчыну, адважна ішоў на насільніцкі суд, размаўляючы з сапраўднай шляхетнай адвагай: «Можаце адабраць апошнія дні майго жыцця, якое і так ужо хутка скончыцца. Не шмат чым мая смерць вам спатрэбіцца. А Польшча была і быць павінна».

Калі адбывалася гэта ў мясцінах, пакінутых паўстанцамі, у Суцькава на ваеннай радзе атрымаў перамогу праект аб размяшчэнні ў Вішнева. Намер Язвінскага аб аб'яднанні з вілейскімі паўстанцамі быў адхілены.

Вішнева, размешчанае ў лясным атачэнні, давала добры прытулак яшчэ не сфарміраваным [s. 33] нашым сілам. Жалезаапрацоўчая фабрыка абяцала лёгкае забеспячэнне зброяй і карцеччу. Але найважнейшым было тое, што мы засталіся на тэрыторыі павета, займаліся арганізаваннем сваіх сіл, садзейнічалі ўзмацненню ў гэтых мясцінах духу, і раз'яднанню непрыяцельскіх сіл на значных прасторах. Наколькі гэты намер меў слушную перавагу над шкадлівым аб'яднаннем у вялікія масы, што супярэчыць прыродзе партызанскай вайны, выявіў вопыт. Бо, сабраўшыяся паўсюль у адным месцы, нявопытныя і дрэнна ўзброеныя натоўпы паўстанцаў былі разбіты і раз'яднаны ў адкрытых бітвах. І наадварот, найлепей распаўсюджвалася паўстанне, дзе паўстанцы праводзілі малую вайну невялікімі групамі, пазбягаючы шыкоўных бітваў. Аднак усё сапсавала баязлівасць і адсутнасць духу ў ваеннага кіраўніка.

[s. 34] Перад самым выхадам з Суцькава ў Вішнева з Вільна прыбыў поўныя запалу ў поўным узбраенні больш за дваццаць акадэмікаў[16] (Усе гэтыя акадэмікі падзялялі ўсе цяжары нашага паўстання ажно да аб'яднання з рэгулярнымі польскімі войскамі, і пазней ажно да заканчэння вайны служылі дзейна як простыя салдаты. Варта, каб іх імёны былі запісаны. Былі гэта наступныя: Дабоўскі[17], Цэзарый Свянціцкі[18], Свентаржыцкі[19], М. Ленартовіч[20], Якубоўскі, Навіцкі[21], Адам Махвіц[22], Пятроўскі[23], Эрнест Вашкелевіч[24], Савіцкі[25], а з імі іншая выдатная моладзь, Канстанцін Янкоўскі[26] і шмат іншых, каторых прозвішчэ ў гэтую хвіліну прыгадаць не магу). Такі ўзнёслы дух моладзі ўзрадаваў усіх паўстанцаў. Выступілі мы ў вызначаным кірунку. Прыпыніліся на адзін дзень у Крэва, дзе мясцоваму кіраўніку Шаціле[27], былому калісьці легіянеру, было даручана фарміраванне і збор паўстанцаў. Быў ён п'яніцай па прафесіі, як звычайна гэта адбываецца са старымі салдатамі, не шмат здолеў ён зрабіць, так як хутка яго, сапраўды п'янага, як мне паведамілі, засеклі чаркесы.

[s. 35] Адтуль рушылі мы, як было запланавана, спешным маршам у накірунку Вішнева. Прыпыніліся перад ім, а яўрэі, якія ўжо не адночы спрыялі нашаму паўстанню, занепакоеныя нечаканым падыходам узброенных паўстанцаў у колькасці да паўтары тысячы, выйшлі да нас з хлебам і соллю.

Пасля адпачынку на працягу ночы і наступнага дня, у значным беспарадку сабранага натоўпу паўстанцаў, выйшлі ўвечары і сталі бівакам у полі. Гэта было першы раз, калі ўбачылі мы сапраўднае абознае вогнішча і войска наша размеркаванае і пастаўленае лагерам. Выставілі мы пікеты і заставы. Усё гэта ўпарадкоўваў Язвінскі. Ён адзін меў хоць якое [s. 36] уяўленне аб вайсковай навуцы, будучы з гэтага часу душою і правадніком усяго. Без яго ўсё развальвалася б ад бязладдзя.

Назаўтра, пасля таго як выйшлі мы ў поле, калі спакойна цэлым штабам абедалі ў Пшэздзецкага, пачуліся блізкія выстралы карабінаў. Яны такім чы-

нам паведамлялі, што падыходзяць маскалі. Як можна хутчэй падрыхтаваліся мы да бою, размясціўшы ў густых, каля дарогі зарасніках стральцоў, а кавалерыю выставіўшы недалёка ад гасцінца, на раўніне каля леса, а на дарозе – гарматкі. [8/20 красав[іка]. Маскалі супраць нас выслалі эскадрон гусараў і эскадрон уланаў, перамешаных з казакамі. Аднак пасля таго, як нашы стральцы пачалі страляць і падстрэлілі двух гусараў, астатнія разбегліся.

Перамога засталася за намі, і дух, [s. 37] які пахіснуўся, ажыў нязмерна. Аднак паведамленне аб падступаючай да мястэчка артылерыі, у склад якой уваходзіла дзесяць ці адзінаццаць гармат, а болей баязлівасць Пшэздзецкага, патрабавала ад нас адступлення ад Вішнева і пошуку больш бяспечнага месца.

Расіяне не пасмелі атакаваць нас у густых і забалочаных зарасніках, яны, налічвая каля тысячы пяхоты і кавалерыі, спакойна прыпыніліся ў Вішневе, заставіўшы гарматы ў большай частцы ў дэмантаваным ці сапсаваным выглядзе з другога боку мястэчка. Мы са свайго боку адступілі да Бакштаў, а затым да Руму, шукаючы бяспечнага месца, дзе бы спакойна, падрыхтоўваючы наша паўстанне, маглі б затым стаць небяспечнымі і дзейнічаць у сваім павеце.

Праз тыдзень нашага побыту ў Руме пачаў сярод нас аднаўляцца парадак. Пачыналі мы фарміраваць [s. 38] новыя сілы, ці па меньшай меры рабілі для таго пасільныя намаганні. Намі былі сабраны запасы харчавання і ўсё неабходнае для прывядзення паўстанцаў у парадак. Гэтаму дапамагала блізкае размяшчэнне маёнтка Валожын, які належаў Тышкевічу, адкуль мы шляхам рэквізіцыі скарысталіся ўсім, што нам было патрэбна. Адным словам, арганізаваліся мы нанава.

Нечакана прыбылі ад вілейскага паўстання маршалак Гіцэвіч[28] і Аскерка[29], адрэзаныя ад сваіх і жадаючыя ў сувязі з гэтым аб'яднацца з намі, ці шукаць прытулку. Яны сумавалі з-за слабасьці павятовых літоўскіх паўстанняў. Адчувалі слабасць вілейскіх сіл, аднак і нашым давяраць не маглі, аглядаючы пазбіраны натоўп, які складаўся з людзей, не прыстасаваных для гэтай справы. І казаўтра яны пакінулі нас, жадаючы прабірацца да сваіх. Іх намерам з'яўлялася аб'яднанне абодвух паўстанняў памежных паветаў. [s. 39] Аднак сталы наш намер дзейнічаць у сваім павеце, і недавер з іх боку ў нашыя сілы да той ступені, каб маглі яны са сваім паўстаннем аддацца пад нашу апеку, як напачатку сабе ўяўлялі, разладзіла гэтае аб'яднанне і пакінула ўсё лёсу.

Калі ўсё гэта адбывалася, не ведалі мы аб тым, што недалёка знаходзіцца непрыяцель. [17/29 красавіка]. У вялікую пятніцу ранкам былі зняты нашыя пікеты; затым усе селі на коней. Я выехаў аглядаць нашыя заставы, а расійскія фарпосты ўжо набліжаліся прамой дарогай праз лес. Толькі я паспеў аб гэтым паведаміць Пшэздзецкага, як два гарматных выстралы абвясцілі пачатак атакі непрыяцеля на нашу конніцу, якая знаходзілася ў авангардзе. Руткоўскі[30] з падраздзяленнем стральцоў і добраахвотнікаў з татараў, якому была даручана арганізацыя засады ў лесе, ці ад баязлівасці, ці ад несвядомасці, не выстраліўшы ніводнага разу, прапусціў [s. 40] эскадрон уланаў, які дзейнічаў для падстрахоўкі гармат. Пасля таго, як былі адрамантаваны на роўнай і сухой дарозе маскі, разбураныя намі,

маскалі закацілі некалькі лёгкіх гармат і зрабіўшы некалькі выстралаў карцеччу рассыпалі нашу пяхоту, складзеную пераважна з касінераў. А стральцы, якія знаходзіліся ў засадзе, без усялякіх выстралаў рассыпаліся перад маскоўскімі егерамі, якія іх высочвалі. Яшчэ абараняўся са сваім падраздзяленнем пяхоты адважны віленскі акадэмік Пудзіноўскі, які ўтрымліваў наш ар'ергард. Ён пакажыў болей за дзесятак уланаў, якія імкнуліся прайсці наперад, аднак з [illegible] перавышаючай па колькасці непрыяцельскай пяхоты быў вымушаны адысці і схавацца ў лесе. Такім чынам, пасля таго як былі разбіты нашы сілы, адышлі мы пад абстрэлам карцечы, налічваючы ледзь восемдзесят коннікаў, разам з Важынскім, Пшэздзецкім, Язвінскім, а таксама Ленартовічам[31] і некалькімі дзесяткамі [s. 41] акадэмікаў праз раку ў брод і балоцісты луг. Услед нам маскалі браслі яшчэ некалькі гранат, якія аднак не нанеслі нам ніякай шкоды.

Пасля гэтага Саф'янаў[32] са сваім падраздзяленнем увайшоў у вёску Рум. Ад падпаленых ім сядзіб пачаўся пажар, які спаліў магазін[33], астаўлены намі. Не жадаючы ці не адважваючыся атакаваць таго, што засталося ад нас у лесе, накіраваўся ён да Бакштаў. Там ён перастрэльваўся яшчэ з невялікім нашым атрадам, пакінутым у Бакштах, і затым выступіў далей, у накірунку Вішнева.

Страціўшы ўсе нашыя сілы, і знаходзячыся ў натуральным бяссіллі з мноствам паклажы ў лесе, адправіліся мы рысцю на Яцкаў, што на мяжы Вілейскага павету. А парушаныя [s. 42] ў час адступлення, ці яшчэ раней, масты не дазволілі раз'яднаным нашым часткам аб'яднацца паміж сабой.

Пад час нашага адыходу на Яцкаў, у Завілейскі павет, калі мы праходзілі праз Доры, прыпыніліся мы ноччу ў маёнтку Куроўскага, дзе Язвінскі, які меў тут знаёмых, застаўся сам і пераканаў у гэтым Важынскага, з якім надалей разам хаваўся па лясах. У такім стане, калі ўсе перасварыліся на створаный наспех радзе, пастанавілі, што ўсе, хто застаўся, павінны прасоўвацца ў Завілейскі павет і аб'ядноўвацца з мясцовым паўстаннем, так як вілейскае [выступленне] было разагнана і адсунута далей да Мінскай губерні, і не магло нам аказаць ніякай дапамогі.

Калі мы ішлі для аб'яднання з завілейскім паўстаннем, Пшэздзецкі спаткаў у Аборку Гіцэвіча, [s. 43] які засцярог, што рассыпаныя ў гэтых мясцінах казакі не дазволяць нам ніякім спосабам здзейсніць запланаванае. Не маючы іншага спосабу вызваліцца і пазбавіцца ад помсты непрыяцеля, вырашылі мы ў прылягаючым засценку, Целяткі названым, размешчаным у недаступным лясным балоцістым месцы, схавацца на той час, а затым пасобку шукаць прыстанішча ў завілейскіх паўстанцаў.

Закапаўшы дзве нашы гарматкі, астаткі амуніцыі і паперы, раздаўшы ксёндзу Ясінскаму[34], Францішку Чаховічу[35] і іншым некаторую дапамогу, узяўшы пры гэтым 350 чырвоных злотых для мяне, Зянковіча[36] і Ленартовіча і мэтай забеспячэння зброяй нанава і аказання дапамогі іншым у выпадку, калі яны з намі аб'яднаюцца, пакінуўшы таксама застаўшыяся грошы, што складалі каля 40 000 зл[отых], [s. 44] Пшэздзецкаму для перадачы іх жмудскім паўстанцам для

вайсковых патрэб, куды ён павінен быў трапіць, вырушылі мы прабірацца ў Завілейскі павет.

Пазней гэтыя грошы былі аддадзены Гелгуду[37], і, напэўна, без карысці для краіны ляжаць ёсць дзесьці ў Прусіі.

Тым часам часткі нашага паўстання рознымі невялікімі атрадамі прабіраліся ў Завілейскі павет. Я, Зянковіч, Каэтан Ленартовіч, Бутлер[38] і некалькі акадэмікаў, апрануўшыя па-сялянску, везлі ўпотайкі на ўздзельным возе нашу зброю. Прабіраліся мы па бездарожжу на Маркава, Шведы, Ганўту, Войстан, Вішнева Суліcтроўскай, Дубраўляны, Свір, Лынтупы – да Свянцян, куды прыбылі, наколькі сабе магу нагадаць, 22 красавіка[39] г[этага] г[ода].

Пад час гэтай нашай дарогі заязджаў я разам з Зянковічам да Гюнтэра. Ён прымаў нас [s. 45] з вялікай расчуленасцю і ветлівасцю, аднак яго патрыятызм не пашыраўся настолькі, каб ахвяраваць [на агульную справу] свой маёнтак і сваю асобу. Як сам мне паведаміў, маючы ўзброеных і належным чынам апранутых людзей, не даставіў іх аднак вышэйшым уладам мясцовых паўстанняў, асцерагаючыся праследавання расіян. Я не магу судзіць, ці рабіў ён гэта з-за разважлівасці, асцярогі, боязі ці з-за іншых якіх прычын, не ведаю ніякіх аб гэтых абставінах падрабязнасцяў. Ведаю толькі, што завілейскія паўстанцы адзываліся аб ім не найлепшым чынам.

І вось рэшткі ашмянскага паўстання, налічваючы каля 40 коней і столькі ж пешых стральцоў, зліліся ў адно цэлае з завілейскім паўстаннем з намерам падзяляць далейшы лёс паўстаўшай Літвы.

[s. 46] Значыць, калі мы выратаваліся, маглі зноў быць карыснымі ў вайсковай службе для айчыны. Важынскі, які хаваўся па лясах і там шукаў схованча ад пераследуючага ворага, трапіў яму ў рукі. Збіраючыся перабрацца са сваімі, служыўшымі ў яго людзьмі, з вілейскіх лясоў у Баруньскую пушчу, наблізіўся ён да свайго маёнтку Аляны. Асцерагаючыся там паказацца, ён выслаў з лесу свайго давеpанага чалавека, каб той паведаміў жонцы пра месца яго знаходжання і правёў яе для спаткання. Аднак на няшчасце арэндатар яўрэй даведаўся аб гэтым і данёс казакам, якія стаялі недалёка. Яны прыбылі ў гэтае месца, схапілі прысланага чалавека і пачалі яго распытваць пра пана. А калі не атрымалася ні пагрозамі, ні розгамі нічога ад яго даведацца, [s. 47] паставілі пячычаснага басым на распаленую патэльню. Небарака ад нясцерпнага болю выдаў месца, дзе хаваўся яго пан, якога адразу ж выцягнулі з лесу, павезлі ў Вільню і пасадзілі ў турму. Што стала з ім далей, даведацца я не змог[40].

<u>Завілейскае</u> <u>паўстанне</u>

Прабіраючыся ўзгаданым шляхам для аб'яднання з завілейскімі паўстанцамі, даводзілася нам чуць розныя звесткі аб паспяховай дзейнасці гэтага паўстання. Тысячы людзей, неабходным чынам узброеныя, збіраліся размясціцца лагерам каля Свянцян, дзе існаваў узорны парадак, што давала нам надзею. Тым

часам, калі мы сюды прыбылі, засталі мы ўсё ў такім стане, як было і ў нас, гэта значыць, у значным беспарадку. Заможная шляхта [s. 48] слаба ці размясцілася на занятых у мястэчку дамках, як бы непрыяцеля ўжо не было ў краіне. Не было ніякіх пікетаў, ніякіх вартаў, адным словам ніякай асцярожнасці, а між тым вораг ужо набліжаўся.

Пасля таго, як мы прыбылі, адправіліся мы проста да кіраўніка паўстання б[ылога] маршалка Вінцэнта Барткевіча[41]. Прынялі нас ветліва і пачалі распытваць аб нашых прыгодах. Назаўтра я быў запрошаны на ваенную раду, якая складалася з кіраўніка паўстання, Яна Пятроўскага[42] і Вайніцкага[43], павятовых камандуючых коннiцай і пяхотай, памешчыка Станіслава Кубеніцкага[44] і некалькіх іншых памешчыкаў. На ёй мы вырашылі пакінуць перад наступаючым ворагам Свянцяны і адыйсці да Дзвіны для аб'яднання з дзісенскім паўстаннем. [Прычынай стаў факт, што мы былі] ужо адрэзаны ад Вількаміра [s. 49] і прабіцца са зброяй у руках было немажліва.

<u>[29 красав[іка] г[этага] г[ода]</u>. Пасля заканчэння пасяджэння ўсе ўселіся на коней і праз Серанчаны, Камаі, Паставы, Соўчын і Мосар прыбылі да мястэчка Лужкі, размешчанага ў Мінскай губерні, дзе нас спаткаў Камітэт і ўзброеныя жыхары дзісенскага паўстання.

Мне падаецца, што я паступлю найлепшым чынам, калі змяшчу тут наступнае апісанне завілейскага, вілейскага і дзісенскага паўстанняў, якое выканаў кіраўнік завілейскага паўстання Вінцэнт Барткевіч і аддаў у Варшаве старшыне ўрада генералу Крукавецкаму[45].

«<u>Гістарычнае</u> <u>апісанне</u> <u>паўстанняў</u> у <u>Завілейскім,</u> <u>Дзісенскім</u> і <u>Вілейскім паветах</u>»

На заклік паўстання ў Варшаве [s. 50] маскоўскае войска прыняло ў Літве баявы парадак, як у варожай краіне, у грамадзян усіх ступеняў і жыхароў была адабрана зброя. З Вільні ў Дынабург быў перавезены арсенал, і калі расійскае войска ўвайшло ў Каралеўства Польскае, напачатку Жмудзь, а потым Літва адважыліся паўстаць. Завілейскі павет, размешчаны паміж Вільнай і крэпасцю Дынабург, стала заняты з-за шматлікіх праходаў маскоўскіх войскаў, служыўся месцам, якое не адпавядала выступленню. Як толькі Ашмянскі павет здзейсніў паўстанне, адважныя жыхары Завілейскага павету сабраліся ў колькасці трыццаці коннікаў і здзейснілі напад на павятовы горад Свянцяны, разбройлі каманду, якая налічвала 80 чалавек, а 60 узброенных чалавек са складу коннай гвардыі вымусілі адыйсці да Відзаў, а пры выхадзе забралі трыццаць вазоў з фляжкамі [s. 51] і іншым вайсковым абсталяваннем.

Пасля таго, як былі заняты Свянцяны, жыхары абвясцілі Акт паўстання, утварылі часовы камітэт і ўсе неабходныя для гэтага аддзелы, а мяне [Барткевіча] абралі кіраўніком паўстання ўсяго павету. Камендантам пяхоты быў прызначаны Міхал Вайніцкі, а конніцы Ян Пятроўскі. Усю шляхту без выключэння прызвалі сядаць на коней. Акрамя гэтага было вызначана паставіць з 25 сялянскіх дымоў[46]

аднаго коннага салдата і з двух дымоў – аднаго пешага. Адпаведна такому раскладу пры ўмове паспяховага выканання волі Камітэта Завілейскі павет мог бы ў хуткім часе выставіць 1 500 конных і болей за 5 000 пешых салдатаў. Аднак павет, у значнай частцы акупіраваны непрыяцелем, [s. 52] акрамя найлепшых пажаданняў, маючы значныя перашкоды да таго, за некалькі дзён паставіў сто конных салдатаў і трыста стральцоў з паляўнічай зброяй. Знаходзячыся ў такім стане, сілы паўстанцаў Завілейскага павету адбівалі непрыяцеля. Аднак менавіта тады, калі найшчаслівейшае і наймацнейшае ашмянскае паўстанне было разбіта ворагам, а ўдзельнікі гэтага паўстання Зянковіч, Клюкоўскі і Ленартовіч разам з 30 коннікамі і 60 стральцамі асобнымі невялікімі атрадамі далучыліся, князь Хілкаў[47] са сваімі сіламі ў паўтары тысячы рэгулярнага войска і з шасцю гарматамі з аднаго боку, а з другога Кахоўскі з немалым войскам, пачалі націскаць на завілейскіх паўстанцаў. Хаця ж быў яшчэ адкрыты шлях для аб'яднання са жмудскімі паўстанцамі, [s. 53] я лічыў за лепшае арганізацыю дыверсіі супраць непрыяцеля, цягам уратавання паўстанцкіх сіл Мінскай губерні адыйсці ў Дзісенскі павет, размешчаны ад Жмудзі болей за 50 міль. Прычым, аб'яднаўшы нашыя сілы з паўстанцамі Віленскага павету, намерваўся перайсці Дзвіну і ўдарыць па Дынабургу. З гэтым усе падначаленыя, якія ўваходзілі ў раду, пагадзіліся. Зараз жа пасля гэтага, нягледзячы на скудную амуніцыю і невялікія сілы, выйшаў я ў Мінскую губерню ў Дзісенскі павет, дзе спалучыўшы сілы завілейскіх паўстанцаў з паўстанцамі дзісенскімі ў мястэчку Лужках на столькі, на колькі мне дазваляў час. У сваім аддзеле заклаў я фабрыку пораху.

Начальнік вілейскага паўстання, Станіслаў Радзішэўскі[48], на сённяшні дзень палкоўнік [s. 54] 26 пяхотнага палка, пасля бітвы пад Вілейкай з пераважаючай непрыяцельскай сілай, ратуючы паўстанне ў гэтым павеце, адыйшоў да горада Глыбокае, размешчанага ў Дзісенскім павеце, і аддеглага толькі на 4 мілі ад нашага месцазнаходжання. Атрымаўшы звестку аб яго прыбыцці, неадкладна паслаў Радзішэўскаму з майго аддзелу 50 коней. А трохі пазней разам з начальнікам дзісенскага паўстання Брахоцкім[49] і усімі нашымі сіламі выступілі мы на дапамогу Радзішэўскаму. Аднак вораг, няспынна спаганяючы вілейскіх паўстанцаў, ударыў па ім, перш чым мы дайшлі да Глыбокага, і прымусіў Радзішэўскага пакінуць гэты пункт. У дарозе, якая вяла ад Лужкоў да Глыбокага, адступаючыя [s. 55] перад непрыяцелем вілейскія сілы аб'ядналіся з намі.

І хаця аб'яднанне павялічыла нашы сілы, адбылася яно ўжо позна, каб здзейсніць нашы намеры па пераходу Дзвіны і правядзення далейшых дзеянняў у гэтым месцы, тым болей, што вораг, праследуючы вілейскіх паўстанцаў, штодзённа атрымліваючы падмацаванні, з'яўляўся пагрозай нават для аб'яднаных сілаў. Тапрача таго ад Дзвіны мелі мы загароджаную маскоўскімі часцямі дарогу, а яшчэ болей перашкаджала тое, што набліжаючыяся ад Дынабурга сілы, усё больш спіскалі нашы пазіцыі.

Улічваючы гэтыя [s. 56] абставіны, і ўспрымаючы наша знаходжанне ў Дзісенскім павеце як небяспечнае, а пераход праз Дзвіну немажлівым, на сумеснай

нарадзе аб'яднаных сіл паўстання прынялі мы рашэнне, значную частку натоўпу, па большай частцы ўзброеную толькі дрэнна насаджанымі косамі і пікамі, і стомленую ваенным рамяством, распусціць па хатах, а пасля адбору салдатаў ісці напралом на Жмудзь.

У гэтым Адахоўскія, два браты, аднаго з якіх часовы ўрад ашмянскага паўстання дарэмна накіраваў з невялікім атрадам для ўзняцця паўстання ў Вілейскі павет, як заўсёды выказваючы рупліваць, прапанавалі, што яны ахвотна возьмуць кіраўніцтва над адпушчаным натоўпам, [s. 57] каб распаўсюдзіць паўстанцкі дух у Лепельскім і іншых паветах[50]. Калі Адахоўскі адправіўся па вызначанай дарозе, мы для ўратавання нашых сіл рушылі з-пад Глыбокага ў кірунку Жмудзі. Пасля шэрагу перашкод і цяжкасцяў, з якімі сутыкнуліся мы ў шматдзённым паходзе, спаткалі мы ў Завілейскім павеце князя Хілкава і Кахоўскага, размешчаных у выглядзе трох блізказнаходзячыхся гарнізонаў, якія імкнуліся акружыць нас і замкнуць дарогу. У такім становішчы вырашылі мы ўдарыць па цэнтральнаму гарнізону непрыяцеля, які размяшчаўся ў Качаргішках. Пасля таго, як была праведзена, наколькі гэта дазваляў час [s. 58] Радзішэўскім праверка, ударылі мы па ворагу, і па двугадзіннай сутычке без усялякіх стратаў з боку паўстанцаў, адбіўшы непрыяцеля са значнымі для яго стратамі, адкрылі дарогу для выканання вызначанага намеру. У далейшай нашай дарозе, каб уратаваць паўстанцкія часці, пазбаўленыя амаль цалкам амуніцыі, патрэбна было толькі пазманным абаротам заблытаць настойліва атакуючага нас пераўшаючай сілай непрыяцеля. З гэтай мэты ад Качаргішак павярнулі мы на дарогу праз Браслаўскі павет.

На гэтым абрываецца рукапіс Барткевіча, пададзены ім Круковецкаму.

Астатнюю меншую частку справаздачы для заканчэння поўнага ўяўлення пра ніжэй апісаныя паўстанні дадам з успамінаў, настолькі, наколькі пасля усіх зменаў [s. 59] і бураў, яны маглі захавацца да гэтай пары. Аднак, калі якія-небудзь падрабязнасці прапусціў, так за агульны сэнс кампаніі, які захаваў [у памяці] ў цэласці, ручаюся. Што тычыцца спосабу напісання, то тут можна знайсці розніцу не толькі ў спосабе бачання справы, а нават у суцэльным адлюстраванні. Бо працяг ніжэйназваных паўстанняў, не адлюстраваны ва ўрадавых дакументах, абавязкова мусіць прыняць каларыт аповяду відавочцы.

Так, рухаючыся на Рымшаны і Салокі, прайшлі мы досыць спакойна Браслаўскі павет і праз Даўгелі выйшлі да Вількамірскага павету. [14-26 мая] Далей, калі мы накіраваліся да Віжуноў і Свядасц, Радзішэўскі, альбо хутчэй уплываючы на яго камандзір вілейскай конніцы Зверскі[51], выказаў пажаданне аддзяліцца ад вілейскага і дзісенскага паўстанняў. Прычынай гэтаму стала абставіны, што, пасля таго як Барткевіч і Брахоцкі адмовіліся ад кіраўніцтва ўзброенымі сіламі трох паўстанняў, завілейцы і дзісенцы [s. 60] не пагадзіліся з перадачай вышэйшай улады Радзішэўскаму. Пасля шматлікіх высвятленняў адпосілаў, куды я быў запрошаны Барткевічам і Брахоцкім, Радзішэўскі паабяцаў, што будзе трымацца разам, каб з-за пустых непаразуменняў не разрываць без усялякай патрэбы нашых сіл, чаго аднак да канца ніколі не выконваў.

У сітуацыі, калі мы не маглі такім спосабам узгоднена абраць начальніка аб'яднаных паўстанняў, кожны застаўся пры сваім. Барткевіч налічваў 300 чалавек пяхоты, па большай частцы ўзброеных карабінамі са штыкамі, каля ста пяцідзесяці чалавек з завілейскай конніцы і апрача таго ашмянскі атрад, які складаўся з 30 коней і 40 пешых стральцоў, да таго ж яшчэ 30 коннікаў выключна з ліку завілейскіх жыхароў. Брахоцкі налічваў 100 чалавек пяхоты з агнястрэльнай зброяй, 150 касінераў і пікінераў[52], 250 коннікаў, прычым на ўсіх была адна жалезная гарматка для салютаў. [s. 61] Радзішэўскі фанабэрыўся сваёй артылерыяй, якая складалася з дзвюх палутарафунтовых гармат, старанна на лафеты насаджаных, забяспечаных прытым неабходнай колькасцю зарадаў. Кіраваў імі Керсноўскі[53], больш-менш знаёмы з артылерыйскай навукай. Для падстрахоўкі мелася 80 пехацінцаў з агнястрэльнай зброяй, столькі ж касінераў і 150 коннікаў.

Такім чынам, нашы сілы складаліся з 740 пехацінцаў, 610 коннікаў і трох гармат; увогуле з 1350 людзей. Аднак, калі разрыў з Вілейскім паветам стаў відавочным, а таму і дрэнным прыкладам, пачалося непамернае дэзерцірства сялянства.

Калі гэта адбывалася і мы паглыбляліся ў Вількамірскі павет, да нас дайшло паведамленне, што ў мястэчку Купішкі знаходзіцца павятовы камітэт. Пачуўшы гэтую навіну, [s. 62] накіравалі мяне са Станіславам Кубліцкім [16/28 мая] паўнамоцнымі ад аб'яднаных паўстанняў да названага камітэту з адкрытым лістом, у якім мясцовыя ўлады паведамляліся аб набліжэнні ў гэтыя мясціны нашых сіл, скіраваных для сумесных з вількамірцамі дзеянняў. Аднак не знайшоўшы самога, дакладна кажучы, камітэта, а толькі пасланцаў, накіраваных для збору кантаністаў і аднаго члена камітэту, забяспечыліся мы неабходным харчаваннем і фуражом.

[1 чэрвеня г[этага] г[ода]. Назаўтра сілы аб'яднаных паўстанняў наблізіліся да Купішак, а адтуль выйшлі на Трашкуны.

Вількамірскае паўстанне, калі мы падыйшлі, не канцэнтравалася ў адной масе, як наша, а наадварот было раскідана невялікімі часцямі па велізарнаму павету і малымі сіламі раздзірала ў шматлікіх пунктах ворага. Што падыходзіла [s. 63] для вядзення малай вайны, тут было шкодным. Вярхоўнае кіраўніцтва ўзброеных павятовых сіл было з некаторага часу даручана маладому хлопцу з добрымі намерамі і патрыятызмам, аднак без усялякага вопыту, а тым больш без усялякага знаёмства з ваенным мастацтвам, Медарду Кончы[54]. Генеральным сакратаром назваўся Міхал Пяткевіч[55], які падбухторваў начальніка ў многіх справах. Іншыя вількамірцы, а асабліва Калышкі[56], якія кіравалі ваеннай радай, знаходзіліся ў недаступных багнах Вадоклей, недалёка ад Леанішак, размешчаных на паштовым віленскім тракце. Безумоўна, пры галоўнай кватэры павінен быў знаходзіцца адпаведны асноўны корпус. Іншымі невялікімі атрадамі кіравалі Лісецкі[57], Фердынанд Граткоўскі[58] і інш. Яны чакалі падтрымкі ад нашых сіл супраць маскалёў, налічваўшых 1000 чалавек [s. 64] і дзве гарматы, акапаныя ў Ракішках. Аднак ні Барткевіч, ні Брахоцкі не адгукнуліся на заклік, калі ўбачылі слабыя сілы, якія налічвалі каля 200 ці 300 чалавек конніцы, і па гэтай прычыне не спадзяваліся на паспяховы вынік бітвы з акапаўшымся ворагам і адмовілі ў дапамозе, спасылаючыся на адсутнасць амуніцыі і залішняе стамленне людзей у такім нечаканым і доўгім паходзе з-за Дзвіны. Пасля гэтага толькі адзін Лісецкі пусціўся на авантуру, выступіўшы на Ракішкі, аднак пасля дарэмных выстралаў, мусіў спешна адступіць на пачатковыя пазіцыі.

Трэба аднак прызнаць, што вількамірскае паўстанне з'яўлялася больш многалюдным у параўнанні з нашым, і лепшым чынам арганізаваным. У папярэдні час з ім было звязана некалькі станоўчых момантаў [у барацьбе] з ворагам. Людзі былі добра апрануты і ўзброены, [s. 65] коні баявыя, старанна ўтрымліваліся складскія запасы. Грамадзянская моладзь стварала так званыя партызанскія атрады[59] і ў вялікай колькасці сядала на коней.

Калі мы размясціліся ў Трашкунах, зноў выехаў з Кубліцкім да Кончы для стварэння ўзаемных умоваў супольных дзеянняў з вількамірскімі паўстанцамі. Адпаведна ўкладу з абодвух бакоў пагадзіліся ўтрымліваць аб'яднанымі сіламі ваенную лінію ад паўночных межаў Ковенскага павету да самых Ракішак. Для гэтага вырашылі расставіць атрады, складзеныя з некалькіх сотняў чалавек, на такой адлегласці адзін ад другога, каб ва ўсякім выпадку дзейнічаць паспяхова, а пры неабходнасці хутка аб'яднацца.

Такім чынам, па выніках умовы Барткевіч і Брахоцкі занялі пазіцыю ў Трашкунах, а Радзішэўскі спачатку ў Шыманцах, [s. 66] затым ён змяніў сваё размяшчэнне ў адпаведнасці са зменай кірунку вількамірскіх атрадаў.

Пасля цяжкага і стаміўшага нас паходу, мы на працягу цэлага тыдня адпачывалі ў Трашкунах. Барткевіч, як добры салдат, нягледзячы на яго строгі старапольскі падыход да звычаяў і насуперак значнаму ўжо ўзросту, ніколі не шкадаваў сваёй працы, прысвяціўшы аднойчы жыццё, маёнтак і сям'ю бацькаўшчыне. Адразу з усходам сонца стары, пакрыты сівізной, заўсёды сядаў на каня і аддаваў узброеным людзям загады. Захоплены адной толькі справай ён недасыпаў, недаядаў столькі разоў, колькі гэта было патрэбна. Брахоцкі пры вялікіх разумовых здольнасцях і вышэйшых схільнасцях, рызыкуючы неаднойчы ў дзісенскім паўстанні, смела дзейнічая сярод варожага агня, таксама абцяжараны гадамі і пазбавіўшыся значнага маёнтку, не меў столькі [s. 67] упартасці, і не раз, шукаючы ў гарачых напоях асалоды нягодам і супярэчнасцям, станавіўся інэртным і абыякавым. Было гэта відавочна, захапляючае для кожнага, хто мог ацаніць сапраўдную высакародную самаадданасць і забыццё сябе самога дзеля грамадства. Абодва гэтыя старцы ў цывільным адзенні з карабелямі[60] на баку, сядлаючы коней сярод шматлікай, сабранай дзякуючы іх стараннасці грамадзянскай моладзі, знаходзіліся ў нягодах і небяспеках на чале паўстанцаў.

Пад час нашага тут знаходжання супакойвалі нас сабраныя ў адным месцы значныя сілы паўстанцаў, недаступнасць пушчы, усё больш і больш падобныя да праўды пагалоскі аб набліжэнні польскіх войскаў. Мы свабодна размясціліся ў мястэчку Трашкуны. Гэта было па-сапраўднаму маляўнічае відовішча, якое

пагалвала сярдзіявечча ці нашу Барскую канфедэрацыю[61]. Свабодна сабраная моладзь [s. 68] са сваімі бацькамі ці крэўнымі старэйшага ўзросту абедала і вячэрала за традыцыйнымі ў тры рады сталамі, настаўленымі каля трапезнай. Усе яны, узброеныя пісталетамі, шаблямі ці старажытнымі карабелямі з залатымі рукаяцямі, жалезнымі старадаўнімі рапірамі ці загнутымі турэцкімі палашамі[62], у дзіўным і ў кожнага іншым адзенні, весела і з ахвотай сядалі за сталы. Шэрага колеру настольнікі, алавяны посуд і алавяныя куфлі з півам, пастаўленыя перад кожным, сціплыя, без лішку (бо ў нашым становішчы гэтага немажліва было ўжываць) стравы, але шчодра настаўленыя; укрыжаваны Хрыстос, выразаны з дрэва і закопчаныя па баках кляштарныя абразы, вокны, якія выходзілі на касцёльныя муры і законніцкі сад; старанны, гасцінны, ветлівы, [s. 69] шчыры бернардынскі гвардыян[63] з цяжкасцю з-за сваёй паўнаты прыслужваў у сваім кляштары ўзброеным гасцям пад час іх гутаркі. Як жа рамантычна выглядала сцэна! Патрэбна была толькі Альцына, каб наша сапраўдная рэчаіснасць перанеслася ў чароўныя краіны з фантазіі Арыёста[64]!..

Каля чвэрці мілі ад Трашкуноў жыў заможны памешчык Хоппен. Яго дачкі, адпаведнага маёнткавага выхавання, яго далёкія крэўныя і шматлікія жанчыны, якія збягаліся ў гэтыя мясціны, каб пабачыць прыбыўшых з незнаёмых мясцін паўстанцаў, прыносілі прыгатаваныя імі стравы для нашых салдатаў, стаяўшых на варце. У спакойным вясковым зацішшы пасля цяжкасцяў і спёкі прыемна правялі мы сярод прыгожых жанчын некалькі дзён з забавамі, музыкай, [s. 70] танцамі і патрыятычнымі спевамі.

Праходзілі дні ў вясёлай бяздзейнасці, калі спраўдзіліся звесткі пра паход польскіх войскаў да межаў Літвы. Мы выслалі да польскіх генералаў Хлапоўскага[65] і Гелгуда эмісараў, спаткаліся з Кончай і заклікалі да найхутчэйшага далучэння да рэгулярных войскаў. З адпаведнымі ж пераканаННЯмі да нас прыбыў Непакойчыцкі[66], запэўніўшы нас, што яго сын і Канстанцін Залескі[67] гэтую навіну прывезлі ад генералаў, якія знаходзяцца ўжо ў Ковенскім павеце. Хутка і Конча, які прысвоіў сабе вышэйшую ўладу над аб'яднанымі паўстанцкімі сіламі, прыслаў загад Барткевічу, Брахоцкаму і Радзішэўскаму, каб яны далучаліся да Хлапоўскага, накіроўваючы нас шляхам на Вепры, размешчаныя пад [s. 71] Вільняй. Гэты загад, напісаны ў рэзкіх і кароткіх выразах, які загадваў паслушэнства пад карай расстрэлу ў 24 гадзіны, абурыў начальнікаў паўстанняў. Так, не звяртаючы ўвагі на пажаданні пана Кончы, рушылі мы з аб'яднанымі сіламі на Леанішкі, Шылы і Вадоклі для злучэння з галоўным корпусам Гелгуда.

[8 чэрвеня]. У далейшай нашай дарозе праз Упіцкі павет, у Пагірах нам урачыста пад звон усіх званоў вышаў мясцовы пробашч, апрануты ў касцёльнае ўбранне і акружаны некалькімі ксяндзамі з запаленымі свечкамі і з манстрацыяй у руцэ, пад балдахінам, расцягнутым для нашага спаткання. Затым, калі наблізіліся мы да Шатаў, па дарозе спаткалі нас пані Гінтаўтаўны і іншыя, прозвішчаў якіх ужо не магу ўзгадаць; яны [s. 72] кідалі сваімі прыгожымі ручкамі пад ногі нам кветкі і гірлянды, з выразам, поўным радасці і шчасця, таму што бачылі

вызваляючуюся з-пад цяжкага ярма айчыну. О, хто ж бы на ўсе гэтыя чулівыя знакі святой любові да бацькаўшчыны, паўстаўшай краіны, не расчуліўся да гарачых слёз!.. Ах! Усё гэта прайшло, як нязбытны прывід!

Калі мы ў Шатах прыпыніліся для адпачынку, і разам з музыкам дзісенскага паўстання спявалі для сабраўшыхся ў мястэчку на рынку жанчын песні «Яшчэ Польшча не згінула», «Далей, браты, за булат», «Няхай жыве польская моладзь» і іншыя, якія даходзілі да нас з Польшчы, прыбыў ад [illegible] з фуражом падафіцэр 4-га палка. Вось гэта была радасць: убачыць упершыню [s. 73] польскага салдата з рэгулярнага войска; са слязамі яго ўсе распытвалі аб надрабязнейшых дэталях паходу і перамогах польскіх войск, кожны чым мог частаваў яго. А калі праязджаў ён каля лагеру, сялянства схапілася само за зброю і барабаны, выкрыкваючы на тысячы разоў радаснае ўра!

[10 чэрвеня]. Назаўтра рушылі мы ўсімі сіламі для з'яднання з Гелгудам, які размясціўся лагерам у Жэймах. Радзішэўскі, наколькі магу гэта прыгадаць, пайшоў іншым шляхам і аб'яднаўся з Хлапоўскім.

На гэтым заканчваецца нарыс літоўскіх паўстанняў, сведкам якіх я быў. Далей наступае аб'яднанне з рэгулярнымі польскімі войскамі і сумесныя нацыянальныя дзеянні, аднак перш чым да гэтага прыступіць, намалюю яшчэ кароценькі вобраз агульнага духу і дзеянняў літоўскіх паўстанняў.

[s. 74] Літоўскія паўстанні нават у вачах нейтральнага і непрыхільнага назіральніка застануцца для гэтай правінцыі ганаровай старонкай гісторыі. Выступленне супраць такога каварнага ворага, без неабходных сіл, узбраення, без усялякіх ваенных сродкаў, без усякай дапамогі і сувязі з Польшчай, якая ў лютым і сакавіку перамагала, з'яўляецца рэдкім у ваенных падзеях прыкладам сапраўднай багатырскай самаадданасці, ахвяравання і мужнай волі народу.

З першымі звесткамі аб паспяховым адпоры польскай зброяй акупацыйным войскам Расіі, ці хутчэй за ўсё пасля простага ўзнікнення домыслаў аб перамогах палякаў, паўстаўшых як добразычлівасць для краіны, разлілося паўстанне ад Нёмана да Дзвіны, асобна і самастойна ўспыхваючы ў кожным павеце. Перш за ўсё падняліся тры жмудскія паветы, затым Упіцкі, Вількамірскі, Ашмянскі, Троцкі, Завілейскі, [s. 75] Віленскі, а ў Мінскай губерні – Вілейскі, Дзісенскі, пашыраючыся аж да Лепельскага. Такім спосабам змагло падняцца ў Літве да 30 000 узброеных людзей для арганізацыі дыверсіі супраць расійскіх войскаў, але найбольшай карысцю было тое, што ўдалася захапіць усе вайсковыя сховішчы, размешчаныя ў Літве, і разарваць усе камунікацыі. І калі б не дапамога збожжам, якое бесперапынна пасылалася з Прусіі для ўсёй арміі Дзібіча[68], безумоўна пачаўся бы голад.

Ва ўсім гэтым нацыянальным паўстанні, сялянства, спадзеючыся ад сталых часоў галечы, няволі і цемнаты, выявіла, якой можа быць магутнай сіла пакрыўджаная народнасць, каб толькі хто ўмеў ёй уладна валодаць. Грамадзянства, з асаблівасцю моладзь, па большай частцы сядала на коней. Уся моладзь Віленскага універсітэта і тыя, хто вышэйшым духам былі ажыўлены ў сталіцы Літвы, усе паспяшалі

да паўстаўшых братніх шарэнгаў. Святарства, якое цярпела ўціск і праследаванне, увесь час пагрозы з боку расійскага ўрада [s. 76] найбольш старанна і найахвотней дапамагала ў паўстанцкай справе. О, якім узнёслым з'явіўся тады заклік прадстаўнікоў духоўнага сану, яно цалкам загладзіла ўсе кідаемыя ў яго бок абвінавачванні, якія ў многіх выпадках былі і правільнымі. Адныя толькі магнаты, да і то старэйшага ўзросту, не жадалі ніякім чынам прычыніцца да паўстання. Ні Тышкевічы, ні Чапскія, ні Храптовіч, ні Карп (акрамя яго сына Францішка, які, маючы непамерна слабае здароўе і ўсім яшчэ дзіцячы ўзрост, чынна дзейнічаў у паўстанні, а затым, у перыяд адступлення Дэмбінскага, служыў у яго штабе), а таксама і шмат іншых у Літве, хто не пакінуў сваіх прозвішчаў у спісах паўстанцаў ці ім спрыяўшых. Аднак за такія паводзіны не стаў бы я вінаваціць іх у здрадзе ці садзейнічанні Расіі, а абвінавачваў бы ў эгаізме і баязлівасці рызыкнуць, паставіць на карту няпэўнай рэвалюцыі свае вялікія маёнткі.

Сялянства, сабранае масамі, у значнай частцы ўзброенае толькі косамі і пікамі, без адзення, без абутку, абарванае, з [s. 77] дрэнным харчаваннем, ахвотна станавілася пад паўстанцкія харугвы, узнятыя за вольнасць і веру, і калі б падтрымліваўся лепшы і дакладнейшы парадак, калі б гэты натоўп лепей кармілі і апраналі, не было бы ніякага дэзерцірства, якое час ад часу адбывалася ў розных месцах.

Пры вельмі слабым узбраенні народа, паўстанцы былі выстаўлены супраць пераважаючых сіл абучанага непрыяцельскага войска і магутнай артылерыі, меўшай палявыя і пазіцыйныя гарматы вялікага калібру, забяспечаныя неабходнай колькасцю карцечы, куль і гранат. Супраць якіх не маглі мы выставіць нічога акрамя малых гарматак, па большай частцы без лафетаў, і зброі, павыточванай з дрэва і абабітай жалезнымі абручамі, якія з-за сталага недахопу боепрыпасаў, вымушаны мы былі набіваць замест карцечы алавянымі кулямі ці пасечаным на дробныя кавалкі жалезам. Акрамя таго, [s. 78] каб маглі мы бесперапынна страляць у непрыяцеля, вымушаны былі мы вазіць за сабой з месца на месца, з леса ў лес фабрыку для вырабу пораху, снарадаў і куль для карабінаў.

Аднак жа з такімі слабымі сродкамі Вільня, асаджаная шматлікім войскам і артылерыяй, па-сапраўднаму была закрытай і знаходзілася ў стане аблогі. Разбураныя ўсюды паштовыя станцыі і пераправы на рэках садзейнічалі таму, што непрыяцель знаходзіўся ў стане поўнай невядомасці. І не аднойчы адбывалася, што паўстанцы дабіраліся аж да самых муроў горада, здымалі маскоўскія пікеты і выклікалі ў здзіўленага непрыяцеля непамерны страх.

Не было нічога, што магло бы так расчуліць, як выгляд сутычак ці паходаў [s. 79] літоўскага паўстання. Закліканая сеснь на коней шляхта, вымушаная нечакана бесперапынна біцца з непрыяцелем, не мела часу на тое, каб неабходным чынам прыбрацца і ўзброіцца. Адныя былі апрануты ў сурдуты, другія ў фракі, капоты, курткі, у ботах і без ботаў, са шпорамі і ў лапцях, узброеныя шаблямі, рапірамі, карабелямі, круціцамі[(4)], кінжаламі, нажамі, дзідамі і пікамі, дрэнна насаджанымі, кожны меў за поясам ці ў кабуры не меней, чым па дзве пары пістолетаў, гарцавалі на рослых прыгожых скакунах і тут жа — на схуднелых клячах ці сялянскіх дробных коніках. Трэба яшчэ было бачыць пяхоту, якая ішла пехатой з карабінамі, дубальтоўкамі, мушкетамі, паляўнічымі стрэльбамі[(5)], косамі і пікамі. Трэба было бачыць жалезныя гарматкі, [s. 80] якія цягнуў адзін ці два коні. Бачыць жанчын, адныя з якіх ахвотна суправаджалі мужоў, братоў, бацькоў ва ўсіх лагерных цяжкасцях, адбывалі працяглыя дарогі ці канаправанне па лясах і балотах, а другія кіравалі ўзброенымі атрадамі, каб па-сапраўднаму апошні, узнёслы пад'ём народа і поўнае ахвяраванне жыцця і маёмасці для вызвалення замардаванай айчыны!

Увесь гэты энтузіязм і ўсе такія прыгожыя ахвяры, як прадвеснікі шчаслівага выніку паўстанцкай справы, так злавалі, непакоілі і палохалі непрыяцеля. З дзікай помстай ён безупынна здзекваўся над няшчаснымі, якія на полі бітвы трапілі яму ў рукі. Не маю зараз пад рукамі сабраных фактаў, каб мог намаляваць крывавы вобраз іх [s. 81] лютасці, забойстваў, грабяжу і пажарышчаў. Мабыць, пазней акрэсліць гэта пазней у асобным месцы і адпаведнымі рысамі. Але раней у Ашмянах, няспынныя ў перыяд паўстання расстрэлы простых жыхароў, разбоі і гвалты па дамах, грабяжы і жорсткае знішчэнне краіны, ці была гэта помста, здзейсненая Матусевічам учынак над некалькімі чаркесамі, на чым так настойваў дзікі наш непрыяцель, як на якім-небудзь небывалым злачынстве? Ах, апрычнікі тырана, на патокі крыві невінаватых і спакойных жыхароў вамі праліты, здзейсненыя вамі шматлікія гвалты і пажары, а тады напракніце нас, калі вашы мелныя дзе дазволяць, у бесчалавечнасці ў абыходжанні з непрыяцелем, атрымаўшым перамогу!

[s. 82]

Аб'яднанне літоўскіх паўстанцаў з польскімі войскамі

[10 чэрвеня]. Пасля таго, як выйшлі мы з Шатаў, сталі лагерам каля маленькай вёсачкі, на адлегласці некалькіх міль ад мястэчка Жэймы, Ковенскага павета, дзе размясціўся корпус Гелгуда, які яшчэ не аб'яднаўся з аддзелам Хлапоўскага.

На гэтым заканчваюцца дзеянні літоўскіх паўстанцаў, якія з гэтага часу злучаюцца з рэгулярнымі польскімі вайскамі. Ад імені вярхоўнага камандуючага асобнага корпуса ў Літве генерала Гелгуда на ўсе бакі былі разасланы друкаваныя адозвы, «каб усе літоўскія паўстанцы як найхутчэй далучаліся да польскіх войскаў, якія новай перамогай пад Райгорадам адкрылі сабе шлях праз расійскія сілы, каб падаць сяброўскую руку ліцвінам». Як жа неадкладна з усіх бакоў і куткоў Літвы збягаліся паўстанцы, каб аб'яднацца [s. 83] і стаць у строй сваіх выратавальнікаў.

Не з'яўляючыся з гэтага часу адной са спружын альбо кіраўнікоў паўстання, уліваючыся паасобку ў вялікі нацыянальнай вайны, я заставаўся ўжо толькі выконваючай часткай, не ўплываючы на дзеянні. У сувязі з гэтым і апісанне далейшых дзеянняў не можа чэрпацца з агульнага становішча выпадкаў, не можа

раскрыць план літоўскай кампаніі і агульнага яе руху, але, што тычыцца маёй асобы, яна была толькі сведкай дзейнасці агульнага кола ваеннай машыны, перанесенай на літоўскую зямлю. Я адлюструю тое, што мяне найімацней з маёй пазіцыі здзівіла, што на мяне зрабіла якое-небудзь уражанне, што заўважаў, што слепа, з што па жаданні рупліва выконваў. Словам, пакіну нарыс ці хутчэй за ўсё ўспаміны, якія датычыць мяне аднаго. Хто цікавіцца агульнымі падзеямі далейшай кампаніі, хай звернецца да ўспамінаў генерала Дэмбінскага, якія, [s. 84] напэўна, хутка будуць надрукаваны ў Францыі[71]. Пісалі ўспаміны аб літоўскай кампаніі і іншыя высокія афіцэрскія чыны, меўшыя дачыненне да ваеннай рады і на падставе, аддаваных ім загадаў, склаўшых больш дакладнае ўяўленне. Паміж іншымі магу прыгадаць падпалкоўніка артылерыі Бартманьскага[72], які ўжо пасля заканчэння вайны пісаў у Галіцыі, і наколькі я мог зразумець з яго размоў, быў свядомым у гэтым. Але дастаткова ўжо гэтага, звернемся да свайго.

Такім чынам, калі мы размясціліся ў гэтай вёсачцы, якая знаходзілася недалёка ад Жэймаў, Брахоцкі і Барткевіч, сеўшы на коней, адправіліся на сустрэчу з Гелгудам. Убачыўшы сярод нас некалькі ашмянскіх паўстанцаў, Пшэздзецкі, трымаючыся галоўнага штабу (пасля пераходу праз Вількамірскі і Упіцкі паветы і аб'яднання з войскам), пазнаёміўся з цывільнай ашмянскай конніцай, складзенай па большай частцы з прыбыўшых з Вільні акадэмікаў, над якімі Зянковіч аднавіў [s. 85] сваё кіраўніцтва, апрануўшы іх у адзенне з намалёванымі рэбрамі, чэрапам і касцямі, а таксама ў чырвоныя плашчы, сам увесь час пазбягаючы бою. Выйшаў да нас Дэмбінскі[73] і пасля ветлівага вайсковага прывітання ў кароткай размове запытаўся аб тым, чым бы мы пажадалі заняцца. У выпадку, калі мы цалкам аддаліся волі кіраўнікоў, ахвяруючы сабой дзеля краіны, параіў запісацца нам у полк познаньскай конніцы, які складаўся з цывільных асабаў. Адвялі нас да палкоўніка Бржжаньскага[74], а затым да капітана Ланчкоўскага[75], дзе мы зараз жа запісаліся простымі салдатамі. Адзіны толькі Зянковіч, прадбачачы цяжкую службу, прыкінуўся хворым і застаўся круціцца пры Пшыздзецкім і па-юнацку невыносна выхваляцца пры штабе.

Што за моладзь гэта познаньская! З добрымі характарамі, напоўненыя экзальціраваным патрыятызмам, на заклік падняўшайся бацькаўшчыны пакінулі вялікія маёнткі і любімыя сем'і, [s. 86] і пранікшыся геройскай самаадданасцю, пакінулі чыны дасведчаным, а самі, вырваўшыся з лона пяшчоты і хатніх выгод, выконвалі абавязкі простых салдатаў. Назіраючы за такой моладдзю, якая гатавала сабе ў катлках на пастоях ежу, карміла і паіла коней, назіраючы, як пацямнелі пад гарачым сонцам іх далікатныя твары, назіраючы шаснаццацігадовых, васемнаццацігадовых заваёўнікаў вялізнага войска, якія спалі, апранутыя ў ваеннае кавалерыйскае і адначасова элегантнае адзенне пад адкрытым небам у слякоту і непагадзь, не паверыў бы сам сабе, альбо гэта нейкі падман, пачаўшай марыць фантазіі, ці рэчаіснасць перад табой. Служыць у такім палку, які нядаўна, некалькімі днямі раней, у Райгорадзе дабіўся перамогі над расійскай пяхотай, складзенай са старых салдатаў, хто бы не палічыў гэта для сябе за гонар. Да гэтага часу захаваліся ў маёй памяці прозвішчы Качароўскага [s. 87] [illegible][76], Шчанецкіх, Станіслава, Канстанціна і Тэадора, Крымкоўскага[77], Ланчкоўскага, Бржастоўскага[78], Пяглоўскага[79], Варанецкіх[80] і шмат іншых.

Пасля таго, як запісаліся мы ў палкавы спіс і адбылі пяхотную муштру, пабег агледзець лагер. Для літоўскага паўстанца якое гэта было цудоўнае відовішча! На вялікай раўніне, як толькі магчыма было акінуць вокам, жаўцелі саламяныя [шалашы ?], старанна ў шарэнгі пабудаваныя, і дыміліся кастры ад 12 да 13 000 налічваўшага войска, і якога войска, сама перамога на іх лёс свяцілася! Радаваў таксама яшчэ стан артылерыі, якая складалася з дваццаці васьмі палявых пазіцыйных гармат і гранатнікаў. Уздымалася грудзь, напоўненая высакароднымі думамі, калі бачыў пякельныя пашчы, якія хутка павінны былі выкідваць смерць на ворагаў нашага роду! Але бедныя стомленыя і знішчаныя коні пакінулі непрыемнае ўражанне аб кавалерыі, яны болей нагадвалі сабранае апалчэнне, чым сапраўднае рэгулярнае войска. Кампенсаваў гэта смутнае відовішча бляск шматлікага [s. 88] штаба і новы, і здзіўляючы для лясных воінаў бляск [illegible] генералаў і штаб-афіцэраў, якія збіраліся хутка помсціць за гаенне Літвы!

Увёсь гэты дзень правёў найпрыемна, як бы ў зачараваным свеце. Краявіды адзін за другім паўставалі ў захапленні перад раскалыханай фантазіяй. Вяртаючыся з лагеру, зайшоў у нейкую хату, дзе ў вялікім пакоі ляжалі, сядзелі ці стаялі да двухсот віленскіх акадэмікаў па большай частцы ў сваіх мундзірах, кожны з шабляй і пісталетамі. Тут і паўсюль польскія вайскоўцы былі перамешаны з найпяшчотнейшым братэрствам. Адзін з вольных польскіх стральцоў у шэрай з зялёнымі на грудзях ладункамі венгерцы, у чырвонай з паўлінім пярэм кракаўянцы, накручваючы весела вусы, заліхвацкі спяваў.

Кастусь каханы,
З Варшавы выгнаны...[81]

а ўсе за ім паўтаралі. Ах, якім расчуллівым быў гэты хор! З неба вашы [s. 89] спевы шанаваў херувім, калі б яшчэ раз у жыцці штосьці адпаведнае мог бы пабачыць і пачуць. Яшчэ да сённяшняга дня гучыць у ілюзорным [illegible], якую ўпершыню тады пачуў, бачыцца яшчэ ў твар постаць стральца, і чыя грудзь яшчэ ўздымаецца ад успамінаў тагачаснай асалоды! Хутка выйшлі мы ўсе на суседняе гумно і некалькі сотняў акадэмікаў са школы падхарунжых практыкаваліся з карабінамі ў руках для ваенных манёўраў. Гонар нашай моладзі, гонар!

Адтуль, ахоплены цікавасцю, пабег агледзець літоўскіх Брадамант[82] і Бабелін. Мае разгарачаныя мыслі малявалі чароўны вобраз ахвяры і адвагі з боку асобаў прыгожага полу. Быў блізкім да экстазу. Аднак, пасля таго як убачыў пані Платэр[83] і яе сяброўку, прозвішча якой запамятаў, уся чароўнасць растала як сон ці міраж. Як жа, аглядаючы маладых паненак, апранутых у сурдуты, [illegible] ледзь да паловы бядра, у шапкі, у панталоны, у боцікі са шпорамі [s. 90], з шаблямі, з астрыжанымі па-мужчынску валасамі, разважаць аб жаночай прыгажосці, аб выкраўшых і здрадзіўшых мужчынскаму ўбранню, [illegible] косамі праходжваючыхся пад ручку амазонкамі, апружанымі [illegible]

францамі, не ведаю, што аб іх судзіць. Ці паважаць іх самаахвярнасць, якая была бы больш карыснай і прыстойнай у справе назірання за паранеными і хворымі, ці смяяцца з гэтых непрыгожых жанчын і святасці, раструбленых у французскіх газетах начлегаў?

[11 чэрвеня]. Назаўтра Дэмбінскі са сваім корпусам, да якога належалі і мы, і які складаўся з двух палкоў пяхоты, палку познаньскай і плоцкай конніц, двух эскадронаў уланаў, 3-га палка, часткі вількамірскіх паўстанцаў, маючы 4 гарматы і ўвогуле налічваў ад чатырох да 5 тыс. людзей, рушыў на тракт, прадвігаючыся праз Янаў, Шырвінты над Віліяю. Барткевіч, а таксама Брахоцкі і Радзішэўскі, якія ўвайшлі ў склад галоўнага корпуса [s. 91] Гелгуда ці Хлапоўскага, адправіліся другім бокам на Панарскія горы. Усюды па дарозе траплялі мы на знішчаныя і пакінутыя карчмы, парушаныя масты, сляды партызанскай вайны расцягнуліся аж да самых муроў Вільна. Пад час нашага паходу аж да самага гораду сустракаліся нам усюды жанчыны, якія частавалі нас, дзе бы мы не прыпыняліся, і слухалі са слязамі на вачах нашы патрыятычныя песні, якія мы спявалі ім, уваходзячы ў кожнае мястэчка. Усюды радасна гучала забытая больш чым за 20 гадоў песня «Яшчэ Польшча не згінула».

[15 чэрвеня]. Пасля паходу, які працягваўся некалькі дзён, прыпыніліся мы ў вечары 15 чэрвеня на адлегласці паўтары мілі ад Вільна. [16 чэрв[еня]. Назаўтра, калі было вызначана агульнае з усіх бакоў наступленне, рушылі мы раніцай, а чацвёртай гадзіне, на разведку. Супраць нашых нязначных сіл збіралася выступіць да 10 000 маскалёў з 12 гарматамі. [s. 92] Праз чатыры ці пяць гадзін бітвы, калі маскалі пачалі акружаць нас перавышаючымі сіламі, мы адступілі, страціўшы некалькі параненых і забітых, і, магчыма, некалькі было захоплена ў палон. Толькі Эйсмант з атрадам у 30 ці 40 стральцоў літоўскага паўстання, які быў захоплены эскадронам непрыяцельскай конніцы, быў сам паранены, а людзі яго забіты, паранены, палонены ці разбегліся па вёсках. Некаторыя з іх паасобку вярталіся да войска.

Адступленне з-пад муроў Вільны, галоўным чынам з-за таго, што не пачулі мы ніякіх выстралаў з другога боку горада, нямала ўсіх засмуціла. Накіраваліся мы ў Мейшаголу без усялякіх навін і загадаў ад Гелгуда, да якога з нашага палка Дэмбінскім быў накіраваны Каржанеўскі[84], лецін, які на працягу трох дзён не атрымліваў адказу. Гелгуд наўмысна затрымаў яго, [s. 93] знаходзячыся тады на адлегласці некалькіх міль з другога боку Вільна, каб устрывожыць, падакучыць, а, магчыма, і пакрыўдзіць Дэмбінскага, з якім заўсёды быў у дрэнных адносінах.

У такім стане, не атрымліваючы ніякіх загадаў з боку вышэйшых уладаў увесь час змянялі мы наша размяшчэнне, то набліжаліся, то адступалі ад гасцінца, то набліжаючыся да Немянчына – повага Вільна, у адпаведнасці з атрыманым тры дні назад загадам Гелгуда. [19 чэрвеня]. Аднак, калі яго атака на Вільна 19 чэрвеня не атрымалася, выслаў да Дэмбінскага ганца, загадаўшы, каб мы адступалі да Вількаміра і там арганізоўвалі далучыўшыхся да нас, і тых, хто прыбудзе добраахвотна ці ў якасці кантанiестаў адпаведна раскладу, вызначанаму паўстанцамі.

У Вількаміры знаходзіліся мы каля дзесяці дзён, выкарыстоўваючы час для муштры і забеспячэння абмундзіравання для навабранцаў. Былі заклiканы жыхары Вількамірскага павету і праведзена агульная парада. Але усё [s. 94] адбывалася досыць абыякава і не актыўна, не бачылі мы з гэтага часу натоўпаў паўстанцаў, якія б цягнуліся пад нашы харугвы, а загаданыя нормы пастаўкі кантанiестаў і падаткаў паступалі марудліва. Настолькі няўдалая здача Вільна і раскінутае адступленне пачалі паралізоўваць Літву. Надзвычай мала з'яўлялася грамадзян і акрамя некаторых дзе-нідзе адбываўшыхся забаў, усюды было нудна і змрочна.

Карыстаючыся часовым прыпынкам у знаёмых мясцінах, узялі мы з Бржастоўскім на некалькі дзён адпачынак і накіраваліся ў Рогава да Страшэвіч. Якім падаваўся прыемным пасля працяглых ваенных цяжкасцяў і нягод часовы адпачынак у доме сваякоў. Як жа я фанабэрыўся, апрануты ў мундзір простага улана-салдата! Я, які ніколі не быў прыхільнікам вайсковасці!

На дзесяты дзень нашага побыту ў Вількаміры нечакана пачалася трывога: казацтва і некалькі эскадронаў маскоўскай конніцы нечакана прыблізіліся пад самае мястэчка. Мы паўскоквалі як хутчэй [s. 95] на коней, зрабілі некалькі стрэлаў з нашай пазіцыйнай зброі і рассеялі з немалай стратай нахабна наступаючую Маскву. Аднак атрымалі мы надзейныя паведамленні, што непрыяцель са значнай сілай спешна падыходзіць да нас. Пасля кароткага адпачынку выйшлі мы да Паняважа. Пераначавалі спакойна, а назаўтра, калі а пятай гадзіне ранку пачулі выстралы варты, усе сталі ў ружжо і выйшлі за горад, дзе пачалася барацьба з перавышаючай сілай непрыяцеля, а дакладней, артылерыяй. Пасля некалькіх гадзін бітвы пакінулі мы Паняваж, не перастаючы аж да самага вечара уступаць у сутычкі з непрыяцелем. У гэты дзень страцілі мы каля трохсот чалавек паранёнымі і забітымі, непрыяцель страціў болей чым у два разы, як нам аб гэтым падчас паўторнага знаходжання ў Панявежы паведамілі мяшчане. Назаўтра цэлы дзень прастаялі мы ў ваколіцы, [s. 96] расцягнуўшыся на паўтары мілі да Панявежа. Нашы патрулі перастрэльваліся з непрыяцелем, але ён не адважыўся ў гэты дзень атакаваць нас. [Ліпень]. К вечару ж, атрымаўшы загад ад Гелгуда, выйшлі мы спешным маршам пад Шаўлі.

Маскоўскі палкоўнік Крюг з войскам, якое налічвала ад 5 да 6 тыс. чалавек і з 6 гарматамі акапаўся ў мястэчку. Корпус Дэмбінскага, які вечарам прыблізіўся да самых Шаўлей, заняўся рэкагнасцыроўкай, да позняй ночы стралялі толькі паляўнічыя[85]. А пасля таго, як з другога боку падышоў Гелгуд да Крюга быў высланы парламентарый, каб ён здаваўся. Аднак ён адказаў, што будзе да апошняга змагацца нават супраць перавышаючай нашай сілы. Як толькі развіднелася, пачалася кананада. Бітва працягвалася да адной гадзіны па паўдні, у [illegible] якой Дэмбінскі страціў каля [s. 97] 400 людзей забітымі і паранёнымі. Гелгуд [illegible] болей, і ў колькасці каля 20 тысяч чалавек, з 28 гарматамі пакінулі мы [illegible] быты важны пункт у Жмудзі, дзе засталіся вялікія запасы амуніцыі, [illegible] чынала ўжо не хапаць. Пасля адступлення ад Шаўляў павінны былі накіроўвацца мы ў Цельшаўскі павет ці ў хутка вызначанае ваеннай радай месца

Усё наша войска павінна было сабрацца ў Куршанах, якія знаходзіліся на адлегласці 4 міль ад Шаўлей. У найвялікшай хаатычнасці сцягнуліся мы ў вечары [да вызначанага месца], другі такі прыклад хіба толькі Беразіна бачыла[86].

На начной радзе праект Гелгуда, устрывожанага тым, якімі вялікімі сіламі непрыяцель акружаў нас з усіх бакоў, аб складанні зброі ў Прусіі і правядзенні пасля адпраўкі ў Польшчу кавалерыі (на божае наканаванне) і закапання гармат партызанскай вайны, быў з абурэннем адхілены. [s. 98] І калі Гелгуд часткова добраахвотна, а часткова з-за недаверу і дакору вымушаны быў адмовіцца ад вышэйшай улады, войска падзялілася на тры корпусы: Хлапоўскага, на якім з гэтага часу валачыўся Гелгуд, Роланда[87] і Дэмбінскага. Лёс першых, як усім вядома, быў хутка вырашаны. Дэмбінскі ж накіраваўся ў паўднёвую частку Літвы.

[11 ліпеня]. Па дарозе захоплівалі мы невялікія непрыяцельскія часці і карысталіся іх амуніцыяй і грашамі, тым, у чым мы пачыналі ўжо адчуваць неабходнасць. Так, у Мешкуцях, малым мястэчку, захапілі мы роту маскоўскай пяхоты, якую спраўнік[88] Вульф, курляндскага паходжання, на момант, калі капітан ужо збіраўся здацца, заклікаў да дзёрзкай абароны. Яшчэ незадоўга перад гэтым ён задумваў узняць у Літве контррэвалюцыю і праводзіць на чале бурлакоў і іншых добраахвотнікаў малую вайну супраць літоўскіх паўстанцаў. Захопліваючы непрыяцеля ў драўляным [s. 99] касцёле, абнесеным мураваным парканам, страцілі мы сем чалавек з пяхоты і афіцэра Камінскага. З нашага палку быў адзіны паранены, які без усялякай неабходнасці быў накіраваны ў атаку з трапіў пад агонь, што вёўся з карабінаў з касцёльнага паддашку. Непрыяцель страціў каля дваццаці чалавек забітымі і трыма выстраламі быў паранены капітан, астатнія здаліся ў палон. Нам дастаўся значны запас патронаў для карабінаў і паўтары сотні зброі, а таксама трохі грошаў.

[13 ліпеня]. Далей, прасоўваючыся ў накірунку Панявежа, захапілі мы ў самым мястэчку эскадрон гусараў. Уперад выступіла лёгкая конніца, а закончылі ўсё познаньскія эскадроны. Мы страцілі два чалавекі паранeнымі, у непрыяцеля было некалькі параненых і забітых, а таксама захапілі мы больш за 60 чалавек і коней, у сувязі з чым наша конніца, якая мела амаль знішчаных коней, трошкі палепшыла свой стан. Астатнія з гусарскага эскадрона разбегліся.

Пераначаваўшы ў Панявежы, назаўтра рана выйшлі мы далейшай дарогай на Каварск і Пеняны. [s. 100] Фелікс Сясіцкі, іх дзедзіч, ветліва прыняў нас і запрасіў усіх афіцэраў на снеданне і раскошны абед. Падыйшоўшае хутка да нашага ар'ергарда казацтва так напалохала беднага гаспадара, што ён, не чакаючы пакуль мы пакінем яго, як хутчэй уцёк у лес, не дбаючы нават пра сабраўшуюся на наша спатканне шматлікую колькасць жанчын.

Калі мы ў далейшым нашым паходзе пры сталым праследаванні казакаў спакойна і не ведаючы ні аб чым [16 ліпеня] днёвкай каля Аванты адпачывалі, чакаючы заканчэння пазнейшай спёкі, прадстаўлены значнай сілай непрыяцель пажадаў нас акружыць і нечакана хутка падсунуў свае фарпосты. Мы ледзь паспелі ўскочыць на коней, калі незаўважна выкацілася з зараснікаў лёгкая гармата і прывітала нас картеччу, аднак, дзякуючы расійскім артылерыстам, без усякай для нас перашкоды. Неўзабаве разгорнутыя пераважаючыя па колькасці непрыяцельскія калоны вымусілі нас ухіліцца ад рашаючай бітвы, галоўным чынам з-за таго, што ў нас налічвалася ўсяго ледзь 4 тыс. снарадаў для гармат [s. 101]. У другой гадзіне па паўдні безупынна праследуемыя непрыяцелем адступілі мы тады, захоўваючы парадак, з Аванты да Малят. У прыцемках мы ўжо пакінулі Маляты. І нягледзячы на шматлікія гарматныя стрэлы, гранаты і кулі, накіраваныя ўздоўж нашых адступаючых шарэнгаў, дайшлі мы да бору без стратаў. А непрыяцель не пасмеў нас атакаваць позняй ноччу. Увогуле нашы страты ў гэты дзень былі надзвычай малымі і амаль нязначнымі.

Выкарыстоўваючы начны час, спешным маршам накіраваліся мы на Інтурк, дзе знаходзіліся наперадзе. Пасля таго, як усе нашы сілы перайшлі праз возера, мы спалілі мост і сталі зараз адчуваць сябе спакойна, [illegible] нашым адыходам непрыяцеля. Распалажэнне мясцовасці [?] спрыяла нашаму адступленню. Возера, якое ўздоўж расцягнулася амаль на мілю, было ў цэлым не шырокім. З абодвух бакоў возера знаходзіліся далёка распрасцёртыя недаступныя балоты, [s. 102] у той час, як супрацьлеглыя берагі – перад мостам і за ім – былі зусім сухімі. Пасля таго як быў разбураны мост, каб непрыяцель, калі б пажадаў гнацца за намі, быў вымушаны цягнуцца па-за возерам ад 5 да 6 міль, дзякуючы такому адступленню выйгралі мы ноч і цэлы дзень паходу.

[17 ліпеня]. Пасля такога пахвальнага адступлення і захавання корпуса назаўтра нечакана напалі мы ў Падбродзі на непрыяцеля і захапілі цэлы эскадрон уланаў і роту пяхоты. Наш полк уварваўся галопам у мястэчка праз хісткі мост. Першы эскадрон закрыў дарогу непрыяцелю на выпадак, калі той пажадаў бы адступіць на Немянчын, а другі, пасля некалькіх стрэлаў і страце двух чалавек, захапіў усіх у палон. Тут зноў знайшлі мы коней, зброю, амуніцыю і, асабліва, грошы. Сярод двух забітых з нашага палка быў Страшэвіч, з Упіцкага павета.

Пасля атрымання коней і прыпасаў, што ўзмацніла нашы [illegible] сілы, рушылі мы [s. 103] спешна ў гэтай жа самай хвіліне ў далейшую дарогу, мяркуючы як хутчэй Вільна, дзе мы маглі, як заўсёды, сутыкнуцца са значнай сілай непрыяцеля. Тым часам некалькі маскоўскіх салдатаў здолела пад час сутычкі схавацца ў лесе і прабрацца да Немянчына, дзе знаходзіліся 4 непрыяцельскія гарматы. Адразу пасля атрымання навіны аб тым, што ў Падбродзі намі захоплены гарнізон, артылерыя спешна ўцякла ў Вільна і падняла трывогу, бо непрыяцель не мог так хутка сарыентавацца, адкуль і якія польскія сілы маглі знаходзіцца так блізка ад Вільна.

Накіраваўшыся тады да Смаргоні, недалёка ад якой збіраліся мы пераправіцца праз Вілію, прыпыніліся на некалькі дзён для адпачынку ў [illegible]

Эмісарства[89]

[18 ліпеня]. Драмаў я стомлены пад вясковым плотам, абапёршыся галавой на уланскі шышак. Глухі гук ад колаў артылерыі, што каціліся па мяккаму грунту каля мяне, абудзіў мяне ад трывожнага сну [s. 104] На галову адкрытым вокам назіраў я за перасоўваннем гармат і глядзеў на суровыя постаці нашых артылерыстаў. І зноў задрамаў, і зноў быў абуджаны і назіраў на праходзіўшую рэзва пяхоту – гэта быў цвет жвавых хлопцаў Польшчы, не замардаваных цяжкасцямі і супярэчнасцямі. І зноў я драмаў, і зноў абуджаны – марыў. Калі вызвалі мяне да Дэмбінскага, я сарваўся і пабег. Знайшоў я паважанага камандуючага сідзячым на парозе гумна над картай, тут жа каля яго, расцягнуўшыся на зямлі, спалі стомленыя ад'ютанты. Ён, апусціўшы галаву, глядзеў на карту, а каля яго, апусціўшыся на адно калена на гэтае ж месца глядзеў падафіцэр з артылерыі (затым так знаёмы мне па эмісарскім блуканням – Панятоўскі[90]), якога той высылаў у разведку на адлегласць у некалькі міль для захопу языка, каб даведацца аб перасоўваннях непрыяцеля. Пачуўшы, што хтосьці падыходзіць, падняў галаву і з прыемным шчырым усмехам [s. 105] заклікаў мяне да выканання даручэння, аб чым мне намякаў ужо ў Паневежы і выслаў адтуль [14 ліпеня] з гэтай мэтай Канстанціна Граткоўскага[91], які таксама служыў у пазнанскім палку. Іх мэтай было прабрацца паасобку да Скшынецкага[92], які адпаведна нашаму ўяўленню павінен быў знаходзіцца паміж Беластокам і Гродна, перадаць яму пісьмовы рапарт і вусна падрабязна расказаць аб усёй жахлівасці нашага становішча, і запытацца аб далейшых загадах, папрасіўшы дапамогі калі не людзьмі, так хаця б боепрыпасамі для зброі. У выпадку, калі не застану яго ў тым месцы, на якое мы разлічвалі, павінен буду прабірацца далей аж да самай Варшавы.

Пасля ваеннага абеда пры штабе, узяўшы на дарогу 100 рублёў асігнацыямі і развітаўшыся са слязамі, як ніколі так чулліва не развітваўся з бацькам, заставіўшы на руках у сяброў каня, зброю і абмундзіраванне, пераправіўся, апрануўшыся ў драное адзенне, праз Вілію і накіраваўся проста ў Міхалішкі [s. 106] да знаёмага мне яшчэ са спакойных часоў па Вільна Вінцэнта Жэброўскага. Я застаў яго на лугавіне з касцамі. Ён быў вельмі здзіўлены, калі пазнаў мяне, а пасля таго, як даведаўся аб усіх падрабязнасцях, забяспечыў прыемны начлег, а потым адаслаў мяне на сваіх конях да свайго знаёмага Івашкевіча, які жыў на адлегласці паўтары міль ад Гудзенцкаў і павінен быў у далейшым дапамагчы мне і даць неабходныя інструкцыі.

Якім жа мілым пасля ваеннага шуму сярод няспынных няўдач падалося мне вясковае зацішша. І якім непрыемным – рамяство ваеннага! Ах, не ведаў я яшчэ да гэтага шчасця, якое паходзіла ад цішыні!

Затым было каля дваццаці міль прыемнага падарожжа праз Віленскі і Ашмянскі паветы, бо ўвесь час пераязджаў ад знаёмых да знаёмых. Так, спачатку накіраваўся да Чэрнішак Кундзічаў, адтуль да Мазурышак Людвіка Ходзькі, а таксама да Медніку Януша Козела, адкуль перабраўся праз Каменны Лог, [s. 107] дзе чаркесы пільнавалі паштовую станцыю, а пак на шчасце ў гэтай хвіліне там не было ні воднага з іх, да Табарышак Важынскага, адкуль я [illegible]. З гэтага месца накіраваўся да Антонава, што належала падкаморыю Варжыцкаму, які адаслаў мяне да Сакалоўшчыны Гжоўскага, а адтуль да Больцінік Путкамера[93], што знаходзіліся ўжо ў Гродзенскай губерні.

[20 ліпеня]. Ехаў позняй ноччу, ясна свяціў месяц, які калі-нікалі праглядваў праз цёмныя хмаркі, я ж набліжаўся да месца, дзе жыла Марыя, – каханая нашага першага паэта... На чарзе прыходзілі на думку вершы:

«На доле туман, а месяц высока,
Кружыць сярод разводдзя чорных хмар,
Імгле не ўсё ён вока паказаў».

альбо:

«Жанчына, марная пушынка!»

І ў гэтых марах закацілася мая брычка з грукатам на ганак.

Сядзела няверная Марыя (?). Каля яе сядзеў муж, самотны і маўклівы..., не бачыў на іх тварах весялосці... Прынялі мяне найветлівей... Не ведаў адтуль бессмяротнай рыфмы пакінутага каханка [s. 108] Марыі, углядаўся ў яе пільна. Стан зграбны, але маладосць ужо прайшла, рысы твару па-сапраўднаму польскія, мала прыемныя..., вочы блакітнага колеру, але поўныя адлюстраваннем меланхалічнай чуллівай душы. Не дзіва, што іх позірку павінны мы «Дзядам», «Свіцязянцы» і «[Конраду] Валянроду»...[94] Ах, такія ж самыя вочы, і з такім жа самым выразам... Ну, што нам далей казаць?..

Назаўтра, з самай раніцы былі пададзены да ганку коні, і я, як хутчэй сарваўся і накіраваўся на Эйшышкі, Радунь, у плябанію паважанага патрыёта к[сёндза] Мацяёўскага, па Забалоць Вансовіча, да ветлівых жыхароў і руплівых патрыётаў Піруcкіх, якія даставілі мяне аж да вёскі Друзеніка, размешчанай над самай ракой Нёман.

[24 ліпеня]. У гэтай вёсцы перавезлі мяне сяляне праз Нёман і правезлі некалькі міль позняй ноччу да маёнтка Віктарын, размешчанага ў Аўгустоўскім ваяводстве, уласнасці памешчыка Хомскага. Прывітанне, зямля герояў, прывітанне, краіна свабоды, прадстаўляў сабе, што ўжо тваё [s. 109] вольнае паветра ўдыхаю! І вас таксама ніколі не запамятую, бедных, аднак шчырых літоўскіх сялян, з якой расчуллівасцю вы са мной развітваліся, з якой чуллівасцю падавалі мне рукі, блаславілі і жадалі мне шчаслівага далейшага падарожжа! Хто ж у вашы простыя сэрцы ўліў такое чыстае полымя нацыянальнай свядомасці? О! Прыйдзе да вас бяда, тыраны, што з такой упартасцю абражаеце людскія пачуцці!

Адтуль паехаў на Ясціэмну Любавіцкіх, Яцвезь Ганеўскага, Дэмбаў Андрацкага, адкуль мяне па чарзе стральцы правадзілі пеша праз недаступныя балоты да вёскі Капіцы.

[27 ліпеня]. Не даходзячы яшчэ да вёскі, пачуў узмоцненыя стрэлы ручной зброі, якія станавіліся што раз бліжэй. Праваднікі, спалохаўшыся, пераапрануліся як хутчэй у сялянскія світкі і скрыліся ў вёсцы. Значна змяркалася, па вёсцы

хадзілі па некалькі чалавек з ліку разбітых нашых салдатаў, хутка надыйшоў і сам кіраўнік, палкоўнік Пушэт[95] з дзесяткам застаўшыхся салдат. Ён быў разгромлены, як [s. 110] паведаміў мне, перавышаючай непрыяцельскай сілай пад Белагрудай. З двухсот ці трохсот чалавек у яго засталося ледзь грыццаць. У сваім адступленні праз балоты страцілі яны ўсіх коней. Самога Пушэта з-за празмернай паўнаты, не здольнага брысці шпарка праз балоты, салдаты валаклі пад рукі. Напэўна, варты быў ён у такім стане спачування, але я знайшоў у гэтым, супраць уласнага жадання, штосьці камічнае. Грузны карміцель, абваляны ў балоце, які страціў з перапуду пісталеты, гадзіннік і ўсё, што было пры ім, і няспынна нагадваў аб сваіх геройскіх учынках, як з самага пачатку вайны, маючы толькі каля двухсот чалавек, супрацьстаяў дзесяткам тысяч маскалёў. Правільна ці няправільна, аднак я ўсміхаўся ў душы над гэтай буфанадай; развітаўся з палкоўнікам, які выбіраўся шукаць прытулак, перабраўшыся праз балоты, у Дэмбаве.

Адтуль пайшоў пеша праз лес на Волькі і Цемнацкі, дзе павінны былі знаходзіцца [s. 111] казакі. Вёскі было яшчэ не бачна, бо яе засланяў густы бор, але ж знаходзіліся мы дзесьці блізка каля яе, бо чулася брахание сабак і крык цемнашыйскіх гусей. Мой праваднік быў спалоханы яшчэ болей, чым я. Ён няспынна азіраўся і выходзіў наперад на разведку, пакідаючы мяне ў кустах за некалькі крокаў ад сябе. Нарэшце шчасліва мінавалі мы жахлівы прамежак. У Клімашэўніцы наняў коней да мястэчка Ядвабнае, адкуль мяне шчыры солтыс[96] з бліжэйшай вёсцы на канях, як свайго парабка, праводзіў да Драздова, які баяўся ехаць возам з-за таго, што ў гэтых мясцінах снавалі маскоўскія салдаты. Па дарозе спаткаўся з некалькімі дзесяткамі ваенных, апранутых у мундзіры корпуса Хлапоўскага, якія з-пад прускіх межаў прабіраліся ў Варшаву.

З Драздова, дзе спаткаў каля дваццаці маскоўскіх уланаў, якія суправаджалі з пашы да Ломжы каля двесці коней, адвёз мяне Лявінскі да свайго суседа [s. 112] Ракоўскага, жыўшага ў Ракаве, дзе я перапраўіўся праз Нараў.

[28 ліпеня]. Перапраўіўшыся праз раку і не знайшоўшы ў доме Гадлеўскага (?), быў я прадастаўлены сам сабе без усялякай дапамогі. У Пнёва плябан прыняў мяне досыць халодна і абыякава, як і ўсё астатняе святарства ў Каралеўстве Польскім. Што за розніца ў параўнанні з літоўскім святарствам! Сустракаючыся яшчэ некалькі разоў з асабнымі маскоўскімі салдатамі, якія снавалі па дарозе, на гарнізонах, знаходзіліся ў маёнтках, дайшоў да вёскі Пухалы. Тут напрасіў возці праваднікa, аднак лютаваўшая тут халера да канца пазбавіла жыхароў чалавечнасці і патрыятычных пачуццяў, суседства смерці зрабіла іх настолькі нечулівымі, што яны нават не пажадалі мяне слухаць. Пасля доўгіх намаганняў і спроб наняў для далейшай дарогі праваднікa, аднак і Вяржбіцкі ў Козіках, ад якога спадзяваўся атрымаць дапамогу, размяшчаў [s. 113] у сваім доме маскоўскую каманду, таму здзіўлены маім з'яўленнем, пажадаў як хутчэй ад мяне пазбавіцца, даўшы мне з гэтай мэты, як палічыў, некалькі злотых на дарогу. Адмовіўшыся ад яго ўбогага падарунку, з найвялікшым абурэннем і пакорлівасцю мучаніка, стомлены доўгай цяжкай дарогай, накіраваўся да бліжэйшай вёскі, дзе, адпачыўшы і

паняўшы коней да Люботыні Язерскага, вымушаны быў чакаць да вечара, каб мяне не схапілі шматлікія маскоўскія каманды, якія знаходзіліся ў гэтых месцах. Прыпыніўся я ў солтыса, які мяне, прамоклага за цэлы дажджлівы дзень да ніткі, схаваў ад прыходзіўшых да яго ў госці маскалёў у невялікім пакойчыку. З вялікім хваляваннем чакаў вечара. Як толькі сцямнела, пасхаў далей і назаўтра [31 ліпеня] дабраўся да Кельчава Півонскага, дзе вечарам перапраўіўся праз Буг.

З гэтага месца накіраваўся да мястэчка Ядава, якое знаходзілася на адлегласці толькі 6 міль ад Варшавы. Там, калі ў гандлёвы дзень не мог знайсці ні солтыса, ні нават пры дапамозе маёра Грыневіча, якому адкрыўся, [s. 114] не мог дастаць коней; у такім становішчы чакалі мы павозку. У гэты момант пад'ехала братавая Грыневіча, якая па рэкамендацыі брата забрала мяне, апранутага па-сялянску, да сваёй павозкі і адвезла ў Варшаву. Яе муж, сумленны і светлы чалавек, які служыў у французскім войску ў вайне 1812–1814 гг., не мог нарадавацца, убачыўшы так добра настроенага, як мне ён стала апавядаў, ліцвіна. Усюды мяне вазіў, знаёміў і паказваў варшаўскія цікавасці, шмат у чым з любоўю пагляду карыстаўся бы яго знаёмствам і сяброўствам, калі б праз некалькі дзён ён не стаў ахвярай пануючай халеры.

[2 жніўня]. Раніцай 2 жніўня, прыбыўшы ў Варшаву і зарэгістраваўшыся на Празе ў мясцовых уладаў, яшчэ пакрыты пылам, з зарослымі валасамі і барадой, увесь потны ад спёкі, у сялянскім адзенні пайшоў за Скшынецкага. Ён жыў тады ў палацы Тарноўскіх. Застаў яго за размовай з жонкай. [s. 115] не прыгожай, але прыемнай і прывабнай жанчынай. Пасля таго, як я паведаміў яму аб мэце і спосабе майго прыезду, аддаўшы ў рукі рапарт Дэмбінскага і перадаўшы на словах аб умовах, у якіх знаходзілася Літва, ён чула ціснуў мне дłoń і распытваў, шануючы і благаслаўляючы мае ахвяры і здзейсненую працу. Затым запытаўся ў мяне, ці не адчуваю ў чым патрэбы, і калі я, падзякаваўшы яго, адказаў, што нічога не патрабую, прымусіў прыняць ад яго каля двухсот злотых, неабходных для майго новага абмундзіравання. Назаўсёды засталося ў мяне ў памяці і будзе служыць мацнейшым доказам незаплямленасці яго намераў гэты шчыры і поўны адкрытасці прыём.

Варшава
(2 жніў[ня] – 7 верас[ня])

Першым маім жаданнем, пасля таго як скінуў я з сябе сялянскую світку, было сустрэцца з Лялевелем[97], былым настаўнікам і сапраўдным бацькай віленскай моладзі. Спачатку ён не пазнаў мяне і сказаў, што я значна змяніўся. Сам ён, па праўдзе кажучы, з універсітэцкіх часоў трохі пастарэў. [s. 116] але твар яго ніколь не змяніўся, пазнаў бы яго заўсёды і ў любым месцы. Прыняў ён мяне ветліва, падарыў шэраг кніжак, якія выйшлі апошнім часам і запрасіў часцей да яго наведвацца, што я на працягу свайго побыту ў Варшаве выконваў з вялікай [illegible] Калі я ўжо справіў сябе новае абмундзіраванне і ехаў аднойчы да яго на Грыбаў.

пачуў, як нехта паклікаў мяне па імені. Я азірнуўся і ўбачыў вайскоўца, апранутага ў кароткі, цёмна-сіняга колеру без пагонаў кунтуш і малінавую, з белым пяром ад чаплі і срэбранай пагоняй спераду канфедэратку[99]. Закручаныя і буйныя вусы аздаблялі яго сапраўдны старапольскі твар. Ён бяжаў да мяне, але я ніяк не мог яго ўзгадаць. Нарэшце, калі ён усміхнуўся і пачаў са мной размаўляць, я пазнаў яго – гэта быў Валяр'ян[100]!.. Атварыўшы як хутчэй дзверцы ў брычцы, уселіся мы разам і пачалі абдымацца і цалавацца без перапынку. Ад расчуленасці з вачэй паплылі слёзы. Ад красавіка не бачылі мы абодва, ці жывы яшчэ… Літва, Вільня, і ўсё мінулае ў найжывейшым святле, як бы [s. 117] ў якім чароўным люстэрку, паўстала перада мной. Прахожыя прыпыняліся, звяртаючы ўвагу на такую чулліваю і брацкую нашу сустрэчу… Затым разам паехалі мы да Лялевеля[101].

Зараз звернем сваю ўвагу на агульныя ўчынкі.

Калі я 2 жніўня прыбыў у Варшаву, Дэмбінскі са сваім корпусам таксама набліжаўся да сталіцы і назаўтра ў вечары каля восьмай гадзіны ўехаў сюды са штабам. Гэта было відовішча, якое бачыць рэдка здараецца! Пасля здрады ці непаваротлівасці Гелгуда, Хлапоўскага і Роланда, вяртаўся са страчанай Літвы з горсткай змучанага войска і літоўскіх паўстанцаў адзін толькі генерал, які памятаў аб нацыянальнай славе і абавязках паляка. Не выглядала гэта як трыумфальны ўваход, хутчэй паўставаў вобраз беззаганнай і нязломнай ніякімі супярэчнасцямі цнатлівасці. На змучаных конях, пакрытыя пылам і потам, з пачарнеўшымі ад пораху эпалетамі, уехалі адважныя [змагары] са сваім Дэмбінскім сярод тысячных радасных воклічаў ура ў горад. Жанчыны ў прыгожых экіпажах выехалі для сустрэчы героя. Просты народ, які сцякаўся адусюль тоўпамі, трымаючы [s. 118] каня за лейцы, распытваў адважнага і цнатлівага генерала аб літоўскай кампаніі. Чарнелі рог шапак, якія бравурна падкідвалі ў гару, і бесперапынна гучалі па ўсіх вуліцах выгукі радасці! Простыя людзі, якіх збіралася ўсё болей, схапілі ў запале пілотку рыцара і, нарваўшы, падзялілі яе на тысячы рэліквій!... Сярод такой радаснай, патрыятычнай і расчуленай працэсіі ехаў [Дэмбінскі] са сваім штабам да палаца Намесніка, дзе яго спаткаў і прывітаў у поўным складзе Нацыянальны ўрад.

Назаўтра не менш прыгожым і хвалюючым было відовішча ў Нацыянальным тэатры, відовішча, якое можна знайсці хіба толькі ў цудоўнай старажытнай гісторыі! Пасля таго, як адыграла музыка і праспявалі патрыятычную песню «Устань, белы арол, устань», на сцэну выйшаў у мундзіры нацыянальнай гвардыі акцёр Пясецкі і прадэкламаваў верш у славу бліскучага вяртання Дэмбінскага. Сцены трасліся ад радасных вокрыкаў, а сярод апладысментаў [s. 119] чуліся неадназовыя патрабаванні аб паўтарэнні. Пасля заканчэння дэкламацыі тэатр зноў загрымеў ад крыкаў усіх сабраўшыхся: «Няхай жыве Дэмбінскі!» і воклічы гучалі без перапынку. Шаноўны генерал устаў са свайго месца ў ложы і з выразам сапраўднай шчырай удзячнасці сказаў: «Не заслужыў я ад народу столькі знакаў павагі. Выконваў я толькі тое, што мне загадвалі абавязак і гонар. Лепей бы гэтая ўдзячнасць суайчыннікаў, якая аказана сёння мне, была бы стымулам для маладзейшых ніколі не адхіляцца са шляху абавязкаў на карысць краіны і кіравала бы

іх крокамі! Я, паўтараю: выконваў толькі свае абавязкі і нічога, акрамя гэтага, не зрабіў». Пасля гэтага зноў пачаліся працяжлівыя вокрыкі: «Няхай жыве Дэмбінскі! Няхай жыве!». Затым сход разышоўся[102].

З прыходам у Варшаву корпуса Дэмбінскага ў сталіцы непамерна павялічылася колькасць ліцвінаў. Пасля таго, як Нацыянальнаму ўраду была скіравана нота, заняліся адборам літоўскіх паслоў на сейм. Наколькі магу ўзгадаць, з ваяводства Віленскага [было абрана] шэсць, з Мінскага столькі ж, з Гродзенскага – чатыры, і з Бярастоцкага – тры[103]. [s. 120] Пасяджэнні сеймікаў адбываліся ў зале ратушы. На першае [пасяджэнне] прыбыў кн[язь] Адам Чартарыскі[104] і прапанаваў выбіраць пасэсіянатаў[105] разам. Гэтай сваёй прапановай ён выказаў супярэчлівае меркаванне, тлумачачы, што з даўніх часоў неабходнай і належнай умовай, каб стаць паслом, лічылася наяўнасць зямельнай уласнасці. Аднак у такіх абставінах, у якіх [?] знаходзіліся зараз мы, не меўшыя ніякіх кантактаў з захопленай непрыяцелем Літвой, не магчыма было даказаць такой прыналежнасці. І ў такім стане прапанова князя была толькі пустой формай, недасягальнай і не здольнай нават дасягнуць сваёй мэты. Больш адпаведным было бы звяртанне ўвагі на ўчынкі і настрой кандыдатаў, чым на наяўнасць пасэсіі, чаго мы ніякім спосабам нікому ні прызнаць ні адмовіць былі не ў стане. Аднак паслы, якім надакучыла ўжо вайсковая служба, імкнуліся да значнасці і бляску, яны сабраліся некалькіх небяспечных паплечнікаў і аднагалосна адхілілі маю прапанову.

Склалі тады спіс кандыдатаў на паслоў…

[s. 125]…смейцеся болей з вашай ролі. Здрада толькі абразіла мяне. І вы вольныя ад усялякіх сурьёзных папрокаў, паколькі вас толькі ў насмешку можна звязваць са зброяй, а болей з пагардай.

З валынскіх паслоў найбольш заслужаную рэпутацыю служна заваявалі Накваскі[106] з Брацлаўскага і Ялавіцкі[107] з Гайсенскага [паветаў]. Ксаверый Гадзебскі[108], які меў гучную славу, выступаў свабодна і каяцісты, чым, можна пазначыць, натоўп публікі ўразіў, але негрунтоўнай, незразумелай і незвычайна доўга расцягнутай прамовай стаміў.

Пасля абрання паслоў для актывізацыі іх дзейнасці заснавалі пад старшынствам генерала Несялоўскага[109] Літоўскі камітэт, што таксама было зацверджана Нацыянальным урадам. Членамі яго з'яўляліся: Валяр'ян Пяткевіч, Леан Патоцкі[110], Ян Граткоўскі[111], Юзаф Кашыц[112], Караль Нямцэвіч[113], пазней Вінцэнт Барткевіч і я, як выконваўца абавязкаў сакратара, заўсёды з захаваннем рашаючага голасу. Асновай дзейнасці гэтага Камітэта была: 1. Падтрымка цесных кантактаў з Літвой і высылка туды эмісараў. 2. Падтрымка непарыўных сувязей [s. 126] з Валынскім камітэтам, ці, па-іншаму, Камітэтам рускіх зямель[114], маючым агульныя інтарэсы з Літвой. 3. Разнастайная дапамога і ахова прыбываючым ці тым, хто яшчэ прыбудзе ў Каралеўства ліцвінам. Увогуле гэта былі асноўныя палажэнні ў дзейнасці Камітэта, якія згодна з апрацаваннямі і абставінамі маглі быць выкарыстаны на карысць злучаных правінцый (Падрабязнае пералічэнне ўмоваў дзейнасці Літ[оўскага] кам[ітэта] разам з высвятленнем прычын яго заснавання

было змешчана ў выданнях «Уссагульны дзённік» і «Сумленны паляк» за жнівень 1831 г.[115]). Спачатку пасяджэнні адбываліся штодзённа з раніцы ў зале ратушы, затым, з-за нязручнасці месца і сталых перашкодаў, яны былі перанесены ў Новы свет[116] да старшыні Несялоўскага.

Неўзабаве Камітэт рускіх зямель, зыходзячы з агульнасці сваёй працы з нашай, запрасіў нас на сумеснае пасяджэнне ў замку, дзе папярэдне яму было вызначана месца для дзейнасці. Мэтай гэтага запрашэння было з'яднанне абодвух камітэтаў па агульных справах, якія тычыліся адарваных ад Польшчы правінцый, пакідаючы вырашаць эканамічныя пытанні, дапамогу нова прыбыўшым [s. 127] да Польшчы ліцвінам і валынянам, фінансавую дапамогу ці прадстаўленне ў чын і палёгку ў любым пытанні, асобна кожнаму камітэту.

У сувязі з тым, што ў арганізацыі абодвух камітэтаў назіралася пэўная розніца, для таго, каб пазбегнуць з-за гэтага ў далейшым непаразуменняў, пастанавілі скласці ўмовы для нашага з'яднання. Урэшце, для напісання гэтых палажэнняў з Рускага кам[ітэту] былі вызначаны Ксаверый Саббатын[117] і Ксаверый Гадзебскі, а з Літоўскага Валяр'ян Пяткевіч і я. Наша сумесная дзейнасць пачалася пасля таго, як былі зацверджаны і падпісаны членамі Літоўскага і Валынскага камітэтаў гэтыя ўмовы, а таксама пасля іх унясення ў агульны пратакол злучаных камітэтаў. Мяне зноў запрасілі на пасаду сакратара, не пазбаўляючы таксама прэрагатывы ўласцівай для члена камітэта. Членамі Камітэту рускіх зямель былі: Міхал Радзівіл[118], Антоній Астроўскі[119], Ворцаль[120], Саббатын, Гадзебскі, Капчынскі, Ялавіцкі і іншыя. Кіравалі яны па чарзе.

Разрозненыя да гэтага часу дзеянні [s. 128] Валыні і Літвы шчасліва зліліся ў адзінае цэлае. Са справамі Літоўскага камітэта перасякаўся яшчэ Вайсковы камітэт пад старшынствам Леана Патоцкага. Ён быў упаўнаважаны генералам Дэмбінскім да выдачы характарыстык заслужаным ліцвінам і прадстаўлення іх да чыноў і ўзнагарод. Але хутка сам жа Вайсковы камітэт, убачыўшы блытаніну сваіх дзеянняў з нашымі, што больш перашкаджала, чым дапамагала, звярнуўся да нас з праектам аб'яднання і зліцця сваіх дзеянняў з нашымі. Не маглі мы адхіліць такога слушнага пажадання. І такім спосабам усе, хто займаўся справамі адарваных правінцый, аб'ядналіся ў адзінае цэлае.

[Пасля 15 жніўн[я]. Неўзабаве Іаахім Ляэевель унёс на разгляд Літоўскага камітэта прапанову, што калі ўрад мог бы выдзеліць нейкую вайсковую сілу для адраджэння літоўскага паўстання, скласці пісьмовы праект ці план, як найлепей і эфектыўней, [s. 129] з якой на колькасці сілай, дзе і калі правесці ў Літву новы паход.

Для вырашэння такога важнага пытання Літоўскі камітэт заклікаў членаў Валынскага камітэта і ўсіх паслоў адарваных правінцый на сумесную нараду, аддаўшы кіраўніцтва на сесіі, дзе павінна была ісці размова аб літоўскай экспедыцыі, Ляэвелю.

Мы спыніліся на тым, што кожны асобна да наступнай сесіі падрыхтуе пісьмовы план і падасць яго на абмеркаванне агульнага сходу. Пасля паступлення

каля дзесяці праектаў, якія ў большай ці меншай ступені супярэчылі адзін другому, Ляэевель даручыў мне адрэдагаваць іх і скласці агульныя патрабаванні[121].

Увогуле амаль усе пагаджаліся з тым, што не трэба адпраўляць у Літву малыя сілы. Падзяляліся толькі ў пытанні, ці высылаць экспедыцыю ў Жмудзь, ці ў Палессе[122]. Аднак і ў гэтым пытанні большасць была за адпраўку 20, найменш 10, тысяч войска з адпаведнай артылерыяй у Жмудзь для вядзення папярэдняй вайны, і ад трох да чатырох тысяч [s. 130] на Палессе, для правядзення супраць непрыяцеля дыверсій у выглядзе партызанскай вайны.

Несялоўскі, ад усёй душы жадаючы правесці экспедыцыю, склаў вялізны ваенны план, дзе параіў перанесці вайну на Палессе, абраўшы ў якасці апорнага пункту Давід-Гарадок[123]. Яго праект, магчыма, быў найлепшым і з большым веданнем пытання быў складзены. Па яго асабістым жаданні гэты праект быў далучаны да агульнага, адрэдагаванага без усялякіх змен, плана і ўручаны мной і Ляэвелем Крукавецкаму... Ішоў час... Адказу не было... Урэшце і Несялоўскі не садзейнічаў далейшай справе, так як рашэннем большасці галоўным камандуючым экспедыцыі ў Літву быў абраны генерал Сераkоўскі, на што, аднак, Галоўны штаб у сваім адказе, дадзеным Літоўскаму камітэту не даў згоды, азначаючы ў якасці прычыны, што згаданага генерала не магчыма адарваць з баявой лініі пад Варшавай. І ўсё сышло на нет.

[s. 131] Такім быў публічны рух, які я назіраў з блізку. Звяртаючыся да грамадства, трэба прызнацца, што такой была абыякавасць у Варшаве ў месяцы жніўні, такое змярцвенне, такім было ўсё нежывым, што складана было ўявіць сабе больш халодны вобраз сталіцы краіны, якая праводзіла такую ўпартую нацыянальную вайну супраць спрадвечнага польскаму імені непрыяцеля. Акрамя няўдалай палітычнай палемікі газетчыкаў, не было ніякага рэвалюцыйнага жыцця, ніякіх рэвалюцыйных песен, ніякіх урачыстасцяў і нацыянальных святкаванняў. Прыходзіцца з сорамам прызнаць, што вяртаючыся па заканчэнні вайны праз Прусію, болей бачыў зацікаўленасці нашай справаў у Вроцлаве, чым у жніўне ў Варшаве. Аднак набліжаўся страшэнны крызіс у вайне! Прыход Дэмбінскага і капанне акопаў прадстаўнікамі ўсіх станаў, не звяртаючы ўвагі на пол і ўзрост, было цудоўным, але адзіным выключэннем ва ўсеагульным змярцвенні. Было абвешчана аб узносе на корпус Дэмбінскага і горад, які налічваў каля двухсот тысяч жыхароў, за два тыдні здолеў сабраць ледзь 10 тыс. злотых. [s. 132] Не бракавала дэкларацый аб братах ліцвінах і жмудзінах, пакідаючых хатнія агмені дзеля агульнай справы. Спачувалі іх галечы, аднак сталіца Польшчы не здолела сабраць для іх болей і перадаць Літоўскаму камітэту праз недаверлівага Гадлеўскага для размеркавання паміж тымі, хто найболей у гэтым адчуваў патрэбу, толькі тысячу і некалькі сотняў злотых і 30 кашуль. Некалькі тысяч [воінаў] нацыянальнай гвардыі бяспечна бадзялася па гораду. Каманда ўнутранай бяспекі, якая налічвала болей чым 10 тыс. чалавек, узброеных косамі і пікамі, была занядбана і прадастаўлена лёсу. Жыхары, якія выязджалі за мяжу ці ў Кракаў, ... ацірацыі горад. Непрыяцель жа ішоў (усё?) бліжэй падсоўваўся да муроў, акс-

ка не магло нарыхтоўваць фураж каля самай сталіцы без гармат. У горадзе была непамерная дарагоўля. Так смутна выглядала Варшава ў жніўні месяцы. Ах! Ужо было відавочным канание аслабелага народа.

[s. 133] Наблізіўшыся да канца смутнай катастрофы, прамаўчаў я аб ночы 15 жніўня. ... Гэтым напоўнены публічныя выданні і друкаваныя брашуркі... Прамаўчаў я і аб высланні перад самай атакай сталіцы корпуса Рамарына[124] і адарванні ад кіраўніцтва камандай унутранай бяспекі палкоўніка Залескага[125], які быў высланы разам з некалькімі сотнямі чалавек для абароны збудаванага пад гарой маста ад дзесяцітысячнага непрыяцеля. Гэта было відавочнай здрадай і больш нічога не магу аб гэтым сказаць.

Што тычыцца мяне, то адчуваючы набліжэнне канца нашай справы, трымаўся я больш палітычнай дзейнасці, чым вайсковай, да якой ніколі не меў ні ахвоты, а таксама намера на працяглую службу, так як гэтага не дазваляў мне стан здароўя. Адхіляючыся ад вайсковых спраў і чакаючы яшчэ больш смутнага канца, прытрымаўся, што заняты выкананнем абавязкаў прадстаўніка Літоўскага камітэта, а сам сумаваў аб асабістых і стольках іншых нашых ахвярах, прынесеных марна.

[s. 134] Цяжкія хвіліны жыцця, і найжахлівы падман залатых мар і нябесных надзей, падсаладжваў сяброўствам сястры і Таміцкіх, якія нечакана апынуліся ў Варшаве: каб потым аб гэтым яшчэ болей шкадаваць, развітваючыся назаўсёды пад гук гармат, панаваўшый над усёй Варшавай.

Выхад з Варшавы

[7 <u>верасня</u>]. Пасля заходу сонца, калі ўсё рэціравала праз горад на Прагу, выйшлі мы з Людвікам Замбржыцкім[126] і Янам Граткоўскім, пазіраючы, як ад Волі да Чарнякова штораз пашыраецца зарыва. І калі ўжо сцямнела, падавалася, што ўся Варшава з боку Прагі была ахоплена полымем. Пад глухі гук адступаючых праз мост экіпажаў ужо амаль у самім горадзе чуліся бесперапынна гучаўшыя стрэлы гармат і ручной зброі. Нам падавалася, што на вуліцах працягваецца бітва. Аднак, калі пацiху стрэлы сталі радзей, я пабег у горад, каб яшчэ раз развітацца з сястрой. Неадкладна вярнуўся сярод [s. 135] бесперапынных стрэлаў ручной зброі і рэдкіх гарматных, грукатаўшых ад Вольскай заставы да гадзіны першай па паўночы.

Назаўтра спаткаўся на Празе з Валяр'янам, і калі ўсе ад выгляду маскоўства, якое рухалася па другім беразе Віслы, ахопленыя панічным страхам пачалі ўцякаць, рушылі мы пеша ў далейшую дарогу ў кірунку Модліна. У вялікім беспарадку ішлі мы каля самога берага ракі, перамешаныя разам – пяхота, кавалерыя, артылерыя, паклажа. Чатырохмільную дарогу да Модліна пакрывала перамешаная з паслоў, марадзёраў, сенатараў, івандэрак[127], газетчыкаў, салдат, абывацелеі [калона].

Чаму зараз, пасля таго як выйшлі мы з Варшавы, не накіраваліся мы Брэсцкім гасцінцам для аб'яднання з генералам Рамарына? А якім бы чынам утварыў-

мы значную сілу, гэтага растлумачыць не магу. Апавядаюць, што ў капітуляцыі Крукавецкага былі змешчаны гэтыя ўмовы. Крукавецкі мог жа сабе сядзець у Модліне, тады ні войска, ні ўрад, ні сейм ніякай капітуляцыі не зведалі б!

[s. 136] [9–10 <u>верас</u>[ня]. Пасля таго, як выйшлі мы з Варшавы, адхіляючыся ўвогуле ад вайсковай справы, галоўным чынам па прычыне, што ў перыяд эмісарства страціў каня, трымаўся я наших паслоў і з імі прыбыў у Модлін. Недахоп месца ў убогім мястэчку і не магчымасць у сувязі з гэтым правядзення грамадскіх нарад, вымусіла сейм і Нацыянальны ўрад перабрацца ў Закрочым, які знаходзіўся ад Модліна на адлегласці паловы мілі. А тым часам працягваліся перамовы з непрыяцелем, які паставіў сабе мэту падмануць нас, неразумна яму даверыўшыхся, каб выйграць час для выгаднага размяшчэння свайго войска. Пасля завяршэння гэтага ўсе перамовы ў Новым двары паміж упаўнаважаным Паскевічам[128] генералам Бергам[129] і нашымі былі сарваны і адхілены.

[10–20 [верасня]. Пасля таго, як паслы перабраліся ў Закрочым, пачаў дзейнічаць сейм і выходзіць нерэгулярнае выданне пад назвай «<u>Закрочымская</u> <u>газета</u>», якое спрабавала [?] растлумачыць народу і войску, што са стратай Варшавы, мы не страцілі [s. 137] яшчэ айчыны, і што непрыяцель, які жадае ўтрымаць сталіцу нашай краіны, працягваючы ваяваць з намі, будзе павінен разрозніць свае сілы. І гэту сітуацыю мы можам выкарыстаць. Аднак хаця намаганні былі прыгожыя, яны не маглі ўжо ажывіць ні згаслага ў народзе духу, ні збараніць войска, знішчанага галечай і здрадамі.

Галоўны штаб быў завалены просьбамі аб дэмабілізацыі, і войска, страчвая адразу амаль усіх афіцэраў, было б павінна расфарміравацца. У сувязі з гэтым для прадухілення настолькі шкоднай дэмаралізацыі, сейм зацвердзіў Ордэн ці Зорку стойкасці для тых, хто да канца выстаіць у нацыянальнай справе. Форма яе павінна была быць наступнай.

Ордэн павінен быў быць жалезным крыжам са стужкай [s. 138] нацыянальных колераў, малінавага і цёмна-сіняга. Аднак да выніку гэта задума з прычыны заўчаснага разладу кампаніі не здзейснілася.

Аднак жа праект такой узнагароды і натуральная ўмова, што ў заводах на дэмабілізацыю будзе адлюстроўвацца ўхваленне тых, хто нічога для сябе не прасіў у найважнейшую для краіны хвіліну, затрымалі масу афіцэраў на службе.

Аднак, насуперак усёй настойлівасці, сейм нічога ўжо болей карыснага быў не ў стане зрабіць, як пераездам сваім у абедзве краіны, не пагаджаючыся ні на якія ўмовы непрыяцеля, і выступаючы з пратэстам, паказваць незаконнасць у вачах Еўропы новага, учыненага над Польшчай, разбою дзікім паўночным дэспатам.

У той час, калі ў Закрочыме сейм рабіў намаганні па аднаўленню нацыянальнай справы, у Модліне на ваеннай радзе, [s. 139] пасля таго, як Берг адмовіўся ад усялякіх перамоў, шэсць генералаў, сярод якіх Мухоўскі[130], Андрыхевіч[131], Серакоўскі, Міллер[132] і Багуслаўскі[133], выступілі за безагаворачную капітуляцыю на літасць імператара. Аднак у сувязі з усеагульным абурэннем, гэта прапановы

была адхілена, а тых, хто яе прапанаваў зараз жа дэмабілізавалі. Хутка яны атрымалі ад маскалёў узнагароды, вартыя іх подлага рабства. Мухоўскі і Андрыхевіч, якія не прытрымліваліся войска каля прускай мяжы, былі палонены казакамі і накіраваны ў Варшаву. Першага Паскевіч некалькі гадзін трымаў у пярэдніх пакоі і ад'ютанты, якія выходзілі да яго, ляскаючы плёткамі, з найвялікшай пагардай прымалі яго; другі, пабіты казакамі, па іроніі атрымаў ад фельдмаршала адказ на сваю скаргу.

Калі збіраліся мы ўжо пакінуць Закрочым, Літоўскі камітэт дабіўся ў Міністэрства фінансаў для ліцвінаў, патрабуючых дапамогі, 10 тыс. зл[отых], прызначаных Нацыянальным урадам яшчэ ў Варшаве. [s. 140] Для атрымання гэтай сумы я быў дэлегаваны камітэтам да міністра Бернацкага[134]. Аднак пасля доўгіх і неаднаразовых, пустых і выкрутлівых размоў я не здолеў вытаргаваць болей, чым не поўных 4 тыс. зл[отых]. І то, як мне паведаміў [Бернацкі], у сувязі з беднасцю нацыянальнай касы, на сённяшні дзень гэта было залішнім. Аднак жа заставалася яшчэ да васьмі мільёнаў, а пасля таго, як выдзелілі болеїі чым дзесяці паслам пачаткова ў Плоцку па # 50[135], а затым з гэтай жа самай сумы ў Франкфурсе-на-Одры для некалькіх [прыбліжаных] п[ана] маршалка Астроўскага па # 40 і пасля ўтрымання на працягу двух тыдняў, ад Закрочыма да прускай мяжы войска, якое ўвесь час змяншалася, не ведаю, што стала з астаткам тых мільёнаў. Хаця нават у польскім банку [было] 5 мільёнаў. Пасля атрымання прызначанай для ліцвінаў сумы, раздаў яе тым, хто быў вызначаны камітэтам і найболей меў у гэтым патрэбу. Квіткі ад гэтых асобаў, засведчаныя старшынёй камітэта Несялоўскім, я прадставіў у Міністэрства п[ана] Бернацкага.

Пад час дзесяцідзённага побыту ў Закрочыме жыў я разам з Замбржыцкім, Граткоўскім Янам, Людвікам[136], Валяр'янам Пяткевічамі і Казьмянамі[137]. [s. 141] Часта прыходзіў да нас Зянковіч і гуляў у карты ў другіх пакоях у Хляндоўскай, гэтым жа самым апантанай, былай жонкі рэдактара, а зараз шулеркі, якая валачылася за абозам і абыгрывала афіцэраў. Адным вечарам прайграў ёй [Зянковіч] 120 дукатаў, і назаўтра 30 – Серакоўскаму, такім вось чынам разышліся грошы, узятыя ім з ашмянскага паўстання (глядзі s. 43). Гэта стала магчыма таму, што не зрасходаваў ён са 100 дукатаў, узятых на сваю асобу, болей чым 60, а найболей 70 [дукатаў] для ўтрымання ашмянскіх паўстанцаў і затрымаў яшчэ 100 дукатаў, якія прызначаліся для ўручэння Ануфрыю Плаўскаму[138], які пасля бітвы пад Румам, здзейсненай ашмянскім паўстаннем, не здолеў адразу да нас далучыцца. І калі мы нават і ў пазнейшы час нідзе Плаўскага не сустрэлі, не павінен быў пан Зянковіч прагульваць гэтыя грошы, таму яны ніколі не пераставалі быць уласнасцю ашмянскіх паўстанцаў. Нарэшце, калі мы саступаючы капрызам Пшэздзецкага, далі толькі Каятану Ленарговічу 50 [злотых], а самі ўзялі па 100, паабяцалі мы з ім пры неабходнасці падзяліцца пароўну, чаго ніколі таксама пан Зянковіч не стрымаў. Але пакінем ужо ў спакоі гэтага нягодніка, калі б [s. 142] жадаў я ўсе яго подлыя і пошлыя справы падрабязна пералічваць, не хапіла бы мне, магчыма, гэтых аркушаў.

У Закрочыме па рэкамендацыі Літоўскага камітэта Замбржыцкі, Валяр'ян Пяткевіч і я атрымалі крыжы і павышэнне ў чыне[139]. У разгар ваеннай справы я ганарыўся бы гэтымі бліскучымі цацкамі, зараз жа прыняў іх як адзіную памятную рэч аб нашай рэвалюцыі, спусціўшуюся на мяне.

[21 верасня]. Нарэшце, 20 верасня выйшлі мы сілай, налічваўшай болей за 20 тыс. чалавек, з Закрочыма да Плоцка, пакінуўшы ў Модліне гарнізон колькасцю ад 4 да 5 тыс. чалавек. Назаўтра прыпыніліся мы ў Плоцку. Адтуль павінны былі рушыць мы ў Кракаўскае ваяводства для злучэння з Ружыцкім[140], абапіраючыся на аўстрыйскую мяжу, працягваць дзеянні далей. У адпаведнасці з гэтай мэтай Дэмбінскі з авангардам у 4 тысячы чалавек перайшоў суспраны ў вярхоўі Віслы мост і павярнуў 23 г[этага] м[есяца] на Гомбін. Аднак, калі ён затрымаўся ў мястэчку для адпачынку, новы галоўнакамандуючы Рыбінскі[141] даслаў загад, каб ён хутчэй вяртаўся ў Плоцк, дзе мы аж да 27 верасня стаялі бяздзейна, назіраючы за дэмаралізацыяй звыш 20-тысячнага войска.

[s. 143] Тут, расчараваўшыся з-за бяссільнасці і змен лінасці, не ведаючага за што схапіцца камандуючага, сабраліся мы з Валяр'янам, апранутыя па-сялянску ці ў цывільнае адзенне, прабірацца ў вольны горад Кракаў, і там, не чакаючы безумоўнага расфарміравання войска, што павінна было ўжо хутка адбыцца, чакаць навінаў аб канчатковым заняпадзе нацыянальнай справы і шукаць для сябе вандроўніцкага прытулку. Аднак затым адмовіліся мы ад гэтага намеру, палічыўшы, што больш надзейным будзе прытрымлівацца да апошняга часу перамяшчэння войска. У тым, што мы не памыляліся, сведчыла тое, што Немаеўскі[142] з Алізарам[143], якія ехалі з прыстанкамі ў Прусію, былі захоплены чаркесамі.

[28 верасня] Калі ўжо расійскія сілы пачыналі акружаць Плоцк, выйшлі мы праз Добрынь, Горны шпіталь да Улацлаўка, дзе, пасля таго як быў пабудаваны наперадзе на лодках мост, намерваліся зноў перайсці Віслу. Але leдзь фарпосты, выгнаўшы з мястэчка некалькі сотняў маскалёў, пераправіліся, як даведаліся мы, што нас чакае там вораг. [29 [верасня]. Не жадаючы ўступаць у бітву і рызыкаваць у выпадку адступлення да Віслы, павярнулі мы назад [s. 144] да Горнага шпіталя, адстрэльваючыся ад настойліва наступаючых казакаў.

Не магу абмінуць Улацлаўка, каб не выказаць сапраўднай удзячнасці мясцоваму купцу збожжам – тырольчыку Штэйнэру, які асеў у Польшчы больш за дваццаць гадоў назад і які нас з Валяр'янам сапраўдна па-бацькоўску прыняў у сваім доме і запрасіў на начлег. А калі ў начы пачалася трывога і войска нечакана пачало назад праз мост пераходзіць, пабудзіў нас, добра адпачываўшых, і з рызыкай для сябе прапанаваў нас схаваць. Аднак, калі мы адмовіліся ад гэтага, развітаўся з намі са слязамі і ўручыў ліст да аднаго свайго сябра, які жыў на другім беразе Віслы, каб той дапамог нам ва ўсім, чаго бы мы не пажадалі. У размове з намі, прызнаваючы цывілізаванымі розныя народы, аддаў належнае палякам, пазначыўшы, што наведаўшы не мала замежных краін, ні ў адной з іх не знайшоў столькі чалавечнасці і сапраўднай шчырасці, колькі ў нашым народзе

[s. 145] [3 кастрычн[іка]. У далейшай дарозе да Горнага шпіталя накіраваліся мы на Ліпна, Скомпе, Рыпін, Садлава, Засадкі да Свядзебны, небяспечнага мястэчка, размешчанага каля самай прускай мяжы. Тут Валяр'ян, апрануты на цывільнаму ад самога Плоцка, прычапіўся да брычкі ваяводы Астроўскага, які ехаў разам з доктарам Галянжоўскім[144]. І я, адшпіліўшы эпалеты і змяніўшы вайсковую познаньскую пілотку, атрыманую ад нейкага незнаёмага, здзейсніў тое ж самае. Перайшлі мы за паўгадзіны мяжу і накіраваліся ў Бродніцу, якая па-нямецку называецца Страсбургам. Такім чынам скончыўся наш з Валяр'янам ваенны шпацыр ад Варшавы праз Плоцк у Прусію.

Блуканне

У Страсбургу, ці па нашаму ў Бродніцы, качаючы ваяводу Астроўскага і выдаючы сябе за яго хатняга, шчасліва пазбегнуў пяцідзённага каранціна, які ўсе, хто прыбыў з Польшчы, павінны былі прайсці [s. 146] ў кляштары, размешчаным за горадам, дзе з-за празмернага зборышча народу давалі непрыдатнае жыллё і горш кармілі, за што аднак небывала дорага трэба было плаціць. У адпаведнасці з прадпісанай формай каранціна, ваявода па статусу сваёй асобы меў дазвол знаходзіцца ў самім горадзе і нават у сваіх пакоях. Валяр'ян і доктар Галянжоўскі, якія таксама знаходзіліся пры ім, маглі свабодна ўвесь час перасоўвацца па гораду.

Пасля таго, як атрымаў у Страсбургу прускі пашпарт (Reise rute), нанялі мы з Кантарберыем Тымоўскім[145] коней і выехалі да Торуня. А Валяр'ян выбраўся ў дарогу з Астроўскім. Я бачыўся з ім потым у Торуні і апошні раз [9–12 [кастрычніка] у Вроцлаве, куды я праз Франкфурт-на-Одэры [15–25 кастрычніка] даехаў дыліжансам. Па дарозе пазнаёміўся я з Паўлам Попелем[146], знаёмства з якім было для мяне шмат у чым карысным у час побыту ў Кракаве.

[20–25 [кастрычніка]. У Вроцлаве, дзе ў мяне не было нікога знаёмых, пасля ад'езду Попеля я застаўся не болей чым з васьмю талерамі. І калі б Валяр'ян не пакінуў мне пятнаццаць дукатаў, не ведаю, што рабіў бы…

ЗАЎВАГІ ДА ПЕРАКЛАДУ

[1] **Язвінскі Вінцэнт** (н. 1795), памешчык з Вілейскага пав. Мінскай губ., нарадзіўся ў Мінску, падпаручнік коннай артылерыі польскіх войскаў. У 1831 [illegible], затым падпаручнік польскіх войскаў. Па рашэнні МІСК ад 24.4.1832 [illegible] галоўнакамандуючаму 1-й арміі, загадам ён вызвалены ад пакарання. Гл.: *Гарбачова В. В.* Удзельнікі паўстання 1830–1831 гадоў на Беларусі: біябібліяграфічны слоўнік. Другое выданне. Мн., 2006. С. 375.

[2] **Пятрэдзецкі Караль Дамінік** (1780–10.4.1832), памешчык са [illegible] Ашмянскага пав. Віленскай губ., сын Міхала і Марыі Мастоўскай, брат Канстанціна, [illegible], уладальнік маёнткаў Міхалішкі, Смаргонь, у 1812 завілейскі маршалак, [illegible] 1812 у складзе корпуса Ю. Панятоўскага, выставіў за свой кошт 18 уланскі полк, [illegible] фіхарэгаў. У паўстанні з 5.4.1831, адзін з арганізатараў ашмянскага выступлення, [illegible] апалчэнне, палкоўнік конных уланаў. Пасля паражэння пад Ашмянамі далучыўся да фарміравання Д. Хлапоўскага. З 15.6.1831 знаходзіўся пры штабе А. Гелгуда, з якім 13.7.1831 перайшоў мяжы Прусіі. Памёр у мяст. Крулявец. Маёнтак Смаргонь канфіскаваны. Гл.: *Гарбачова В. В.* Удзельнікі... С. 278.

[3] **Важынскі Парфірый**, памешчык з Ашмянскага пав. Віленскай губ., уладальнік маёнтка Аляны, старшыня ашмянскага трыбунала, лідскі маршалак, удзельнік кампаніі 1812. [illegible] 1831 арганізаваў у сваім маёнтку тайны к-т для падрыхтоўкі паўстання. [illegible] ўрадавы к-т. Пасля паражэння пад Ашмянамі далучыўся да атрада Д. Хлапоўскага. [illegible] галоўнакамандуючага 1-й арміі ад 19.11.1831 сасланы на цяжкія работы ў Сібір з канфіскацыяй маёмасці. З кастрычніка 1832 пакінуты на пасяленні [illegible] Табольскай губ. [illegible] знаходзіўся ў Смаленскай губ., затым у Кургане. Сям'я засталася ў Ашмянскім пав. [illegible] дазвол вярнуцца на месца жыхарства з правам атрымання [illegible] кірунку Вільні. Гл.: *Гарбачова В. В.* Удзельнікі... С. 73; *[illegible]* Materiały do dziejów ziemi i ludzi. Petersburg. 1898. Cz. 3; *Giller A.* Lista wygnańców [illegible] Album Muzeum Narodowego w Rapperswilu. Paryż, 1872. S. 436.

[4] Дата пазначана па старым стылі.

[5] **Вярзілін Пётр Сямёнавіч** (1791(1793?) – пасля 1849), расійскі ген.-маёр, [illegible] кіраваў зборным казачым лінейным палком у бітве пад Ашмянамі, з 1832 ген.-маёр, 1832–1837 наказны атаман Каўказкага лінейнага войска. У 1841 [illegible] у Варшаве.

[6] **Сцяльніцкі Фелікс**, з Віленскай губ., удзельнік кампаніі 1812, 4.1831 [illegible] паўстанцаў у Ашмянах. Атрад пад яго кіраўніцтвам 15.4.1831 абараняў Ашмяны. Гл.: *Гарбачова В. В.* Удзельнікі... С. 323.

[7] **Юзаф Западскі**. Гл.: *Klukowski J.* Powstanie powiatu oszmiańskiego // Zbiór pamiętników o powstaniu Litwy w r. 1831 / Ukł. przez F. Wrotnowskiego. Paryż. 1835. S. 242.

[8] **Ган Тадэвуш (Томаш ?)**, [illegible] Ашмянскага пав. Віленскай губ., адвакат. [illegible] Гл.: *Гарбачова В. В.* Удзельнікі... С. 100.

[9] **Закржэўскі Станіслаў** (н. [illegible] 1849), з Ашмянскага пав. Віленскай губ., [illegible] паўстання ў Ашмянскім пав. Удзельнічаў у [illegible] М. Паскевіча [illegible] эміграваў. 10.5.1837 [illegible] 1849 атрымаў [illegible] Гл.: *Гарбачова В. В.* Удзельнікі... С. 146.

[10] **Храпавіцкі Мацвей Яўграфавіч** (9.8.1784–31.3.1847), расійскі ваенны і дзяржаўны дзеяч, удзельнік італьянскага і швейцарскага паходаў Суворава у 1799, у 1812 кіраўнік гвардзейскай брыгадай, адзначыўся ў Барадзінскай бітве, удзельнічаў у паходах 1813–1814. 1816 ген.-ад'ютант, у 1831 ген. ад інфантэрыі. З 23.12.1830 віленскі і гродзенскі ваенны губернатар, 22.8.1831 звольнены з пасады за нерашучыя дзеянні па падаўленню паўстання. З 1833 член Дзяржаўнага савета і Кабінета міністраў, з 1846 пецярбургскі ваенны губернатар. Гл.: ЭГБ. Т. 6. Ч. 2. С. 80.

[11] **Тамерлан (Цімур)** (1336–1405), стваральнік дзяржавы са сталіцай у Самаркандзе, разграміў Залатую Арду.

[12] Гышкевіч Юзаф.

[13] Напэўна, аўтар памыляецца ў назве спагнання, якое было вынесена ў дачыненні маёнткаў пераліч[а]ных асобаў. Хутчэй за ўсё на маёнткі быў накладзены секвестр. Не сустракаецца згадак аб канфіскацыі пазначаных маёнткаў і у наступным.

[14] **Ваньковіч Станіслаў**, памешчык з Вілейскага пав. Мінскай губ. і Свянцянскага пав. Віленскай губ., сын Юзафа, уладальнік маёнтка Задзеўе, старшыня Вілейскага межавага суда. Удзельнік ашмянскага выступлення, член к-та для кіравання цывільна-вайсковымі справамі, арганізатар паўстання ў Свянцянскім пав. Падпісаў акт аб стварэнні вілейскага паўстанцкага к-та, увайшоў у яго склад, займаў пасаду шэфа пяхотнага батальёна ў віленскім аддзяленні. 4.5.1831 удзельнічаў у бітве пад Вілейкай, кіраваў аддзелам. Затым з'явіўся да ўлад. Па рашэнні МГСК ад 31.12.1831 вызвалены ад адказнасці, узяты пад нагляд паліцыі. Гл.: *Гарбачова В. В.* Удзельнікі… С. 79.

[15] **Сарока Ежы** (каля 1750–10.1831), з Ашмянскага пав. Віленскай губ., нарадзіўся ў Вільні, скарбнік. 4.1831 дзейнічаў у складзе ашмянскіх паўстанцаў, член ашмянскага ўрадавага к-та. Арыштаваны, сядзеў у турме. Рашэннем ваеннага суда асуджаны да смяротнага пакарання. Памёр у турме. Гл.: *Гарбачова В. В.* Удзельнікі… С. 307.

[16] Маюцца на ўвазе віленскія студэнты.

[17] **Ян Лазоўскі**. Гл.: *Klukowski J.* Powstanie… S. 243.

[18] **Сяпніцкі Цэзарый** (каля 1813–27.7.1845), нарадзіўся ў Вільні, вучыўся ў Віленскім ун-це. У паўстанні падафіцэр познаньскай конніцы. 9.8.1831 падпісаў акт далучэння жыхароў Віленскай губ. да паўстання. 20.6.1832 прыбыў у Францыю, пачаткова знаходзіўся ў закладзе ў Буржэ, дзе 18.8.1833 далучыўся да ПДТ. 11.1833 пераселены ў Вімуцье дэп. Орн, выконваў функцыі сакратара секцыі ПДТ у Вімуцье. У траўні 1836 пераехаў у Гаўр, дзе і памёр ад сухотаў. Гл.: BUW. rkps SRB; *Kronow[ski] L.* Lista członków Towarzystwa Demokratycznego Polskiego z lat 1832–1851 // Materiały do biografii, genealogii i heraldyki polskiej. T. I. Buenos Aires, 1963. S. 45; *Tyrowicz M.* Towarzystwo Demokratyczne Polskie 1832–1863. Przywódcy i kadry członkowskie. Przewodnik bio-bibliograficzny. Warszawa, 1964. S. 686.

[19] **Свентаржэцкі Мечыслаў** (н. каля 1812), шляхціц з Вілейскага пав. Мінскай губ., сын Станіслава, вывучаў права ў Віленскім ун-це. У паўстанні падафіцэр. Эміграваў, 5.2.1833 знаходзіўся ў Буржэ, выехаў у ТНД з мэтай далейшага вывучэння права. Вярнуўся з раскаяннем. Па рашэнні МГСК ад 21.12.1831 аднесены да 2-га разр. зл., пазней атрымаў дараванне. Гл.: BPP. rkps 612. [illegible] 105; *Гарбачова В. В.* Удзельнікі… С. 308.

[20] **Міхал Леапартовіч**. Гл.: *Klukowski J.* Powstanie… S. 243.

[21] **Нагінскі Напалеон** (1800–1870), шляхціц Мінскай губ., уладальнік маёнтка Аланта ў Вількамірскім пав. Віленскай губ. Вучыўся на філасофскім ф-це Віленскага ун-та, член т-ва праменістых, філарэтаў і філадэльфістаў. У 1831 выконваў ролю пасрэдніка паміж Літвою і КП, у траўні 1831 прычыніўся да арганізацыі выступлення ў Мазырскім і Рэчыцкім пав. Эміграваў у Францыю, у 1833 дзейнічаў на Жмудзі эмісарам экспедыцыі Заліўскага. У снежні 1833 выехаў на заданне [illegible] па Вільнь. [illegible] ў Карэлічах (Навагрудскі пав.) [illegible] і распаўсюджваннем забароненай літаратуры. Арыштаваны 28.6.1838, [illegible] ваенны суд 9.2.1839 прыняты рашэнне аб смяротным пакаранні. Загадам віленскага ваеннага губернатара ад 18.2.1839 папярэдняе рашэнне заменена ссылкай на цяжкія работы ў Сібір. [illegible] прыбыў у Іркуцк, у студзені 1840 высланы на Нерчынскія заводы. У траўні [illegible] 1841 [illegible] перайсці на пасяленне. У 1856 на падставе каранацыйнага маніфеста атрымаў [illegible] у Волагду, а 15.1.1857 на вяртанне ў Віленскую губ. пад нагляд паліцыі. У [illegible] 1857 прыбыў у Вільню, прыпыніўся ў Коўна, дзе заснаваў прыватны цукровы завод. У 1863 [illegible] намеснікам кіраўніка паўстання ў Ковенскім пав. Гл.: НГАБ. ф. 333, воп. 1, спр. 817, арк. 95 [illegible]; *[illegible]* Szymon Konarski. Warszawa, 1976; *Dangel S.* Rok 1831 w Mińszczyźnie. Warszawa, 1925; *[illegible]* Słownik bio-bibliograficzny dawnego Uniwersytetu Wileńskiego. Wilno, 1939; *[illegible]* Lista wygnańców… S. 419; PSB. T. 23/2. S. 333; *Śliwowska W.* Zesłańcy polscy w Imperium Rosyjskim w pierwszej połowie XIX wieku: Słownik biograficzny. Warszawa, 1998. S. 421.

[22] **Маквіц Адам** (1811–31.3.1842), нарадзіўся ў Вількамірскім пав. Віленскай губ., вучыўся ў Віленскім ун-це. У паўстанні дзейнічаў у чыне падпаручніка 12-га [illegible] палка. Эміграваў у Францыю, куды прыбыў 2.1832, пачаткова належаў да закладу ў Безансоне, [illegible] у Швейцарыю, адкуль зноў вярнуўся ў Францыю. Памёр у [illegible] пад Парыжам. Гл.: *Bielecki R.* Słownik biograficzny oficerów powstania listopadowego. Warszawa, 1998. T. 3. S. [illegible].

[23] **Пятроўскі Тэлясфор** (каля 1809–15.4.1886), з Барысаўскага пав. Мінскай губ., нарадзіўся каля Барысава, студэнт медыцынскага ф-та Віленскага ун-та. У паўстанні падпаручнік 4-га палка пешых стральцоў, адышоў з А. Гелгудам у Прусію, інтэрнаваны. [illegible] 1832 прыбыў у Францыю, знаходзіўся ў закладах Лашатр, Шатору. 28.5.1834 [illegible] ТНД з мэтай далейшага вывучэння медыцыны ў Страсбургу. Скончыў Горную школу. Ажаніўся з француженкай (меў 6 дзяцей, сын Тэлясфор вучыўся ў Батыньёльскай школе). Гл.: BPP. rkps 565 [illegible] s. 446; *Bielecki R.* Zarys rozproszenia Wielkiej Emigracji we Francji 1831–1837. Materiały z archiwów francuskich. Warszawa; Łódź, 1986. S. 168; *Гарбачова В. В.* Удзельнікі… С. 28[illegible].

[24] **Вашкелевіч Адам Эрнест** (18.12.1813–17.3.1901), шляхціц, нарадзіўся ў Вільні, [illegible] медыцыну ў Віленскім ун-це. У паўстанні падпаручнік познаньскай конніцы. Эміграваў у Францыю. 21.01.1832 знаходзіўся ў Авіньёне, са снежня 1833 вывучаў медыцыну ў [illegible] 1834 атрымаў дыплом доктара медыцыны. Скончыў курс ваеннай медыцыны ў [illegible] выехаў на Усходнюю Індыю. У 1852 атрымаў чын афіцэра 2-га класа, у 1864 [illegible] службы здароўя ў галандскай арміі на Усходняй Індыі. Памёр у Галандыі. Гл.: *[illegible]* Polskie drogi emigracyjne. Emigranci polscy na studiach we Francji 1832–1848. Warszawa, 1986. S. 426.

[25] Напэўна, маецца на ўвазе **Фердынанд Савіцкі** (н. 19.1.1812), [illegible] нарадзіўся ў Вільні. [illegible] 1836 вывучаў медыцыну ў Віленскім ун-це. У паўстанні выконваў абавязкі [illegible] урача. Эміграваў у Францыю 20.8.1832, з ліпеня 1833 вывучаў медыцыну ў Манпелье. 1.2.1834 атрымаў дыплом доктара медыцыны. Гл.: *Konarska B.* Polskie drogi… S. 390.

[26] **Янкоўскі Канстанцін Юзаф**, нарадзіўся ў Вільні. У паўстанні дзейнічаў у чыне падпаручніка ў атрадзе познаньскай конніцы, далучыўся да фарміравання М. Рыбінскага, у складзе якога 5.10.1831 перайшоў мяжы Прусіі. 24.3.1832 прыбыў у Францыю, пачаткова належаў да закладу ў Авіньёне, 19.12.1832 увайшоў у склад Авіньёнскай рады. [illegible] 1848 [illegible] Памёр у [illegible] намерваўся вярнуцца на радзіму, аднак выехаў толькі да Страсбурга. У 1854 жыў у [illegible] Гл.: *Bielecki R.* Słownik… T. 2. S. 194.

27 **Шацiла Ян**, шляхціц з Мазырскага пав. Мінскай губ. Удзельнічаў у паўстанні на тэрыторыі Мазырскага пав. З'явіўся да ўлад. Рашэннем КГСК атрымаў дараванне. Гл.: *Dangel S.* Rok 1831... S. 134.

28 **Гiцэвiч Гiпалiт**, шляхціц з Вілейскага пав. Мінскай губ., сын Вінцэнта, б. мінскага цывільнага губернатара, уладальнік маёнтка Вязынь, завілейскі маршалак, калежскі асэсар. З'яўляўся старэйшаей вілейскага ўрадавага паўстанцкага к-та. У лiпенi 1831 высланы ў Пецярбург, утрымліваўся ў крэпасці. Па рашэнні МГСК ад 3.8.1831 аднесены да 1-га разр. зл. 10.8.1833 папярэдняе рашэнне адменена, прысуджана грашовае спагнанне. Па высачайшаму загаду адпраўлены на жыхарства ў Вологду. Гл.: Pielgrzym Polski. Paryż. 1833. Półark. 7: *Гарбачова В. В.* Удзельнікі... С. 108.

29 **Аскерка Ян**, памешчык з Вілейскага пав. Мінскай губ., уладальнік маёнтка Будслаў. У 1831 член вілейскага ўрадавага паўстанцкага к-та. Пастановай МГСК 29.10.1831 аднесены да 2-га разр. зл., па канфірмацыі галоўнакамандуючага 1-й арміі ад 5.5.1832 атрымаў дараванне, пакінуты над наглядам паліцыі. Гл.: *Гарбачова В. В.* Удзельнікі... С. 36.

30 **Руткоўскi Казiмiр** (1790–28.8.1834), з Віленскай губ., капітан польскіх войскаў, удзельнічаў у кампаніі 1812–14. 4.1831 дзейнічаў у складзе ашмянскіх паўстанцаў, з 22.3.1831 капітан. 16.4.1832 прыбыў у Францыю, знаходзіўся ў закладзе ў Буржэ, член мясцовай рады. З'яўляўся членам ТДРЗ. На радзіме застаўся 6 дзяцей. Пакінуў успаміны пра падзеі на Ашмяншчыне. Гл.: BPP, rkps 455, s. 1215; *Гарбачова В. В.* Удзельнікі... С. 296.

31 **Ленартовiч Камiль Каэтан** (2.7.1804(1805)–3.9.1862), з Ашмянскага пав. Віленскай губ., нарадзіўся ў Дзісне. Скончыў Віленскі ун-т, сябраваў з А. Міцкевічам, судовы ўраднік па крымінальных справах Ашмянскага суда. 4.1831 знаходзіўся сярод пачынальнікаў паўстання ў Ашмянах, дзейнічаў у чыне падпаручніка, затым падафіцэр 10-га і 13-га уланскіх палкоў. Дайшоў з Г. Дэмбінскім да Варшавы, дзе 9.8.1831 удзельнічаў у Віленскім сеймiку на абранні дэпутатаў на сейм. 5.10.1831 перайшоў з М. Рыбінскім межы Прусіі, інтэрніраваны. 1.2.1832 прыбыў у Францыю, 26.5.1832 знаходзіўся ў закладзе ў Авіньёне. Працаваў механікам, затым з'яўляўся шэфам секцыі на марсельскім канале. Ажаніўся з француженкай. 7.6.1837 далучыўся да АПЭ, з 29.7.1837 член ПДТ. 24.9.1841 перабраўся ў Марсель, дзе загінуў. Гл.: BPP, rkps 347, s. 149; RTHL, 1866. S. 347; *Гарбачова В. В.* Удзельнікі... С. 212.

32 **Саф'янаў**, расійскі ген.-маёр, удзельнік падаўлення паўстання ў паўночна-заходніх паветах Беларусі.

33 Склад амуніцыі, боепрыпасаў і харчавання.

34 **Ясiнскi Людвiк Барталамей** (10.10.1800–25.3.1841), ксёндз з Ашмянскага пав. Віленскай губ., нарадзіўся ў Сакольскім пав., сын Яна і Барбары Ляскоўскай, пляменнік Я. Ясінскага. Скончыў школу ў Гродна, у 1824 прыняў сан, з 1829 знаходзіўся ў Ашмянах, належаў да ордэна дамініканцаў. У паўстанні з 23.3.1831, з 4.4.1831 дзейнічаў сярод ашмянцаў. Пазней капелан 12-га уланскага палка ў корпусе А. Гелгуда. Адышоў у Прусію. 10.3.1832 прыбыў у Францыю, належаў да закладаў у Авіньёне, Ліоне, Ле Пюі. У 1833 выдаў брашуру «Гадавіна польскай рэвалюцыі 29 лістапада ў Ажэне». У 1837 член АПЭ. Па рашэнні ГГСК аднесены да 2-га разр. зл. Памёр у Ажэне. Гл.: *Гарбачова В. В.* Удзельнікі... С. 384.

35 Напэўна, маецца на ўвазе **Чаховiч Антонiй** (11.4.1803–22.7.1866), шляхціц з маёнтка Аборак Ашмянскага пав. Віленскай губ., сын Юзафа і Барбары Тэклі Шэмеціл. У 1826–1830 знаходзіўся ў Пецярбургу. 23.3.1831 далучыўся да ашмянскіх паўстанцаў, паручнік. У красавіку 1831 у Трокскім пав. далучыўся да атрада студэнтаў Віленскага ун-та, затым падхарунжы 4-га палка пешых стралкоў корпуса А. Гелгуда. Удзельнічаў у бітве пад Вільняй. У складзе атрада Ф. Роланда 15.7.1831 перайшоў межы Прусіі, адкуль на караблі «Йоханнес» 15.8.1832 прыбыў у Францыю. Першапачаткова

знаходзіўся ў закладах у Бардо, Безансоне, затым у Шатору, адкуль пераехаў у Бурж. Да 1835 жыў у вайсковых закладах, затым асеў у Парыжы і [illegible] 25.5.1848 уступіў у легіён Міцкевіча. У 1838 ажаніўся, меў [illegible]. Памёр у Парыжы, пахаваны на могілках Манмартра. Гл.: BPP, rkps 565, s. 41; *Гарбачова В. В.* Удзельнікі... С. 354.

36 **Зянковiч Юзаф** (27.10.1807–17.1.1833), памешчык з Ашмянскага пав. Віленскай губ., нарадзіўся ў Вільні, сын Пятра і Фартунаты Клімацкай, вучыўся ў Віленскім ун-це [illegible] ПНК. 4.1831 адзін з ініцыятараў выступлення ў Ашмянах, [illegible], затым капітан атрада познаньскай конніцы, 5-га палка [illegible] у Варшаву прыбыў у складзе корпуса Г. Дэмбінскага, [illegible] 9.8.1831 абраны паслом на сейм ад Ашмянскага пав. [illegible] Эмігрыраваў у Францыю, член ПНК, з ліпеня 1832 [illegible] заснавання ТДРЗ, належаў да дэмакратычнага кірунка. [illegible] Парыжы. Пакінуў успаміны пра падзеі на Ашмяншчыне. Гл.: BPP, rkps 347, s. 149; MAM, rkps [illegible], s. 141; MWP, 1711/C, 40 H; *Гарбачова В. В.* Удзельнікі... С. 155.

37 **Гелгуд Антонiй** (1792–13.7.1831), польскі ген., удзельнічаў у кампаніі 1812–14, [illegible] брыгады. У паўстанні з 30.5.1831 ген. 3-й пяхотнай [illegible] чэрвеня ў Віленскую губ. 10.6.1831 пасля аб'яднання з [illegible] польскімі войскамі на беларуска-літоўскіх землях. Пасля бітвы [illegible] пад Вільняй [illegible] трох частак распачаў адступленне праз Жмудзь, у ліпені [illegible]. Застрэлены капітанам С. Скульскім пры пераходзе прускай мяжы. Гл.: *Гарбачова В. В.* Удзельнікі... С. 105.

38 **Бутлер Вiнцэнт**, шляхціц з Ашмянскага пав. Віленскай губ. Удзельнічаў [illegible] і познаньскіх паўстанцаў, з атрадам Г. Дэмбінскага накіраваўся ў Варшаву. [illegible] пад час капітуляцыі Варшавы знаходзіўся ў шпіталі. [illegible] 1832 эмігрыраваў у Францыю. 11.11.1852 падпісаў адрас да Напалеона III. [illegible] вярнуцца на радзіму, да лістапада 1860 не скарыстаў [illegible]. Гл.: *Гарбачова В. В.* Удзельнікі... С. 68.

39 Пазначэнне па старым стылі.

40 Ф. Вратноўскі ў адрэдагаваных успамінах [illegible] далейшага лёсу П. Важынскага, памылкова пазначаючы, што [illegible] каля Смаленска. Гл.: *Klukowski J.* Powstanie... S. 249.

41 **Барткевiч Вiнцэнт** (1776 – пасля 1837), памешчык з маёнтка [illegible] пав. Віленскай губ., свянцянскі віцэ-маршалак. У паўстанні 1794 удзельнічаў у чыне паручніка [illegible]. У 1831 член тайнага паветовага к-та, у красавіку 1831 [illegible] паўстанцаў, разам з якімі змагаўся пад Вільняй. 12.4.1831 [illegible] к-та. 5.5.1831 разам са свянцянскімі паўстанцамі [illegible] аб'яднаных сіл вілейскіх, дзісенскіх і свянцянскіх паўстанцаў [illegible] кавалерыяй. У Жмудзі далучыўся да корпуса Г. Дэмбінскага [illegible] 9.8.1831 выконваў абавязкі маршалка на Віленскім сеймiку на абранні [illegible] адзначаны залатым крыжам. Пасля заканчэння ваенных дзеянняў [illegible] арыштаваны, утрымліваўся 16 месяцаў у турме ў Вільні. На канфірмацыі [illegible] 1-й арміі ад 1.10.1833 сасланы ў Вологду без пазбаўлення правоў. [illegible] дзе прабыў 3 г. 2.7.1832 накладзены секвестр на маёнткі [illegible]. У 1837 атрымаў дазвол перасяліцца ў Смаленскую губ. [illegible] памёр. Пакінуў успаміны аб падзеях у Завілейскім, Дзісенскім і Вілейскім пав. Гл.: *Гарбачова В. В.* Удзельнікі... С. 58.

[42] **Патраўскі Ян Корвін** (10.5.1801(1792) – 6.3.1835), са Свянцянскага пав. Віленскай губ., капітан польскіх войскаў. У 1831 кіраваў коннiцай у свянцянскім апалчэнні, з 2.7.1831 маёр 13-га уланскага палка, у складзе фарміравання Г. Дэмбінскага адышоў у Варшаву. 5.10.1831 з атрадам М. Рыбінскага перайшоў межы Прусіі, інтэрніраваны. 15.3.1832 прыбыў у Францыю разам з жонкай і дзецьмі, 18.10.1832 знаходзіўся ў закладзе ў Безансоне, член ПНК. Па рашэнні ВГСК ад 15.2.1833 аднесены да 1-га разр. зл., па канфірмацыі галоўнакамандуючага 1-й арміі ад 22.6.1833 аддадзены пад ваенны суд. Памёр у Безансоне. Гл.: *Гарбачова В. В.* Удзельнікі... С. 285.

[43] **Вайніцкі Міхал** (1779–10.10.1842), нарадзіўся ў Вільні, з 1809 на вайсковай службе, удзельнічаў у кампаніі 1809–1815, пасля чаго дэмабілізаваўся. У 1831 далучыўся да паўстанцаў, кіраваў пяхотай у свянцянскім выступленні, затым далучыўся да корпуса Г. Дэмбінскага, у складзе якога дайшоў да Варшавы, дзе атрымаў чын маёра 16-га палка лінейнай пяхоты. Эмігрыраваў у Францыю, у 1832 знаходзіўся ў закладзе ў Безансоне. У 1833 выязджаў у Швейцарыю, адкуль вярнуўся ў Францыю. Член ПДТ. Гл.: *Bielecki R.* Zarys... S. 78; *Žirowicz M.* Towarzystwo... S. 758.

[44] **Кублiцкі Станіслаў**, шляхціц з маёнтка Палессе Свянцянскага пав. Віленскай губ., сын Юзафа, брат Адольфа. Адзін з ініцыятараў паўстання ў Свянцянскім пав. Удзельнічаў у захопе Свянцян. Пасля адступлення далучыўся да атрада К. Залускага, паручнік 1-га уланскага палка. 5.10.1831 адышоў у Прусію ў складзе корпуса М. Рыбінскага, прасіў літасці. Па рашэнні ВГСК, падцверджаным М. Далгарукавым ад 15.5.1833, аднесены да 3-га разр. зл. Гл.: ВРР. rkps 347, s. 877; *Гарбачова В. В.* Удзельнікі... С. 205.

[45] **Круказецкі Ян** (15.10.1772–17.4.1850), польскі палітычны дзеяч. Нарадзіўся ў Львове, адукацыю атрымаў у Вене. Вайсковую службу пачаў 15.9.1786 кадэтам у аўстрыйскай арміі. У паўстанні 1830–1831 кіраўнік 1-й пяхотнай дывізіі, 6.3.1831 губернатар Варшавы, 17.8.1831 назначаны старшынёй урада. Пасля капітуляцыі Варшавы застаўся ў горадзе і здаўся расійскім уладам, пасля чаго быў сасланы ў Яраслаўль. У 1833 атрымаў дазвол вярнуцца ў Польшчу, асеў у маёнтку Осава. Гл.: *Bielecki R.* Słownik... T. 2. S. 371.

[46] Назва сялянскай гаспадаркі.

[47] **Хілкаў Сцяпан Аляксандравіч** (1786–1854), князь, расійскі ген.-лейтэнант, удзельнік падаўлення паўстання 1830–1831, з 1836 у адстаўцы.

[48] **Радзішэўскі Станіслаў** (каля 1788–23.7.1844), памешчык з Вілейскага пав. Мінскай губ., Ашмянскага пав. Віленскай губ., нарадзіўся каля Нясвіжа, сын Міхала і Людвікі Бжастоўскай, уладальнік маёнткаў Іліля, Лебедзева, з 1830 вілейскі маршалак. Удзельнік кампаніі 1812, адстаўны палкоўнік французскіх войскаў. У паўстанні з 4.1831, узначальваў вілейскае апалчэнне. Пасля бітвы пад Вільняй далучыўся да атрада Г. Дэмбінскага, палкоўнік, камандзір 26-га пяхотнага палка, адышоў у Варшаву, дзе 10.8.1831 удзельнічаў у Мінскім сейміку па абранні дэпутатаў на сейм. 30.8.1831 атрымаў залаты крыж. 5.10.1831 адышоў з М. Рыбінскім у Прусію, інтэрніраваны. 25.4.1833 прыбыў у Францыю, знаходзіўся ў Парыжы. (Жонка з 3 малымі дзецьмі засталася ў в. Бенiцы Ашмянскага пав.) 20.4.1837 адзін з заснавальнікаў Польскага клуба, са студзеня 1838 яго бібліятэкар. У 1838 член ПЛТ. Па рашэнні МГСК ад 21.12.1832 аднесены да 1-га разр. зл. Гл.: *Гарбачова В. В.* Удзельнікі... С. 288.

[49] **Брахоцкі Валенцій**, з Дзісенскага пав. Мінскай губ., сын Мікалая, палкоўнік польскіх войскаў. У 1831 арганізатар паўстання у Дзісенскім пав., узначальваў апалчэнне у Лужках. 8.5.1831 кіраваў захопам Дзісны. Пад Жоснамі далучыўся да фарміравання А. Гелгуда, кіраваў батальёнам 19-га уланскага палка, пазней заўчыўся з атрадам Ф. Роланда, у складзе якога перайшоў межы Прусіі. Рашэннем МГСК ад 19.11.1831 аднесены да 1-га разр. зл. Гл.: *Гарбачова В. В.* Удзельнікі... С. 61.

